WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

25 чэрвеня 2011 г.
СУБОТА
№ 118 (26982)

Кошт 750 рублёў

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

У МОЛАДЗІ МОЦНЫЯ КРЫЛЫ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Студэнты першага курса БНТУ, будучыя маркетолагі (злева направа) Вольга МІРОНЧЫК, Ілья ПЯТРУШЫН, Аляксандра КУРКОВА і Настасся МАЛЯРЭВІЧ «ляцяць» на апошні іспыт летняй сесіі.

Дарагія юнакі і дзяўчаты!
Ад усёй душы віншую вас з Днём моладзі.

У нашай краіне клопат аб падрастаючым пакаленні з'яўляецца найважнейшым напрамкам дзяржаўнай палітыкі. Моладзь прызнана стратэгічным рэсурсам, які вызначае далейшае развіццё дзяржавы.

Будучыня Беларусі шмат у чым залежыць ад прадпрымальнасці, актыўнасці, ініцыятывы, палітычнай і грамадзянскай адказнасці яе маладых грамадзян. Таму ў нас створаны ўсе ўмовы для атрымання адукацыі і рэалізацыі здольнасцяў у працоўнай і грамадскай дзейнасці.

Галоўнае цяпер — не спыняцца, а настойліва ісці наперад па абраным нашым народам шляху, пераадольваючы любыя цяжкасці. І наколькі паспяхова мы гэта зробім, у многім залежыць ад кожнага з нас.

Са святам! Няхай здзейсняцца вашы мары, а годная праца на карысць Айчыны прынясе беларускаму народу працвітанне і дабрабыт.

Зычу вам шчасця, здароўя і невычэрпнага натхнення.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:

«АБВАЛЬНАГА РОСТУ ЦЭН НА ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ Ў БЕЛАРУСІ НЕ БУДЗЕ»

Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч учора на сустрэчы з працоўным калектывам ААТ «Івацэвічыдрэў», перадае БЕЛТА.

У гэтых адносінах наступствы дэвальвацыі нацыянальнай валюты прайшлі ўжо, падкрэсліў кіраўнік урада. «Павінен сказаць сумленна і адкрыта, што ёсць дзве галіны, дзе назбіраліся недахопы, — гэта энергетыка і сельская гаспадарка, — прызнаў кіраўнік урада. — У энергетыцы не праглядаецца да канца года каля Br2 трлн, каб выйсці хаця б на работу з нязначнымі стратамі. У сельскай гаспадарцы — гэта каля Br6 трлн. Стратныя малако, кефір, смятана, тварог. Спрабуем гэта перакрываць за кошт экспарту, але ў поўнай меры пакуль не атрымліваецца».

Прэм'ер-міністр прывёў лічбы, якія характарызуюць рэнтабельнасць некаторых відаў прадукцыі для рэалізацыі на ўнутраным рынку: ялавічына — мінус 10 працэнтаў, свініна — мінус 6,1 працэнта, масла — мінус 9 працэнтаў, цвёрдыя сыры — мінус 6,6 працэнта, малако — мінус 12 працэнтаў, смятана — мінус 7,9 працэнта, тварог — мінус 7,1 працэнта. «Рэзкага ўздыму цэн не павінна быць. Будзем старацца, каб яго не было наогул, — сказаў Міхаіл Мясніковіч. — Але гэта вельмі складана. Як толькі павялічваецца зарплата, адразу расце попыт, які прыводзіць да росту цэн». Ёсць і аб'ектыўныя цяжкасці, дадаў прэм'ер-міністр, маючы на ўвазе так званы беларускі шопінг. «Калі ў Беларусі будуць моцна — на 10 працэнтаў і больш — адрознівацца цэны ад расійскіх, то беларускую прадукцыю будуць вывозіць», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. Гэта асабліва характэрна для Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай абласцей, куды за прадукцыяй прыязджаюць расіяне. «З інфляцыяй мы ўжо амаль справіліся, — падкрэсліў прэм'ер-міністр. — І цяпер якога-небудзь руху цэн, якія адчувальна ўдараць па кішэні, у прынцыпе не павінна быць».

СТАР. 2

Рыгор ВАСІЛЕВІЧ:

«СЛЕДСТВА ПА ТЭРАКЦЕ Ў МІНСКІМ МЕТРО ПРАЦЯГНУТА ПА АБ'ЕКТЫЎНЫХ ПРЫЧЫНАХ»

Напярэдадні Дня работнікаў пракуратуры карэспандэнт «Звязды» задала некалькі хвалюючых надзённых пытанняў Генеральнаму пракурору Беларусі Рыгору ВАСІЛЕВІЧУ.

— Рыгор Аляксеевіч, прайшло ўжо больш як два месяцы з моманту затрымання падазраваных у здзяйсненні тэрарыстычнага акта на станцыі метро «Кастрычніцкая». На якой стадыі знаходзіцца расследаванне? І калі арыенціровачна справа будзе перададзена ў суд?

— Следства па гэтай крымінальнай справе працягнута да 31 ліпеня. Па аб'ектыўных прычынах: патрабуюцца дадатковыя следчыя дзеянні для доказу віны падазраваных.

— А чым скончылася праверка, якую Вы даручылі правесці пасля з'яўлення ў інтэрнэце інфармацыі аб свабодным доступе ў начны час на станцыю метро «Маскоўская»?

— Факт пацвердзіўся. Маладыя людзі, сапраўды, бесперашкодна праніклі на станцыю метро ў начны час. Па выніках праверкі былі вынесены акты пракурорскага нагляду. На днях кіраўніцтва «Мінсктранса» і ГУУС Мінгарвыканкама адрэагавала на іх. У прыватнасці, за невыкананне працоўнай дысцыпліны падначаленымі да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнуты першы намеснік начальніка Мінскага метрапалітэна. За дапушчаныя парушэнні службовых інструкцый звольненыя з работы начальнік станцыі метро «Маскоўская», дзяжурная па гэтай станцыі, кантралёр і брыгадзір дыстанцыі шляху і тунэльных збудаванняў. Да строгай дысцыплінарнай адказнасці прыцягнута яшчэ 12 работнікаў метрапалітэна, у тым ліку 3 кіраўнікі службаў прадпрыемства. Звольнены з органаў унутраных спраў таксама начальнік па ахове Мінскага метрапалітэна і міліцыянер роты патрульна-паставой службы міліцыі (ППСМ). Намесніку начальніка аддзела па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні і камандзіру аддзялення роты ППСМ аб'яўлена строгая вымова. На ўсіх станцыях метрапалітэна ўстанавілі дадатковыя запорныя прыстасаванні, якія забяспечваюць блакіраванне ўсіх дзвярэй. Разгледзелі пытанне абсталявання ўваходных зон аб'ёмнымі датчыкамі аховы. Распрацавалі графік праверкі службовымі асобамі парадку праходу на станцыі метрапалітэна ў начны час, а таксама шэраг іншых мерапрыемстваў. Але хачу звярнуць увагу кіраўнікоў усіх рангаў, мы не павінны зараз засяроджвацца толькі на гэтым «слабым месцы», якое дапамагла выявіць моладзь. Бяспека людзей павінна быць забяспечана на ўсіх участках.

СТАР. 3

Уладзімір МАКЕЙ:

«ЖУРНАЛІСЦКАЕ СЛОВА ПАВІННА БЫЦЬ МАРАЛЬНЫМ, ЮРЫДЫЧНА ДАКЛАДНЫМ»

Фота БЕЛТА.

Учора ў Мінску працягваў работу VI Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні: патрыятызм, духоўнасць, яднанне», ініцыятарамі якога выступілі Міністэрства інфармацыі і Беларускі саюз журналістаў. Важным пунктам праграмы форуму, без перабольшвання, яго цэнтральнай падзеяй стала пленарнае пасяджэнне беларускіх і замежных журналістаў з 20 краін, якое адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы.

Удзельнікам і гасцям медыяфоруму было ўжо што абмеркаваць, падзяліцца ўражаннямі ад убачанага і пачутага ў нашай краіне. Венгерскі журналіст прыгадаў, што некаторыя калегі былі здзіўлены яго рашэннем наведаць Мінск: маўляў, гэта ж сталіца «апошняй дыктатуры ў Еўропе». Але, па словах Ёзэфа Фаркаса, ён убачыў у Беларусі шмат чаго цікавага і павучальнага, ён параіў заходнім журналістам, якія пішуць на тэму Беларусі, спачатку наведаць яе, пазнаёміцца з жыццём беларускага народа, а затым ужо пісаць. Нямецкі журналіст з рэдакцыі газеты «Юнге Вельт» Руп Райнер звярнуў увагу на дагледжаныя палеткі, працуючыя прадпрыемствы, спакойныя твары людзей на чыстых вуліцах гарадоў, дзе адсутнічаюць кварталы беднаты і галечы. Па яго словах, Беларусь — гэта тая краіна, дзе па-сапраўднаму клапоцяцца аб народзе. Яна ўяўляе сабой унікальную з'яву ў Еўропе. У Беларусі існуе рэальны сацыялізм, якому ўласцівы рост і развіццё, упэўнены госць з Германіі. Матэвуш Піскорскі, журналіст з Польшчы, прэзідэнт Еўрапейскага цэнтра геапалітычнага аналізу, казаў аб выкарыстанні двайных стандартаў на Захадзе для ацэнкі сітуацыі ў Беларусі. У выніку журналістыка ператвараецца ў інструмент інфармацыйнай вайны, а мэта гэтага чорнага піяру — рэйдарскі захоп эканомікі нашай краіны. Прыкладна ў такім ключы гаварылі іншыя замежныя ўдзельнікі і госці медыяфоруму.

СТАР. 2

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Вишневка-2010» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже склада минеральных удобрений (инв. № 600/С-128872), об. пл. 140.2 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, район д. Юзуфово.**

Начальная цена с НДС – 147 661 200 бел. руб.

Площадь земельного участка – 0,3683 га.

Задаток в сумме 14 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, БИК 153001369, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **28.07.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.07.2011** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.06.2011 г. (для б/н разлікаў)

▲1 долар ЗША	4 988,00	1 чэшская крона	292,40
▼1 еўра	7 084,46	1 польскі злоты	1786,44
1 латвійскі лат	10 045,31	▼1 расійскі рубель	177,10
1 літоўскі літ	2 062,65	украінская грыўня	623,89

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	28,1655
10 UAH	35,2364
1000 BYR	56,6255
EUR	40,1189

ISSN 1990 - 763X

АБВАЛЬНАГА РОСТУ ЦЭН НА ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ Ў БЕЛАРУСІ НЕ БУДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Тарыфная стаўка першага разраду да канца года павышацца не будзе.

«Зарплата для бюджэтнікаў да канца года павышацца не будзе, аднак у адпаведнасці з заканадаўствам будзе праводзіцца індэксацыя ў сувязі з інфляцыяй, — адзначыў кіраўнік урада. — Гэта вымушаная мера».

Што датычыцца вытворчага сектара, то рост заработнай платы будзе праходзіць у межах заробленых сродкаў. Ён асабліва падкрэсліў, што трэба прыкласці максімальныя намаганні для таго, каб зрабіць бюджэт бездэфіцытным. Пры дэфіцыце 3 працэнты ад ВУП можа зноў раскручвацца інфляцыя, могуць зноў узнікнуць праблемы з абменным курсам нацыянальнай валюты. «Неабходна прыкласці ўсе намаганні, каб выйсці на дэфіцыт 1,5 працэнта, а ў ідэале — зрабіць бюджэт збалансаваным — з нулявым дэфіцытам».

Павышэнне стыпендый у Беларусі плануецца восенню гэтага года.

Плануецца таксама павялічыць выплаты іншагароднім студэнтам, якія не забяспечаны месцам у інтэрнаце. Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што вучні і студэнты павінны быць сацыяльна абароненыя, каб яны маглі прадаўжаць сваю вучобу. Разам з тым, падкрэсліў прэм'ер-міністр, «студэнты павінны жыць не толькі за кошт бацькоў і за кошт дзяржавы, але і імкнуцца зарабляць». Праца студэнтаў — звычайная практыка нават у такіх паспяховых краінах, як ЗША, дадаў Міхаіл Мясніковіч.

Курс долара пакуль расці не будзе.

Паводле слоў кіраўніка ўрада, рэальны курс — ад Br4,5 тыс. да Br5,5 тыс. за $1. Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што на такім узроўні захаваецца курс, калі «мы не справакуем яго эмісійным крэдытаваннем эканомікі: на жыллё, фермы, дарогі».

«Забяспечыць адначасова валютную стабільнасць і развіццё немагчыма, гэтыя дзве задачы не вырашаюцца ў сукупнасці, як нельга прымаць снатворнае разам са слабіцельным, — вобразна аформіў сваю думку прэм'ер-міністр. — Спачатку трэба навесці парадак на валютным рынку, а потым займацца пытаннямі развіцця».

Ён запэўніў, што валюта для насельніцтва будзе, калі яна патрэбна на лячэнне, камандзіроўкі і іншыя неадкладныя задачы. Продаж валюты прыватным асобам у абменніках будзе праводзіцца ў межах куплі валютных сродкаў у насельніцтва. Міхаіл Мясніковіч праінфармаваў, што насельніцтва здало ў абменнікі ў маі больш як $200 млн, набыло — $150-160 млн.

«Вядома, шмат у чым сітуацыя на валютным рынку справакавала ажыятажны попыт на аўтамабілі, — растлумачыў Міхаіл Мясніковіч. — У Беларусі за 6 месяцаў было ўвезена з-за мяжы дадаткова 160 тыс. аўтамабіляў. Нават калі ў сярэднім кожны аўтамабіль каштаваў $10 тыс., то нескладана падлічыць, які аб'ём валюты спатрэбіўся на гэтыя мэты. Валюты, якую зарабіла ўсё грамадства».

Аб'ём жыллёвага будаўніцтва з дзяржпадтрымкай у 2012 годзе будзе зменшаны на трэць.

Права карыстацца льготнымі жыллёвымі крэдытамі будзе, папершае, у шматдзетных сем'яў (падтрымка іх нават узмоцніцца), па-другое, у сем'яў, якія пражываюць у інтэрнаце і ніколі не мелі свайго жылля, па-трэцяе, якія пражываюць у старым жыллі.

Міхаіл Мясніковіч таксама адзначыў, што пераглядаюцца нормы пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Сацыяльныя даплаты ў ліпені атрымаюць непрацуючыя маламаёмныя пенсіянеры.

«На мінулым тыдні я дакладваў Прэзідэнту прапановы, звязаныя з пенсійным забеспячэннем маламаёмных непрацуючых пенсіянераў, — сказаў кіраўнік урада. — Прэзідэнт унёс карэктывы, і сёння яму быў адпраўлены дапрацаваны дакумент.

У ліпені будуць праведзены разавыя выплаты тым непрацуючым пенсіянерам, чый памер пенсій ніжэйшы за два бюджэты пражытковага мінімуму (Br686 тыс.), памер разавай выплаты ўзніме пенсію да 2-кратнага БПМ, аднак яе памер не павінен перавышаць Br150 тыс. на чалавека. Такім чынам, у ліпені ў краіне не будзе пенсіянераў з даходамі ніжэйшымі за Br686 тыс., падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Гэта павышэнне закране 870 тыс. жыхароў Беларусі, уключаючы атрымальнікаў сацыяльных выплат. Цана пытання — Br94 млрд. 400 млн. Акрамя таго, у жніўні гэтага года плануецца чарговае павышэнне пенсій.

«ЖУРНАЛІСЦКАЕ СЛОВА ПАВІННА БЫЦЬ МАРАЛЬНЫМ, ЮРЫДЫЧНА ДАКЛАДНЫМ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Падчас дыскусіі выступіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей. Ён падзяліўся думкамі і назіраннямі з нагоды дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі ў сучасных умовах, іх новай ролі ў жыцці грамадства, уплыву на фарміраванне адносін паміж краінамі і народамі. Ён заўважыў, што медыяфорум стаў прыкметнай падзеяй у Беларусі і набыў грамадскую значнасць. На гэтых сустрэчах журналісты розных краін абмяркоўваюць актуальныя праблемы ў сферы СМІ, шмат гаворыцца аб прафесійнай адказнасці журналістаў, аб зменах у інфармацыйнай прасторы. На погляд Уладзіміра Макея, прэса мае свае геаграфічныя традыцыі і асаблівасці, але не існуе такіх паняццяў, як «беларуская», «расійская», «украінская», «літоўская», «французская» журналістыка. Ёсць толькі падзел на добрую і дрэнную журналістыку. Галоўны крытэрый адзнакі працы журналіста — якасць і аб'ектыўнасць. Уладзімір Макей лічыць недарэчным падзел на элітарную і масавую журналістыку. Па яго меркаванні, масавае павінна быць высокім, а высокае — масавым. Якасць вызначаецца не толькі газетнымі тыражамі і тэлевізійнымі рэйтынгамі. Асноўнае — прафесійны, маральны стрыжань аглядальніка, карэспандэнта і рэдактара, якія мужна і адказна процістаяць разнастайным спакусам. Галоўным сэнсам журналісцкай прафесіі павінна быць сумленнае грамадскае служэнне.

На погляд прамоўцы, СМІ не павінны станавіцца інструментам палітычнай барацьбы. Аднак амаль кожны дзень «мы пераконваемся ў тым, што насуперак прыгожым дэкларацыям сучасныя сродкі масавай інфармацыі, на жаль, усё ў большай ступені становяцца інструментам у руках пэўных суб'ектаў палітыкі і бізнэсу». Замест каналаў аб'ектыўнага інфармавання грамадзян у шматлікіх выпадках СМІ служаць прасоўванню палітычных ідэй і становяцца сродкам маніпулявання грамадскай свядомасцю», — сказаў Уладзімір Макей.

У якасці прыкладу ён прывёў падзеі ў Лівіі, калі аўтарытэтныя міжнародныя СМІ сталі інструментам інфармацыйнай вайны. Замест аб'ектыўнага аналізу сітуацыі гучаць абвінавачванні, замест журналісцкіх расследаванняў — небыліцы. На думку Уладзіміра Макея, такое ідэалагічнае суправаджэнне ваенных дзеянняў моцных гэтага свету «не з'яўляецца праявай волі слова, гэта можна назваць ашалелай прапагандай». Прамоўца звярнуў увагу ўдзельнікаў форуму на тое, што новыя інфармацыйныя магчымасці тояць у сабе пагрозу маніпулявання свядомасцю людзей і яе змен. Кожны журналіст павінен усведамляць уладу свайго слова. Галоўная задача — аб'ектыўнае інфармаванне аб падзеях. Па словах Уладзіміра Макея, «таленавітае, сумленнае, выразнае журналісцкае слова павінна быць маральным, юрыдычна дакладным».

Уладзімір Макей выказаў шэраг цікавых меркаванняў наконт ролі СМІ і дзейнасці іх прадстаўнікоў. Ён лічыць, што трэба вызначыць межы разумнага і дапушчальнага, сумясціць інтарэсы вузкага кола людзей з інтарэсамі ўсяго грамадства. Ва ўмовах моцнай залежнасці ад кіруючых эліт, калі шматлікія пытанні фарміруюцца палітыкамі і фінансавымі карпарацыямі, журналіст мае права іх карэктаваць, уносіць элемент маралі і справядлівасці. Несучы інфармацыю аб ідэале, культуры, СМІ павінны спрыяць ліквідацыі невуцтва і неразумення паміж людзьмі, узнікненню агульначалавечай салідарнасці, захаванню глабальнай бяспекі.

Разам з тым, Уладзімір Макей адзначыў, што незадаволенасць эканамічнымі, палітычнымі, сацыяльнымі працэсамі не дае права ўмешвацца ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы. Ён падкрэсліў, што Беларусь выконвае ўсе ўзятыя на сябе міжнародныя абавязацельствы, прымае самы актыўны ўдзел у барацьбе з міжнароднай злачыннасцю, наркатрафікам і інш. У рэспубліцы склаліся канструктыўныя адносіны паміж людзьмі ўсіх нацыянальнасцяў і канфесій. Тысячы беларусаў працуюць і вучацца ў суседніх краінах. Вынікі выбараў сведчаць, што пераважная большасць выбаршчыкаў ізноў падтрымалі палітычную і сацыяльную лінію Прэзідэнта. На думку Уладзіміра Макея, гэта натуральна, што ёсць тыя, якія прытрымліваюцца іншага пункту гледжання. Не ўсё тое, што адбываецца ў Беларусі падабаецца асобным кіраўнікам краін Еўрасаюза і ЗША. Але гэта не падстава ўмешвацца ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы, якая, да таго ж, з'яўляецца адным з заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. «Паглядзіце, што атрымліваецца. Некаторыя палітычныя дзеячы краін ЕС адкрыта паставілі сабе мэту змяніць у Беларусі канстытуцыйны лад і сілай памяняць уладу», звярнуў увагу прысутных Уладзімір Макей. На яго погляд, для гэтага няма аніякіх падстаў. Больш за тое, такія сістэматычныя напады з боку ЕС немагчыма рацыянальна растлумачыць.

На жаль, гаворыць Уладзімір Макей, у гэтых працэсах вельмі негатыўную ролю адыгрываюць сродкі масавай інфармацыі. Шматлікія журналісты, якія прыязджаюць у краіну пазнаёміцца з рэальным становішчам спраў, у гутарках адзначаюць станоўчыя моманты, чысціню гарадоў і вёсак, імклівае развіццё эканомікі, а свае матэрыялы пішуць у адпаведнасці з загадзя атрыманымі ўстаноўкамі. Большасць інфармацыйных матэрыялаў аб Беларусі носіць заказны характар, а такога быць не павінна, перакананы Уладзімір Макей.

Заключным акордам работы медыяфоруму стала прыняцце ўчора вечарам рэзалюцыі. Удзельнікі медыяфоруму ў Мінску адзначылі ўзрастаючае значэнне СМІ, грамадскіх ініцыятыў у арганізацыі эфектыўнага супрацьдзеяння сучасным выклікам і пагрозам, забеспячэнні ўстойлівага развіцця, заснаванага на прынцыпах справядлівага светапарадку, безумоўнай павагі суверэнных правоў дзяржавы.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Таццяна МАРХЕЛЬ: **Гасцёўня**

«Я СУСТРЭЛАСЯ САМА З САБОЙ»

Я ўбачыла проста жанчыну... Але яна яшчэ ўмее перадаць асаблівую беларускую жаноцкасць на сцэне. Якую б ролю ні іграла, драматургію якой бы краіны ні ўвасабляла — усё адно заўсёды адчуваецца, што яна размаўляе з тымі, хто прыходзіць у тэатр у яе роднай краіне. Працуючы ў Тэатры беларускай драматургіі, яна размаўляе са сваімі гледачамі на роднай мове. Родная актрыса для многіх: калі хто не бачыў яе ў тэатры, то ведае па ролях у кіно і па беларускіх песнях, якія яна пранікнёна выконвае. Цяпер «роднасць» Таццяны Мархель замацаваная афіцыйна: ёй прысвоена званне народнай артысткі Беларусі. Але для многіх людзей, якія любяць яе як актрысу, магчыма, будзе здзіўленнем, што ў Таццяны Мархель гэтага звання дагэтуль не было.

— Ой, а мяне часта памылкова аб'яўлялі народнай артысткай, на «Залаты віцязь» колькі ездзіла, увесь час Бурляеў прадстаўляў як народную. Я ўсё яго папраўляла... Колькі жартавалі з гэтай нагоды, — прызнаецца Таццяна Рыгораўна. — Але ж калі ты працуеш, то не думаеш, ёсць званне ці не. Проста жывеш і робіш сваю справу. Але калі гэта здарылася, то, вядома, прыемна.

Я ведала і ведаю народных артыстаў — годныя людзі. Яшчэ студэнткай ставілася з трымценнем да народных артыстаў. Напрыклад, народным артыстам быў Віктар Тарасаў, я з ім здымалася ў кіно, бачыла яго спектаклі. Народным артыстам СССР быў Барыс Платонаў, якога я ўпершыню ўбачыла, калі працавала медсястрой на Трактарным заводзе. У нас у паліклініцы прафсаюз браў білеты, мы хадзілі ў тэатр. Я ўбачыла яго ў «Эзопе», у гэтай ролі. Пасля спектакля я пайшла дадому пехам (здымала тады куток) — не магла сесці ў трамвай. Я не думала тады пра тэатр, хоць са школы ўдзельнічала ў самадзейнасці.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Сведения о балансодержателе: Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8(0232) 79 67 14

№ лота	Наименование объекта аренды и его характеристика	Местоположение объекта аренды	Цель использования объекта аренды	Коэффициенты месторасположения и спроса к базовой ставке (по договору)	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Помещение площадью 177,8 кв.м, расположенное на 3-м этаже в капитальном строении (здание РУПС) инв. № 320/С-19733	г. Жлобин, ул. Первомайская, 76	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществление производства (кроме вредных производств)	1 х 2	1 555 750	155 580
2	Помещение площадью 11,5 кв.м, расположенное на 3-м этаже в капитальном строении (здание РУПС) инв. № 320/С-19733	г. Жлобин, ул. Первомайская, 76	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществление производства (кроме вредных производств)	1 х 2	100 625	10 100
3	Помещение площадью 15,9 кв.м, расположенное на 3-м этаже в капитальном строении (здание РУПС) инв. № 320/С-19733	г. Жлобин, ул. Первомайская, 76	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществление производства (кроме вредных производств)	1 х 2	139 125	14 000
4	Помещение общей площадью 73,7 кв.м, состоящее из 4-х комнат (10,7 кв.м, 43,2 кв.м, 13,4 кв.м, 6,4 кв.м), расположенное на 1-м этаже в капитальном строении (здание УОПП) инв. № 320/С-19744	г. Жлобин, ул. Урицкого, 41	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществление производства (кроме вредных производств)	1 х 2	644 875	64 500

Базовая ставка за 1 кв.м арендуемой площади: 0,25 БВ; * при наличии 2-х и более участников аукциона коэффициент увеличивается на 0,5; шаг торгов 10%

Срок аренды – 5 лет.

При заключении договоров аренды **ставка арендной платы может быть скорректирована** с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 23.10.2009 г. № 518 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений. Находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток до 04 июля 2011 г. на р/с 3012105618010 в РД №700 ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 369, УНН 102353509, ОКПО 55484006. Получатель платежа: Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация».

Дата проведения аукциона 05 июля 2011 г. в 11.00 в Гомельском областном управлении филиала «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2.

Организатор аукциона: ГОУ филиала РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация».

В аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, а также индивидуальные предприниматели, при условии предоставления следующих документов:

* заявление по установленной форме;

* копии платежного поручения, заверенной банком, подтверждающего внесение задатка в размере, указанном в извещении.

* индивидуальные предприниматели – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

* юридические лица – резиденты Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

* юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:

* представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

* физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Подача документов по почте не допускается.

Аукцион является открытым. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 5 рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона будут заключены договора аренды недвижимого имущества.

Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2 с 9.00 до 17.00 по рабочим дням. **Последний срок подачи документов** 04 июля 2011 г. до 17.00.

Заключительная регистрация в день аукциона с 10.00 до 11.00. состоится по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, ГОУ филиала «Центр «Белтехинвентаризация». Контактные телефоны: 8 (0232) 75 06 63, 75 06 61.

«СЛЕДСТВА ПА ТЭРАКЦЕ Ў МІНСКІМ МЕТРО ПРАЦЯГНУТА...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Падчас аднаго з нядаўніх публічных выступленняў Вы сказалі, што «трэба наводзіць парадак у інтэрнэце». Якія канкрэтныя меры будуць прыняты?

— Трэба забяспечыць, каб публікацыі ў інтэрнэце адпавядалі тым патрабаванням, якія прад'яўляюцца да публікацый у іншых СМІ. Я лічу, што той, хто валодае інтэрнэт-рэсурсам, павінен адказваць за інфармацыю, якая мае абразлівы і паклёпніцкі характар, наносіць шкоду адносінам паміж дзяржавамі. На шляху прыцягнення такіх людзей да адказнасці могуць узнікнуць пэўныя цяжкасці, бо часта яны знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. У перспектыве, я мяркую, будуць прыняты нейкія міжнародныя пагадненні на гэты конт. Што тычыцца юрыдычнай адказнасці фізічнай асобы за паклёпніцкі абразу ў інтэрнэце, то яна прадугледжана нашым Крымінальным кодэксам. Але на практыцы такія справы судамі разглядаюцца даволі рэдка. Зараз, да прыкладу, у Ленінскім судзе Гродна разглядаецца крымінальная справа ў дачыненні карэспандэнта польскай газеты Андрэя Пачобута. Журналісту прад'яўлена абвінавачванне ў тым, што яго публікацыі носяць абразлівы, паклёпніцкі характар. У залежнасці ад таго, будзе пацверджана яго віна ці не, і можна будзе меркаваць аб тым, як фарміруецца наша судовая практыка.

— Ці знайшлі стваральнікаў сайта нелегальнага абмену валют Prokopovi.ch? Гэта адзіны факт распаўсюджвання ў інтэрнэце інфармацыі па незаконных здзелках з валютай?

— У сувязі з распаўсюджваннем на інтэрнэт-сайце Prokopovi.ch інфармацыі, накіраванай на арганізацыю здзелак па незаконным правядзенні валютна-абменных аперацый, Генеральная пракуратура вынесла пастанову аб абмежаванні доступу на названы інтэрнэт-сайт.

За ўчыненне аналагічных дзеянняў на інтэрнэт-сайце Tut.by генеральнаму дырэктару УП «Надзейныя праграмы» Зісеру Ю.А. вынесена афіцыйнае папярэджанне аб недапушчэнні распаўсюджвання падобнай інфармацыі.

— Рыгор Аляксеевіч, як эканамічная сітуацыя, якая склалася, у цэлым паўплывала на крымінагенную сітуацыю ў краіне?

— Часовыя цяжкасці эканамічнага характару, у тым ліку і на валютным рынку, прынцыпова не адбіліся ў горшы бок на стане злачыннасці. Больш за тое, мы адзначаем і сёлета станоўчую тэндэнцыю скарачэння на 15 % агульнай колькасці злачынстваў. Асабліва радуе тое, што працягвае змяншацца колькасць забойстваў, разбояў, рабаванняў.

— Але ж, пэўна, ёсць тэндэнцыі, якія вас насцярожваюць?

— Хвалюе сітуацыя з распаўсюджваннем наркотыкаў. Колькасць нарказалежных людзей у нас, на жаль, не змяншаецца. Хутчэй наадварот. А гэта патэнцыйныя злачынцы. Многія з іх нідзе не працуюць і не вучацца — у выніку для таго, каб набыць наркатычныя сродкі, крадуць і рабуюць. Каля трэці ад усіх злачынстваў здзяйсняецца асобамі нападпітку. Гэта праблема з праблем, якую, на жаль, нельга вырашыць толькі шляхам скарачэння колькасці продажу спіртных напояў. Істотна павялічылася і колькасць асоб, якія ўхіляюцца ад папраўчых работ ці абмежавання волі. Да прызначэння такіх мер пакарання судам трэба падыходзіць вельмі асцярожна: загадзя прагназаваць — будзе выканана пакаранне альбо не. Інакш самі ж будзем працягваць параджаць рэцыдыўную злачыннасць.

— Напрыканцы мінулага года была прынята Канцэпцыя ўдасканалення сістэмы мер крымінальнай адказнасці і парадку іх выканання. Як вядома, асноўная яе задача — нацэліць суды на больш разумнае прымяненне нормаў Крымінальнага кодэкса, індывідуалізацыю пакарання. Акрамя таго, якія канкрэтныя меры, якія змяшчаюцца ў гэтым дакументе, прымяняюцца на практыцы?

— Пакуль што не так актыўна, як хацелася б. Каб «пераламаць» свядомасць пракурорскіх работнікаў і суддзяў, патрэбны час. Яны павінны зразумець, што іх першачарговая задача не проста вынесці пакаранне, а вынесці такое пакаранне, якое б максімальна спрыяла выпраўленню чалавека, садзейнічала паляпшэнню крымінагеннай сітуацыі. Гаворка тут ідзе, у прыватнасці, аб пераглядзе адказнасці за эканамічныя злачынствы. На мой погляд, суддзям трэба рабіць большы акцэнт на штрафы, іншыя альтэрнатыўныя пазбаўленню волі віды крымінальнай адказнасці. Вось толькі адзін прыклад. У дачыненні ўрача-артапеда завялі крымінальную справу за тое, што ён выдаў бальнічны за ўзнагароду. Па судовай практыцы, якая склалася яшчэ да прыняцця Канцэпцыі, яму свяціла б 6-7 гадоў пазбаўлення волі. Дзяржаўны ж абвінаваўца і суд, кіруючыся новым дакументам, прынялі разумнае рашэнне: прызначылі пакаранне ў выглядзе папраўчых работ. Што немалаважна, урач пасля працэсу выступіў перад калегамі і пакаяўся публічна. Я не апраўдваю дзеянні гэтага чалавека, але скажу, што адказнасць павінна быць суразмернай і адпавядаць наступствам. У Канцэпцыі прадугледжваецца неабходнасць грамадскага ўздзеяння на асоб, якія здзейснілі злачынствы, у тым ліку і выязныя судовыя пасяджэнні. Я быў у Брэсцкай вобласці нядаўна. На так званым выязным пасяджэнні суда прысутнічалі, акрамя абвінавачваемага, яшчэ два чалавекі. Каму трэба такое выязное пасяджэнне?.. Які ад яго эфект?

— Генпракуратура прымае актыўны ўдзел ва ўдасканаленні беларускага заканадаўства. На гэтым тыдні мы ўжо пісалі пра вашы прапановы па рэфармаванні зямельнага заканадаўства (нумар за 23 чэрвеня). Раскажыце, калі ласка, пра якія-небудзь апошнія найбольш значныя ініцыятывы ведамства.

— Ініцыятыў дастаткова шмат. Традыцыйна пракуратура абавязана наглядаць за выкананнем дзейнага заканадаўства. Мой жа падыход і падыход маіх калег зараз заключаецца ў тым, што калі мы бачым недахопы ў заканадаўстве, то стараемся звярнуць на гэта ўвагу законатворцаў. Напрыклад, сёння маецца адказнасць за ўхіленне абавязаных асоб ад кампенсацыі дзяржаве выдаткаў, якія яна нясе ў сувязі з утрыманнем іх дзяцей. Але калі кіраўнік заключыў з такім чалавекам дагавор, а той на працягу 10 дзён і носу не паказвае на працу, то паўплываць на яго ў адміністрацыйным парадку, на жаль, пакуль немагчыма. У сувязі з гэтым мы выступілі з прапановай прадугледзець у адміністрацыйным заканадаўстве за гэта парушэнне адміністрацыйны арышт. За 15 сутак абавязаная асоба, магчыма, хоць адновіць колер твару, хоць крыху адумаецца. Бо не сакрэт, пераважная большасць такіх бацькоў любіць гаралку больш, чым сваіх дзяцей. Таксама лічу, дало б карысць увядзенне адміністрацыйнай адказнасці за знаходжанне дзяцей у начны час без нагляду ў грамадскіх месцах не толькі ў дачыненні бацькоў, але і ўладальнікаў устаноў (бараў, кавярняў, клубаў), дзе няпоўнагадовыя бавяць час ноччу. Але да гэтай прапановы я стаўлюся больш нейтральна.

Генеральная пракуратура распрацавала праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па ўдасканаленні крыміналагічнай экспертызы», які быў прыняты ў чэрвені гэтага года. Намі таксама ўнесена прапанова аб дапаўненні Крымінальнага кодэкса арт. 423[1] аб адказнасці за ўхіленне асобы ад выканання прысуду, які ўступіў у законную сілу, рашэння або іншага судовага акта ў частцы маёмасных спагнанняў.

На жаль, на заканадаўчым узроўні пакуль не рэалізаваны прапановы, накіраваныя на дэкрыміналізацыю крымінальнай адказнасці па арт. 317[1] Крымінальнага кодэкса за ўчыненне паўторнага правапарушэння (гаворка ідзе пра кіраванне транспартным сродкам у стане ап'янення. — **Аўт.**) на працягу года. Не ўведзена і адміністрацыйная адказнасць за гэты від правапарушэння шляхам дапаўнення арт. 18.16 КаАП ч. 3, якая прадугледжвае адказнасць у выглядзе штрафу або адміністрацыйнага арышту і спецыяльную канфіскацыю транспартнага сродку.

Прыкладаў канструктыўнай нарматворчай ініцыятывы з боку пракуратуры можна прывесці шмат. Уяўляецца, што ў пракурорскіх работнікаў раённага, абласнога звяна, Генеральнай пракуратуры маецца нямала карысных прапаноў аб удасканаленні заканадаўства і правапрымяняльнай практыкі.

— Дзякуй за размову. Ад імя калектыву рэдакцыі газеты і нашых чытачоў віншую Вас і Вашых калег з надыходзячым прафесійным святам.

Надзея ДРЫЛА.

Пагранпераход

ДЗЕ ДАКУМЕНТЫ?

22 чэрвеня памежнікі сумесна з супрацоўнікамі мытні і міліцыі ў кватэры 57-гадовага мінчука затрымалі буйную партыю незаконна ўвезенага тавару.

Мужчына не змог прад'явіць дакументы на 25 вадкакрысталічных тэлевізараў, 12 падлогавых вентылятараў і 46 мацаванняў для тэлевізараў. Мяркуецца, гэты тавар быў увезены з краін Еўрасаюза. Папярэдняя сума ацэнкі тавару, перададзенага супрацоўнікам мытні, склала больш за 145 мільёнаў рублёў.

НЕ ПАТРЭБНЫ ІМ БЕРАГ ТУРЭЦКІ?

23 чэрвеня раніцай брэсцкія памежнікі падчас нясення нарада на кантрольна-следавой паласе выявілі дарожку слядоў двух чалавек, якая вяла ў бок беларуска-польскай мяжы.

Неўзабаве ў непасрэднай блізкасці ад мяжы былі затрыманы двое грамадзян Турцыі — 1985 і 1987 года нараджэння. Пры сабе маладыя людзі мелі асабістыя рэчы, 150 долараў ЗША, 1 100 расійскіх рублёў, каля 100 тысяч беларускіх рублёў, прадукты харчавання і мабільны тэлефон «Samsung».

ТЫТУНЁВА-ДЫЗЕЛЬНЫЯ СУТКІ

Каля 9,5 тысячы пачкаў цыгарэт і 1500 літраў дызельнага паліва затрымалі за адны суткі памежнікі.

Гэтую прадукцыю спрабавалі вывезці з нашай краіны як грамадзяне сумежных дзяржаў — Польшчы і Літвы, так і нашы суайчыннікі. Хавалі тавар галоўным чынам у канструктыўных асаблівасцях іншамарак, дзве з якіх затрыманы да рашэння суда. Іх кошт склаў 40 мільёнаў рублёў. Агульная сума канфіскаванай кантрабанды склала амаль 33 мільёны рублёў.

LEGO-ТРАКТАР

22 чэрвеня гомельскія пагранічнікі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі ў раёне населенага пункта Прыбаловічы Лельчыцкага раёна ў кіламетры ад мяжы спынілі «Мерседэс-Спрынтар» пад кіраваннем 32-гадовага грамадзяніна Украіны.

Пры аглядзе іншаркі ў грузавым адсеку праваахоўнікі выявілі разабраны трактар «Т-25». Гэты незвычайны для мікрааўтобуса груз планавалася перамясціць праз беларуска-ўкраінскую мяжу ў абыход пункта пропуску «Глушкавічы», а выканаць гэту аферу павінен быў мясцовы жыхар. На сумежным баку машыну б паспяхова сабралі і сталі эксплуатаваць.

Такія мадэлі трактароў вельмі папулярныя ў нашых паўднёвых суседзяў. Яны прызначаны як для перадпасяўной апрацоўкі глебы, пасеву, пасадкі гародніны, уборкі сена, так і для дарожных работ.

Паводле паведамленняў прэс-цэнтра ДПК РБ.

Віншуем **з 70-годдзем** дарагога **Генадзя Сяргеевіча БЯСПАЛАВА**. Шмат гадоў Вы працавалі на карысць нашай краіны, і мы з Вас бралі прыклад. У Вас заўсёды былі аптымізм і працавітасць, якім можна пазайздросціць, і ў гэтым, відаць, сакрэт Вашай маладосці і сілы духу. Вас цанілі і паважалі за незвычайны розум, дабрыню, спагадлівасць, шчодрасць і пачуццё гумару. Дзякуй Вам за тыя патрэбныя словы, якія Вы знаходзіце, каб падтрымаць, дапамагчы, усяліць надзею. Ад усяго сэрца на доўгія гады жадаем здароўя Вам, жыццёвай энергіі, дабра і разумення!

Калегі па рабоце ў органах сацыяльнай абароны.

Рэдакцыя «Звязды» з задавальненнем далучаецца да цёплых слоў віншавання і пажаданняў у адрас свайго пастаяннага падпісчыка і аўтара цікавых публікацый — Бяспалава Генадзя Сяргеевіча.



ЗА ЎДЗЕЛ У НЕСАНКЦЫЯНАВАНАЙ АКЦЫІ 22 ЧЭРВЕНЯ Ў МІНСКУ АШТРАФАВАНЫ 33 ЧАЛАВЕКІ

паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе ГУУС Мінскага гарвыканкама. З 19.00 да 20.00 у несанкцыянаваных мерапрыемствах у цэнтры Мінска прынялі ўдзел амаль 1,5 тыс. чалавек. У ходзе прафілактычных мерапрыемстваў былі затрыманы амаль 200 найбольш актыўных удзельнікаў акцыі. На наступны дзень, 23 чэрвеня, у раённых судах Мінска адбыўся разгляд адміністрацыйных спраў адносна 33 найбольш актыўных удзельнікаў падзей. За парушэнне арт. 17.1 («Дробнае хуліганства») КоАП Рэспублікі Беларусь усе яны былі аштрафаваны на сумы ад Br70 тыс. да Br1,05 млн.

«ДЖЭНТЛЬМЕНСКАЕ» ПАГАДНЕННЕ ПА ЦЭНАХ НА ЛЕКІ: КАЛІ ЛАСКА, ДАЛУЧАЙЦЕСЯ...

Нарада па пытаннях рэгулявання фармацэўтычнага рынку і стрымлівання росту цэн на лекавыя сродкі прайшла ў Міністэрстве аховы здароўя з удзелам кіраўнікоў аптэчных сетак усіх формаў уласнасці, дыстрыб'ютараў і прадстаўнікоў замежных вытворцаў лекавых сродкаў (усяго 200 удзельнікаў).

Паводле слоў **міністра аховы здароўя Васіля ЖАРКО**, аналіз рознічных цэн на фармацэўтычным рынку сталіцы паказаў, што зараз у аптэках яшчэ рэалізуюцца лекавыя сродкі, рознічныя цэны на якія былі ўстаноўлены да змянення курсу валют. Вынікі праверак цэнаўтварэння не выявілі выпадкаў парушэння аптэкамі заканадаўства аб фарміраванні цэн. Жорсткая палітыка Міністэрства аховы здароўя дазволіла істотна знізіць адмоўны ўплыў аб'ектыўных эканамічных фактараў, папярэдзіць выпадкі неабгрунтаванага павышэння цэн і не дапусціць рэзкага росту і роскіду цэн на лекавыя сродкі і вырабы медыцынскага прызначэння. Аднак у сённяшніх эканамічных умовах важна прыняць усе магчымыя меры па далейшым стрымліванні росту цэн, каб апраўдаць давер насельніцтва да аптэк. Для таго, каб лекі заставаліся даступнымі для пацыентаў з любымі даходамі, міністр патрабаваў ад аптэк не прымяняць максімальна дапушчальныя надбаўкі. Васіль Жарко звярнуў увагу таксама на неабходнасць аптымізацыі імпарту і рацыянальнага выкарыстоўвання валютных сродкаў для закупак лекавых сродкаў.

Айчынным і замежным вытворцам, а таксама афіцыйным дыстрыб'ютарам, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць на фармацэўтычным рынку Беларусі, было прапанавана далучыцца да **Мемарандума па стрымліванні цэн** тэрмінам да 31 снежня 2011 года ў новай рэдакцыі з улікам эканамічных рэалій. Мемарандум падпісалі ўжо 39 замежных вытворцаў і іх афіцыйных дыстрыб'ютараў.

Згодна з гэтым дакументам, кампаніі-вытворцы бяруць на сябе абавязацельства прыняць меры да мараторыя на пастаўленыя лекавыя сродкі; ажыццяўляць маніторынг на прадмет завышэння цэн на сваю прадукцыю; у выпадку павышэння заяўленай цаны загадзя інфармаваць пра гэта Міністэрства аховы здароўя і даваць абгрунтаванне новай цаны; разгледзець магчымасць прадастаўлення скідак аптэчным арганізацыям усіх формаў уласнасці пры водпуску ім лекавых сродкаў.

Афіцыйныя дыстрыб'ютары, у сваю чаргу, павінны забяспечваць стрымліванне росту цэн шляхам прымянення аптымальных аптовых нацэнак; прымяняць плаўны пераход да цэн на лекавыя сродкі, розніцаных па новых курсах валют Нацыянальнага банка, разгледзець магчымасць прадастаўлення скідак аптэчным арганізацыям усіх формаў уласнасці пры аптовай рэалізацыі ім лекавых сродкаў; аптымізаваць імпарт і рацыянальнае выкарыстанне валютных сродкаў пры закупках лекавых сродкаў за кошт максімальнага скарачэння ўвозу ў Рэспубліку Беларусь замежных аналагаў айчынных лекавых сродкаў.

Міністэрства аховы здароўя падрыхтавала таксама новую рэдакцыю **Пагаднення па стрымліванні рознічных цэн на лекавыя сродкі ў аптэчных сетках**. Гэты дакумент падпісалі 128 суб'ектаў гаспадарання.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Згодна з Пагадненнем, аптэчныя сеткі бяруць на сябе абавязацельства набываць лекавыя сродкі з разлікова-адпускнымі цэнамі, якія не перавышаюць максімальныя разлікова-адпускныя цэны, сфарміраваныя РУП «БелФармацыя» і апублікаваныя ў праграме ЗАТ «Фармасэрсвіс»; стрымліваць рост цэн на лекавыя сродкі шляхам прымянення аптымальных гандлёвых надбавак; максімальна выкарыстоўваць магчымасці аптэк усіх формаў уласнасці для прасоўвання лекавых сродкаў айчыннай вытворчасці; прымяняць плаўны пераход да цэн на лекавыя сродкі, разлічаныя па новых курсах валют Нацыянальнага банка; у мэтах аптымізацыі імпарту — максімальна скараціць закупкі замежных аналагаў айчынных лекавых сродкаў; ажыццяўляць аптовую рэалізацыю лекавых сродкаў, атрыманых з фінансавымі скідкамі, з мінімальнымі гандлёвымі надбаўкамі; інфармаваць Міністэрства аховы здароўя аб выпадках рэзкага росту адпускных цэн на лекавыя сродкі.

Абодва гэтыя дакументы адкрыты да падпісання. Чакаецца, што да іх далучыцца яшчэ шэраг суб'ектаў гаспадарання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Даведка «Звязды»:

Летась экспертамі было заўважана некалькі цікавых тэндэнцый на беларускім фармацэўтычным рынку. Па-першае, беларусы сталі больш сродкаў выдаткоўваць на лекі. Аднак, напрыклад, попыт на супрацьпрастудныя, процікашлевыя прэпараты і полівітаміны заўважна знізіўся. Па звестках спецыялізаванай даследчай кампаніі «Інтэлікс-М», гадавое спажыванне лекаў на душу насельніцтва павялічылася з 65 долараў у 2009 годзе да 71 долара летась (для параўнання: у 2007 годзе выдаткі на лекі складалі ўвогуле ўсяго 46 долараў). Аднак самымі запатрабаванымі ў наведвальнікаў аптэк усё роўна застаюцца прэпараты ў цэнавым сегменце ад 1 да 5 долараў — яны займаюць 41 працэнт у агульных аб'ёмах продажу рознічнага рынку. І 11,4 працэнта займаюць у аб'ёмах рознічнай рэалізацыі прэпараты коштам менш як долар за ўпакоўку. Дарэчы, доля самых танных лекаў у аб'ёмах рознічнага продажу летась скараціласа.

Па падліках экспертаў, сярэдні кошт упакоўкі імпартных лекаў, якія рэалізуюцца ў Беларусі праз аптэчныя сеткі, склаў у 2010 годзе 3,41 долара ЗША, а беларускіх — 0,78 долара. У 2009 годзе гэтыя паказчыкі складалі адпаведна 3,08 і 0,68 долара.

Віншуем любага ўнучка **Андрэя СЯНЬКО** з в. Старыя Навасёлкі Нясвіжскага раёна **з 1 годзікам** народзінаў. Жадаем быць заўжды здаровенькім, паслухмяным хлопчыкам.

Хай сонейка весела свеціць табе,
Хай жыццё будзе поўным вязення
і хай у тваім лёсе будзе сто дзён нараджэння.

Твае бабулі і дзядулі.

НЯПРОСТАЯ АРЫФМЕТЫКА

КУРС НА ЗБЛІЖЭННЕ

ДЭЛЕГАЦЫЯ іракскага знешнепалітычнага ведамства днямі правяла кансультацыі з беларускімі калегамі. Дэлегацыя наведала Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Намеснік міністра замежных спраў Ірака Лябід Маджыд Азіз АБАВІ падкрэсліў важнасць сустрэчы менавіта з парламентарыямі — прадстаўнікамі народа:

— Самае галоўнае ў адносінах паміж краінамі — гэта адносіны паміж людзьмі.

Іраку, на яго думку, досвед Беларусі быў бы карысны для аднаўлення інфраструктуры, разбуранай вайной, а нашай краіне Ірак мог бы быць цікавым у плане рэсурсаў. Кіраўнік замежнай дэлегацыі таксама лічыць важным і перспектыўным супрацоўніцтва дзвюх краін у галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры, адукацыі, навукі.

— Мы цэнім традыцыйна сяброўскія адносіны паміж нашымі краінамі і разглядаем Ірак як значнага палітычнага і гандлёва-эканамічнага партнёра ў рэгіёне, — акцэнтаваў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД Ігар КАРПЕНКА**.

Дэпутат перакананы, што Беларусь і Ірак павінны паглыбляць адносіны па ўсіх кірунках.

— Мяркую, сённяшняя гутарка ў парламенце Беларусі паслужыць штуршком для развіцця адносін дзвюх краін у далейшым.

Палітык не сумняваецца, «што парламенцкая дыпламатыя можа аказаць істотны ўплыў на развіццё двухбаковага супрацоўніцтва, адносіны нашых краін на міжнароднай арэне» і наогул па ўсім спектры палітычнага і гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Народныя выбраннікі зацвердзілі справаздачу аб выкананні леташняга бюджэту. Сярод тэндэнцый, акцэнтаваных **міністрам фінансаў Андрэем ХАРКАЎЦОМ**, — значны рост рэальных даходаў насельніцтва. «Тройчы павышаліся заробкі ў бюджэтнай сферы. У студзені яны складалі ў сярэднім 800 тыс, а ў снежні — ужо 1,4 млн рублёў». Падтрымку ад казны павінен быў адчуць і рэальны сектар эканомікі.

Аднак не ўсё так прыемна было летась. Павялічыўся, напрыклад, дэфіцыт рахунку бягучых аперацый (які ўлічвае, у прыватнасці, імпарт дыэкспарт тавараў і паслуг). Як вынік, «праявіўся ўнутраны дысбаланс у эканоміцы, што ва ўмовах недастатковасці знешняга фінансавання ўзмацніла ціск на абменны курс нацыянальнай валюты і запатрабавала значных інтэрвенцый за кошт валютных рэзерваў краіны», адзначыў міністр фінансаў. Для падтрымання пэўнага ўзроўню золатавалютных рэзерваў былі павялічаны дзяржпазыкі. Гэта стала асаблівасцю нашага грашова-крэдытнага рэгулявання, удакладніў міністр. Адбыліся таксама структурныя змены ў бюджэце, выкліканыя актыўнай дзяржпадтрымкай эканомікі і росту выдаткаў на выплату заробкаў. Павялічылася ўдзельная вага расходаў на абслугоўванне і пагашэнне пазык, патанненне працэнтных плацяжоў па банкаўскіх крэдытах. Асобнага згадвання заслугоўвае нагрузка на бюджэт ад павелічэння заробкаў. Цана пытання — 1,4 трлн рублёў (што склала 0,9 адсотка да ВУП).

— Нагрузка ад павышэння заробкаў у поўнай меры адчуваецца сёлета, — падкрэсліў міністр фінансаў. — Доля расходаў на заробкі ў агульнай структуры бюджэту складае каля 40 адсоткаў, што на шэсць адсоткаў больш, чым у бюджэце мінулага года.

Сур'ёзна «насаліла» даходнай частцы змяненне ўмоў гандлю нафтай і нафтапрадуктамі. Страты даходаў бюджэту склалі каля 2,8 трлн рублёў (што адпавядае 1,7 адсотка да ВУП).

Сёлета на 1 студзеня знешняя дзяржаўная пазыка Беларусі складала, як паведаміў міністр, 9,7 млрд долараў, пры тым, што парогавае значэнне — 11 млрд долараў. Пачуўшы гэта, дэпутат Аляксей Кузьміч занепакоіўся, ці не перасягне краіна дазволены ліміт у рэчышчы новых запазычанняў. Андрэй Харкавец супакоіў яго, што Мінфінам былі праведзены належныя разлікі і парогавыя значэнні не будуць перасягнуты.

Беларускаму народу тэма фінансаў, бадай, яшчэ ніколі не была настолькі блізкай, як зараз. Памерам знешняй пазыкі цікавяцца нават людзі, далёкія ад лічбаў у прынцыпе. А дакладныя падлікі ў краме вядуць нават тыя, хто раней клаў у кошык упадабанае, не звяртаючы ўвагі на кошт. Натуральна, у журналістаў было аб чым запытацца ў міністра фінансаў.

Балючае пытанне для беларусаў — ільготнае крэдытаванне жылля. Многія з тых, каму падавалася, што запаветная кватэра ўжо так блізка, сёння ў паніцы: дзе ўзяць грошы на яе без ільготных крэдытаў?

Міністр фінансаў пацвердзіў, што пералік атрымальнікаў ільготных жыллёвых крэдытаў будзе скарэкціраваны. Аднак, паводле яго слоў, «гэта не сведчыць пра тое, што будаўніцтва жылля значна скараціцца. Аб'ёмы захаваюцца вялікія, бо ёсць патэнцыял росту фінансавання за кошт рынкавых крыніц, якія мы можам прыцягнуць».

Цікава таксама, якую брэш збіраюцца заткнуць нядаўна атрыманымі 800-мі млн долараў з Антыкрызіснага фонда ЕўрАзЭС.

— Мы не маем намеру выкарыстоўваць атрыманы крэдыт на фінансаванне бюджэтнага дэфіцыту, — заявіў А. Харкавец. — У бюджэту назапашана дастатковая рублёвая ліквіднасць, таму гэтыя рэсурсы пойдуць на больш надзейнае забеспячэнне золатавалютных рэзерваў.

У кантэксце перамоў беларускага боку са спецыялістамі Антыкрызіснага фонда закранаецца неабходнасць структурных рэформаў. Што маецца на ўвазе? Змены, скіраваныя найперш на павышэнне якасці функцыянавання эканомікі, удакладняе міністр фінансаў. Ён дадае, што размова ідзе, у тым ліку, і пра змену ўласніка. «Калі ўласнік больш эфектыўны, гэта ўжо адна са структурных рэформаў», — мяркуе міністр.

Сёння і кухарцы зразумела, што адной толькі дапамогай з фонда ЕўрАзЭС не абыдзешся.

— Мы працуем над прыцягненнем у краіну магчымага знешняга фінансавання, апроч крэдыту ЕўрАзЭС, — канстатуе А. Харкавец, аднак канкрэтызаваць, з кім і пра якія сумы ідуць перамовы, ён палічыў заўчасным. Удакладніў толькі, што размова ідзе не пра дзяржзапазычанні, а пра іншыя формы запазычанняў, але цалкам цывілізаваных.

Беларусь ужо мае вопыт з праграмай падтрымкі ад МВФ. Ці будзе яшчэ? Мінфін такой магчымасці не выключае. Вельмі цікава, колькі беларускія фінансісты папросяць у МВФ.

— Размова ідзе не пра тое, што нам трэба папрасіць грошай і ўзяць іх любой цаной, а пра тое, каб мы забяспечылі збалансаванае развіццё эканомікі, якое б адпавядала надзейным крыніцам фінансавання, — перакананы Андрэй Харкавец.

Калі захады, якія прапануецца рэалізаваць, стануцца дастаткова прадуктыўнымі для карэкціроўкі макраэканамічнай палітыкі Фонд, безумоўна, акажа Беларусі фінансавую падтрымку, адзначае спадар Харкавец. Місія экспертаў МВФ, якая нядаўна пабывала ў Беларусі, выказала свае рэкамендацыі. Сярод іх былі і тыя, што датычыліся курсавой палітыкі.

Афіцыйны курс у пустых абменніках не адступаецца ад узятай вышыні каля 5 тыс рублёў. У той час, як там, дзе долар у наяўнасці, за яго просяць 6 тыс., а то і больш. Мы цяпер усе ў курсе, што гэта пытанне да цэнтральнага банка краіны, але ж у Мінфіне, відаць, таксама аналізуюць неяк сітуацыю...

— Курс, аб'яўлены Нацбанкам, мае права на жыццё, — тактычна заўважае Андрэй Харкавец. — Пытанне ў тым, якой цаной ён будзе захаваны: можа спатрэбіцца больш інтэрвенцый.

Галоўнае — не толькі выхад на адзіны курс, але і мінімізацыя выдаткаў золатавалютных рэзерваў, падкрэслівае міністр. Ён не сумняваецца, што «мы прыйдзем да гэтага курсу», — пытанне толькі ў часе. На думку кіраўніка Міністэрства фінансаў, гэта павінна быць зроблена як мага хутчэй.

Зоя ВАРАНЦОВА.

СЧИТАТЬ НЕДЕЙСТВИТЕЛЬНЫМИ СТРАХОВЫЕ ПОЛИСЫ ЗАО «СК «БЕЛРОССТРАХ»:
— добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 0906321, 0906323, 0906346, 0906356, 0913181, 0916462, 0916504, 0923550-0923553, 0870139, 0968424-0968426, 0927714, 0986864, 0986874, 0945336, 0954512, 0806744, 0928773, 0928853, 0835051, 0870658, 0848148, 0865616, 0865619, 0941210-0941214, 0949901-0949905, 0958077-0958081
— квитанцию 1 СУ серия КС № 0907030
УНП 100782388

Погляд

СУСВЕТНЫ БАНК РЭКАМЕНДУЕ СТРУКТУРНЫЯ РЭФОРМЫ ЭКАНОМІКІ

ДЫРЭКТАР аддзела Украіны, Беларусі і Малдовы Сусветнага банка Марцін РАЙЗЕР прыязджаў у Мінск з трохдзённым візітам, дзе правёў перамовы і шэраг сустрэч з прадстаўнікамі беларускага ўрада. Напрыканцы свайго візіту спадар Райзер сустрэўся з журналістамі, дзе падзяліўся сваімі меркаваннямі пра дыялог з беларускімі ўладамі наконт прыярытэтных напрамкаў структурных рэформаў нашай эканомікі:

— Гэты візіт быў рэгулярным і стандартным для абмеркавання эканамічнай палітыкі з уладамі краіны, — сказаў Марцін Райзер. — Асноўны пасыл, які мы пастараліся данесці да ўлад, заключаецца ў тым, што падзеі апошніх месяцаў зрабілі яшчэ больш актуальнай рэалізацыю сур'ёзных макраэканамічных і структурных рэформаў. Наш базавы аналіз перспектыў развіцця эканомікі Беларусі фундаментальным чынам не змяніўся. Мы лічым, што краіне неабходна развіваць другую крыніцу і рухаючую сілу эканамічнага развіцця — прыватны сектар. Але, улічваючы макраэканамічную сітуацыю ў краіне, якая склалася, часавыя рамкі для правядзення лібералізацыі і структурных рэформаў скараціліся. У той жа час мы лічым, што ў 2011 годзе знешнія ўмовы для Беларусі больш спрыяльныя ў параўнанні з 2009 годам. І ў гэтым кантэксце паглыбленне структурных рэформаў можа прадаставіць значныя магчымасці як для прыватных інвестараў, так і для беларускай эканомікі ў цэлым. Мы падзяліліся з уладамі краіны некаторымі макраэканамічнымі прагнозамі, але мы ўсё яшчэ спрабуем разабрацца ў тым, які ўплыў на эканоміку акажуць тыя меры, якія ўжо былі зроблены, улічваючы тое, што сітуацыя мяняецца вельмі хутка. Адзінае магу сказаць, што неабходныя макраэканамічныя меры прывядуць да запавольвання эканамічнага росту ў другім паўгоддзі для таго, каб стабілізаваць і аднавіць баланс у эканоміцы. Сёння, выступаючы перад парламентам, ваш міністр фінансаў сказаў пра тое, што сёлета чакаецца рост у памеры 4-5%. Калі параўнаць гэта з тэмпамі росту на працягу першых пяці месяцаў года і зрабіць вылічэнні, то відавочна, што рост у другім паўгоддзі будзе ісці больш нізкімі тэмпамі. І гэта добра, бо гэта неабходна для аднаўлення балансу ў эканоміцы.

Мы вітаем планы ўлад па прыватызацыі. Бо мы лічым, што прыватныя ўласнікі ў канчатковым выніку з'яўляюцца больш эфектыўнымі менеджарамі. Мы лічым, што мэтай прыватызацыі павінна быць прыцягненне самых лепшых, найбольш эфектыўных менеджараў. Відавочна, што ў шмат якіх краінах прыватызацыя ажыццяўляецца ў сувязі з тым, што неабходныя і паступленні ад прыватызацыі. Зараз гэта можна назіраць у Грэцыі. Мы рэкамендуем не абапірацца выключна на паступленні ад прыватызацыі для таго, каб закрыць разрыў фінансавання, — сказаў Марцін Райзер і дадаў, што і прыватызацыя, і ўзмацненне жорсткасці макраэканамічнай палітыкі павінны адыграць сваю ролю ў стабілізацыі і аднаўленні знешняга балансу. — Мы заўсёды падкрэсліваем, калі кажам пра прыватызацыю, што яна адбываецца найбольш эфектыўна, калі ажыццяўляецца празрыстым і канкурэнтным чынам. І таму ў нашай уласнай дзейнасці мы аказваем падтрымку ў прыватызацыі не вядучых прадпрыемстваў, а прадпрыемстваў сярэдняга памеру — шляхам прыцягнення інвестыцыйных дарадцаў, якія дапамагаюць зрабіць працэдуру тэндара канкурэнтнай і празрыстай. Іншы раз для правядзення канкурэнтнага і празрыстага тэндара патрабуецца некаторы час. І калі гэты час неабходны для таго, каб удала рэалізаваць актыў, то гэта таго каштуе.

Мы падзяляем пазіцыю нашых калег з Міжнароднага валютнага фонду, мы таксама лічым, што ў Беларусі неабходна ўніфікаваць абменныя курсы. І ў абставінах, якія склаліся, мы лічым гэта немагчымым зрабіць без таго, каб не зрабіць курс гнуткім. Пры адэкватных грашова-крэдытнай і падаткова-бюджэтнай палітыцы гэта зусім не азначае, што спатрэбіцца дадатковая істотная дэвальвацыя, — выказаў меркаванне Марцін Райзер. — Але важна, каб меры макраэканамічнай палітыкі суправаджаліся паслядоўнай праграмай структурных рэформаў, разлічанай на трохгадовы перыяд, паколькі гэта дало б правільны сігнал для інвестараў і дало б станоўчы эфект у сярэднетэрміновай і кароткатэрміновай перспектывах.

Вы бачыце, што Нацыянальны банк уносіць змены ў сваю палітыку, робіць больш жорсткай крэдытную палітыку і скарачае мэтавае крэдытаванне ў рамках дзяржаўных праграм. Мы падзяляем ацэнку МВФ, якая заключаецца ў тым, што ў значнай ступені прычынай узнікшых праблем была мяккая крэдытная палітыка і мэтавае крэдытаванне ў рамках дзяржаўных праграм. Мы яшчэ паназіраем, наколькі далёка пойдзе Нацбанк у гэтым напрамку, але мы падтрымліваем яго дзеянні па пераглядзе палітыкі мэтавага крэдытавання і па ўзмацненні жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі. Шэраг мер ужо зроблены Нацбанкам, мы падтрымліваем гэты напрамак руху, і, мабыць, нават раілі б пайсці яшчэ далей, чым яны да гэтага прасунуліся, — сказаў Марцін Райзер і дадаў, што па выніках сустрэч у яго склалася ўражанне, што беларускае кіраўніцтва ўсведамляе неабходнасць уніфікацыі абменных курсаў, і выказаў меркаванне, што калі гэта адбудзецца, то сітуацыя даволі хутка стабілізуецца.

На тэхнічным узроўні ў нас па-ранейшаму захоўваецца добрае разуменне нашых рэкамендацый. Я не кажу, што існуе згода з усімі нашымі рэкамендацыямі, але гэта як і ў іншых краінах. Пры гэтым існуе разуменне рэкамендацый і таго, на аснове якога аналізу мы іх прапануем. І мы спадзяёмся, што будуць весціся актыўныя дыскусіі паміж Нацбанкам, урадам і ўсімі іншымі органамі, якія прымаюць рашэнні, бо ў сітуацыі, якая склалася, гэта неабходна.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ГРАЖДАНАМ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА.
Организатор аукциона — Новомышский сельский исполнительный комитет Барановичского района Брестской области

№ п/п	Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка	Характеристика	Площадь земельного участка, га	Назначение участка	Начальная цена земельного участка, рублей	Сумма задатка, рублей	Затраты на организацию и проведение аукциона
1.	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Звездная, ул. Клубная, д. 21 120486002601000531	Участок свободен от застройки. Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети	0,1572 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	13 866 300	1386630	Стоимость за: государственную регистрацию прекращения прав на него 70 000 руб., информационных сообщений в средствах массовой информации — газетах «Наш край», «Звязда», официальном сайте Государственного комитета по имуществу РБ
2.	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Звездная, ул. Славянская, д. 36 120486002601000446	Участок свободен от застройки. Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети	0,1563 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	13 945 820	1394580	Стоимость за: государственную регистрацию прекращения прав на него 70 000 руб., информационных сообщений в средствах массовой информации — газетах «Наш край», «Звязда», официальном сайте Государственного комитета по имуществу РБ

1. Аукцион состоится **29 июля 2011 года в 15.00** в здании Новомышского сельисполкома по адресу: Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, д. Новая Мышь, ул. Парковая, 6.

2. Условия аукциона:

- к участию в аукционе допускаются граждане, подавшие заявления в соответствии с действующим законодательством.

3. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории РБ или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 5%.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;
- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;
- доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется до 26 июля 2011 г. до 13.00 на р/счет 3600211140009 в ф-л 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», код платежа 4901, УНП 200047005.

Адрес банка: г. Барановичи, Б. Штоккерау, 8А.

Получатель: Новомышский сельский Совет депутатов, 225331, Брестская обл., Барановичский р-н, д. Новая Мышь, ул. Парковая, 6.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену.

Результаты аукциона утверждаются решением комиссии по проведению аукциона.

В случае наличия одной заявки предмет аукциона может быть продан по начальной цене с учетом шага аукциона по решению комиссии.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по телефону (8 0163) 43 12 36.

8. Продажа земельного участка производится без изменения его целевого назначения.

9. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 8.00 до 17.00 в Новомышском сельисполкоме. Последний день приема документов **26 июля 2011 г. до 13.00.**

Заключительная регистрация участников аукциона **29 июля 2011 г. с 14.00 до 15.00.**

К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

10. Победитель аукциона обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации зем. участка и затраты на подготовку и проведение аукциона (в том числе затраты, связанные с размещением извещений о проведении аукциона в средствах массовой информации); внести плату за земельный участок. Не позднее 2-х месяцев после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок.

«Я СУСТРЭЛАСЯ САМА З САБОЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)

— Як вы адкрылі ў сабе рысу ці жаданне раскрывацца перад кімсьці?

— Як чалавек вясковы, я не вельмі ўпэўнена ў сабе. Часта займаюся самаедствам. Але ў гэтай прафесіі я магу быць не сама сабой, а іншым чалавекам. Я пачала сябе інакш адчуваць: я магу быць упэўненай, прыгожай. Заканчваецца спектакль — я зноў станаўлюся сабой. Можа, гэта і добра, што ў мяне не было ўнутры моцнага граніту, і я магу ляпіць з сябе нешта. Таму што акцёрская натура дазваляе чалавеку самому стаць інструментам, з якім ён працуе. Каб я была жалезабетонная, то, можа, і не ўпісалася б у нейкія ролі, не мяла б сябе так. Але мне зразумелы і гэты, і той бок жыцця, і іншы бок жанчыны. Калі пачынала асвойваць сцэну, то зразумела: гэта дзіўнае адчуванне таго, што ты падымаешся над залай (не толькі з-за таго, што сама сцэна вышэй). Ты сам падымаешся... І калі заканчваецца спектакль, то такое адчуванне, што ты прыйшоў з іншага свету. З харошага, нават калі драматычная роля, нават калі са слязамі. Таму я думаю, Бог мяне не абдзяліў, а калі штосьці і было не так, як хацелася, то напэўна таму, што заслужыла. Бог даў прафесію — тое, што для мяне радасць да сённяшняга дня. Таму што я была ў медыцыне, працавала, у інстытут нават пайшла. Але Бог вывеў мяне на гэты шлях.

— А што стала вырашальным момантам?

— Мне падабалася гэта яшчэ з дзяцінства. Мы хадзілі ў сямігодку ў вёску Емяльянава. У нас была настаўніца, выкладала рускую мову, цудоўна спявала пад гітару. Я вельмі прасіла, каб яна мяне вучыла. Пасля купіла гітару, але яе трэба было настройваць, а я не ведала, як, яна ў мяне проста вісела не сцяне. А потым была настаўніца беларускай мовы ў дзесяцігодцы, якая іграла на акардэоне. Яна мне пакінула акардэон. Але мама казала: чужая бяда, не чапай. Я не магла адарвацца, трохі іграла. А ў тэатральна-мастацкім інстытуце я вучылася па самавучыцелі на фартэпіяна. Мне ўсё было цікава. Напэўна, нешта для сябе шукала. Тэатральна-мастацкі інстытут адкрыў цэлы неверагодны свет, дзе столькі ведаў па гісторыі мастацтваў, тэатра, гімнастыка, танцы...

Калі ў нас была гісторыя мастацтва, я глядзела скульптуры Мікеланджэла. Мяне вельмі зачапіла. І калі мы з Яўгенам Шыпілам сыгралі ў фільме «Новая зямля» (я сыграла Ганну, а ён дзядзьку Антося), то была ад Міністэрства культуры паездка ў Італію. Я падумала: можна паглядзець Мікеланджэла! А ў нас тады нічога не было, нават койкі, жылі бедна, дзесі — двойня. Але кватэру нам давалі басплатна. А ў астатнім галата была. Ён кажа: «Куды ехаць? Лепш купім што-небудзь у хату». Але я яго ўгаварыла і мы паехалі, паглядзелі Мілан, Фларэнцыю, Венецыю.

А што вырашальным было... Напэўна, усё-такі маміны песні. Аднойчы ў інстытуце я заспявала ў адным урыўку, думаю, што гэта мне дапамагло: пайшла, пачала іграць. І толькі ў Віцебску ў спектаклі «Сымон-музыка» Мазынскі папрасіў заспяваць народныя песні пад колаcаўскія радкі — так лягло. Ёсць гэты цудоўны пласт народнай песні, які я для сябе адкрыла. Я пачала ўспамінаць і спяваць песні. Я іх не запісвала нідзе. І калі шчыра гаварыць, то я без песні многа б так не сыграла. У ёй столькі заложана нечага — ад зямлі, напэўна, ад травы, ад сонца. Божы свет! Але закладзена так, што перадаецца такая сіла, такая моц — фізічна адчуваю гэтую гармонію.

— Вы ж і ў кіно спявалі — асаблівае спалучэнне акцёрскай працы і песні.

— Можна проста спеваком быць, а калі ты яшчэ драматычны акцёр, то, безумоўна, унутры прапрацоўваеш песню ад пачатку да фіналу. Гэта як расказ пра жыццё. Калі я спявала вясельную песню ў «Людзях на балоце», то Тураў уставіў яе, калі развітваецца Ганна і Васіль. І гэта песня гучыць там трагічна...

Калі я прыехала ў Мінск з Віцебска, то ў мяне не было ніякай працы. Я прапанавала Пінігіну, які тады працаваў у Купалаўскім тэатры, зрабіць спектакль з песень. Народная песня ў жыцці чалавека: ад нараджэння да смерці. Ён напісаў сцэнарый, мы паставілі спектакль у Тэатры кінаакцёра. Рэжысёр дабавіў скрозь усю дзею шлях Хрыста ад нараджэння да смерці. І калі ідзе сцэна ўкрыжавання, у мяне гучыць гэтая песня — яна дакладна кладзецца на тэму.

У рэжысёра была ідэя, што менавіта ад сялянкі павінна ісці галоўная думка. Мы зрабілі ўсё дакладна: прыходзілі першым разам з этнаграфічнага музея, каб намітку мне правільна завязаць. Мы вельмі доўга баяліся, ці маем права пра гэта на сцэне гаварыць. Але пасля ўпэўніліся, таму што праз лёс чалавека праходзяць розныя моманты жыцця, і трагічныя таксама. І высока над намі ёсць адчуванне чалавечага болю і спагада...

— Вы яе адчувалі, калі не пабаяліся пачаць спачатку, аднойчы кінуўшы ўсё, з дзецьмі?..

— Так, цяжка было. Але дзякуй Богу! Бывала такое адчуванне, калі здаецца, што ўжо ўсё!.. Немагчыма. Няма сіл. І менавіта калі ты пачынаеш губляцца, то ў гэты момант нібыта пад цябе ручкі падкладваюць, штурхаюць уперад.

— Вам трэба было адначасова ў прафесіі сцвярджацца, і па-чалавечы, і як маці, і па-жаночы...

— Па-жаночы — ужо хай з ім. Выжыць бы! Страх, які з'явіўся тады, ад таго, што так можа ўсё перавярнуцца, і боязь, што гэта можа паўтарыцца, мяне трымае ўжо дваццаць гадоў. І я лічу, што лепш я ціхенька, адна.

— Дочкі вас падтрымлівалі?

— Цяпер, калі сталі самастойныя, асабліва хвалююцца за мяне. А ў той момант яны былі самі разгубленыя. Прыехалі сюды, пайшлі ў школу, а школа ж сталічная. У мяне няпростая жаночая сітуацыя, я толькі пераехала, ні спектакляў, ні здымкаў. А іх у школу не бяруць! Яны восем класаў скончылі, а дырэктрыса кажа: «Хай ідуць у ПТВ, у іх тройкі». Я ў адказ: «Ведаеце, я нарадзілася ў вёсцы, у маёй мамы было трое дзяцей, не было пашпарта, ні капейкі грошай не плацілі ў калгасе. І мама мяне вывучыла, я змагла атрымаць дзве вышэйшыя адукацыі. І я дзецям сваім сяроднюю адукацыю не дам?» Потым мне патлумачылі, што не трэба угаворваць, ёсць жа права сярэдняй адукацыі. Я напісала заяву, а дырэктрыса мне: «Вас нехта ўжо навучыў...» А потым дома дзецям устроіла: «Як гэта тройкі ў вас?!..» Яны абяцалі: мама, болей не будзем... Пасля яны пайшлі ў беларускі ліцэй. Дзяўчаты ўжо разумелі, што трэба ўтраіх нам рухацца. А потым адкрыўся наш тэатр. І кіно пайшло.

— Людзі звычайна такіх момантаў пазбягаюць, калі трэба зрабіць выбар.

— Я думала, што я сама такі чалавек — туляга. Спадзяюся, што ўсё само разыйдзецца. Але аднойчы я чытала збор рэлігійных тэкстаў, памятаю адтуль цудоўную фразу: «Мы рабы свабоднага выбару». Вельмі коратка, дакладна. Няўжо Бог не мог нас стварыць, каб не было ўнутры чалавека гэтага паскудства? Я кажу пра сябе... Так, ты можаш выбіраць. Я думала, што схільная хавацца ў пясок. Але калі здараецца штосьці надзвычайнае, фундаментальнае, калі трэба выбраць — я выбіраю дакладна і назаўсёды. Выбіраю так, што назад дарогі ніколі няма. Я вельмі доўга цярплю, вельмі доўга не прымаю паражэння. Я ўсё-такі думаю, што наладзіцца, пастараюся, пацярплю... Але ў нейкі момант усё ляціць. Я не шкадую. Можна было выбраць пасярэдзіне, як у маім жыцці. Смешна, сапраўды, па цяперашнім часе: падумаеш, мужык захапіўся. Казаў: «Дай шанц». Але немагчыма. А цяпер разумею — напэўна, можна было неяк ператрываць. Цяпер я астыла. А тады каханне такое было...

— А яно і адчуваецца ў вашых працах, і асабліва песнях...

— Мяне часта бралі на сустрэчы, дзе я спявала. Ведалі, што мне цяжка фінансава, я там нешта атрымлівала. Памятаю, неяк спяваю: «Божа мой божа, гора мне гора, што мой міленькі не начуе дома». Спяваю і думаю: толькі б не плакаць... Канчаецца сустрэча, жанчыны мяне акружаюць. Кожная сваім болем дзеліцца.

У мяне мама ў гэтым сэнсе была аптымістка. У 65 гадоў яна выходзіла замуж у Вілейцы. Зрабілі шыкоўнае вяселле, загарадзілі дарогу. У вёску яе мужык узяў. Яна прывыкла жыць у вёсцы, гаспадыняй быць. А тады яшчэ і развялася. Яна прыехала ў 90 гадоў да мяне, мы з ёй песні спявалі. У 96 гадоў адышла ціха-ціха.

— Але і вы, напэўна, аптымістка: з мамінымі песнямі дайшлі да клубнага жыцця, у модных праектах удзельнічаеце.

— Так, спявала ў клубе «Лісіная нара». Праект пачалі рабіць у нас у тэатры, мяне запрасілі сур'ёзныя хлопцы. Вельмі спадабалася. Можна было б шмат чаго рабіць, каб толькі хто цікавіўся.

У мяне ёсць настрой, сілы, можа і сама вінаватая, сёння трэба быць трошкі менеджэрам самому сабе. Але мы з савецкіх часоў прывыклі чакаць, каб запрасілі, самі не прапаноўваем сябе. Вось аднойчы мяне запрасілі, быў такі рок-гурт «Уліс». Паехалі дыск пісаць у Ольштэн, што ў Польшчы. Яны пісалі рок і паміж накладвалі народную песню. Калі мне далі гэты дыск, я паслухала — так шыкоўна! Вось калі запрашаюць, то можна рабіць. А хадзіць самой нешта прасоўваць — ну яго, лепш у агародзе пасяджу.

— Якія рэчы радуюць вас па-чалавечы?

— Мяне цяпер радуе Божы свет. Я як быццам яго не бачыла. Я ў дзяцінстве была пастушком. З вясны да восені ўвесь час была ў полі. З раніцы да вечара. Ці сонца, ці дождж, ці вецер, ці навальніца. Кветкі адны адыходзяць, другія распускаюцца. Бывала, калі ранні Вялікдзень, то праз наш агарод бегла ручаіна. Узгадваю шум і хруст лядку, які прымарозіў. І валачобнікі спявалі ў вёсцы...

Менавіта гэтае шчасце, якое было ад таго, што я жыла ў гэтым свеце. І цяпер у мяне адчуванне, што занава гэта ўбачыла: мошачак, лісце, кветкі, сонца... З задавальненнем перачытваю Германа Гесэ, калі вельмі дрэнна. І думаю: як гэта ён мяне разумее? У яго цудоўная думка, што працаваць трэба не на рэчаіснасць, якая ўсё роўна ўлезе ў тваё жыццё, а дзеля таго, каб займацца сваім унутраным светам. Таму што супрацьстаяць гэтай рэчаіснасці цяжка, асабліва таму, што ў чалавеку ёсць грахоўнасць, з якой нічога не зробіш.

— Кажуць, што любую грахоўнасць можа Бог дараваць. Чалавеку бывае больш цяжка дараваць самому сабе, як вам здаецца?

— Мяняць сябе ў лепшы бок невыносна цяжка. Лягчэй кінуць усё, як ёсць. Але калі хаця б спынішся, сядзеш і паглядзіш на навакольны свет — ужо шмат значыць. Гэтым і ратуюся. Чым часцей спыняешся, тым лепш.

— Але ў вас ёсць магчымасць ратавацца: быць рознай дзякуючы ролям — камічным, драматычным, сялянак, дам і манахінь. Якія вам самой бліжэй?

— Беларускай жанчыны-маці. Гэта і ў спектаклі «Сымон-музыка», і ў «Вечары» Дударава, у «Новай зямлі» Ганна. Была роля Алімпіяды ў тэлеспектаклі паводле Пташнікава. Монаспектакль «Вячэра» паводле Яўгена Шабана. Але раптам нам малады хлопец Мікалай Рудкоўскі напісаў «Жанчын Бергмана», і аказалася, што і гэта маё. Я вельмі пакапалася ў Бергмане, таму што цікава было разгадаць унутраную матывацыю, якая схаваная. Гэта ўсё тая ж самая жанчына — яе адзінота. Тут жанчына і дзяўчына, якая таксама мацярынскай любові шукае. І я сама, якая закрылася. Гэтая дарога да ўзаемаразумення і прыняцца адзін аднаго — праз такую муку і такую жорсткасць ідзе!.. Таму што ёсць унутраная боязь. Спачатку чалавек закрыты, а пад канец адкрываецца і гаворыць так, як ёсць. Мы так і жывём. Так баімся нечага ў сабе, што, можа, і праходзім міма тых людзей і тых узаемаадносін, у якіх трэба было адкрыцца і не баяцца.

Але я гэта разумею. Прасцей сказаць: нічога больш не трэба. Усё толькі на сцэне і ў фантазіях. Але ж і ў гэтым ты чалавек. Я аднойчы сама сабе прызналася: сустрэлася з вельмі цікавым чалавекам, дзеля якога ёсць сэнс жыць. Гэта вельмі дорага каштуе. Так, бывае вельмі цяжка. Але цяпер дзеці пры мужыках. І я ўздыхнула, глянула на гэты свет. І нечакана сустрэлася з добрым чалавекам — я сустрэлася сама з сабой...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 13 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць прас, сокавыціскалку, электрасушылку або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **14 ліпеня 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 23 ліпеня 2011 г.**

Дастаўку электрасушылак і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 17.05.11 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 17.05.11 па 30.09.11.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1892 ад 11.05.11, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

10 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на III кв. або 2-е паўг. 2011 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб.; пераадрасоўкі _____ руб.

Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Краіна здароўя
Выпуск № 35 (271)

Доктар адкажа

«Дзіцяці 2,5 месяца. Кармлю яго грудным малаком. Вельмі апасаюся алергіі, а таму істотна абмяжоўваю сябе ў шэрагу прадуктаў — у першую чаргу, фруктаў, ягад і нават некаторай гародніны. Аднак, напэўна, дзіця недаатрымлівае пры гэтым карысных рэчываў... Як мне трэба харчавацца ў гэты перыяд і калі трэба пачынаць прыкорм?

Аліна, *г. Мінск».*

КАБ ГРУДНОЕ МАЛАКО НЕ БЫЛО «ПУСТЫМ»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 7-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска, урач-педыятр 1-й катэгорыі Наталля УЛАСЕВІЧ:

— Мама, якая выкормлівае дзіця грудным малаком, мае патрэбу ў дадатковым паступленні харчовых рэчываў і энергіі. Харчаванне ў гэты перыяд павінна быць у дастатковай колькасці і збалансаваным па складзе. Асабліва гэта важна для першага паўгоддзя, калі дзіця поўнасцю знаходзіцца на грудным выкормліванні.

Безумоўна, мамам не рэкамендуецца ўжываць прадукты, якія ўтрымліваюць штучныя фарбавальнікі і кансерванты. Катэгарычна забараняюцца курэнне і алкаголь. Неабходны адэкватны пітны рэжым. Калі любы дарослы павінен ужываць на працягу дня каля 2,5 літра вадкасці, уключаючы чай, суп, фрукты і інш., то маці, якая корміць, павінна дадаць у рацыён яшчэ 1 літр, які можна забяспечыць з дапамогай спецыяльных напояў для мам на кармленні.

Матулям, якія непакояцца адносна дэфіцыту карысных рэчываў у сваім харчаванні, а адпаведна і ў харчаванні дзіцяці, мы рэкамендуем праводзіць карэкцыю з дапамогай такіх сухіх напояў, як «Белакт-мама», «Фемілак», «Мадона», «Амалтэя», узбагачаных бялком, вітамінамі і г.д. Гэта цалкам гіпаалергенны прадукт. Можна ўжываць і вітамінна-мінеральныя комплексы, прызначаныя менавіта для кормячых матуль.

Прыкладны сутачны набор прадуктаў для кормячых матуль будзе выглядаць наступным чынам:

— хлеб пшанічны — 150 г
— хлеб жытні — 100 г
— крупы, макарона — 70 г
— бульба — 200 г
— гародніна (акрамя бульбы) — 500 г
— фрукты свежыя — 300 г
— фрукты сухія — 20 г
— сокі — 150 г
— мяса жывёл і птушкі — 170 г
— рыба — 70 г
— малако, біяёгурты, кефір і іншыя кісламалочныя прадукты 2,5% тлустасці — 600 мл
— тварог 9% тлустасці — 50 г
— масла сметанковае — 25 г
— алей — 15 г
— яйка — 1/2 штукі
— сыр — 15 г
— соль — 8 г.

ПРЫКОРМ

Да прыкорму адносяцца любыя прадукты (акрамя груднога малака і дзіцячых малочных сумесяў), якія дапаўняюць рацыён харчавання дзіцяці рэчывамі, неабходнымі для яго далейшага гарманічнага развіцця. Патрэба ў першых прыкормах узнікае напрыканцы першага паўгоддзя жыцця.

Першы прыкорм — каша. Узрост увядзення — не раней як 6 месяцаў. У асобных выпадках гэты прыкорм уводзіцца пасля 4 месяцаў, аднак толькі пасля ўзгаднення з урачом-педыятрам. Каша ўводзіцца ў другое кармленне (прыкладна паміж 10 і 11 гадзінамі) на працягу некалькіх дзён паступова.

Другі прыкорм — пюрэ з гародніны. Уводзіцца праз 2 тыдні пасля кашы (прыкладна ў 6,5 месяца). Спачатку варта прапаноўваць пюрэ з аднаго віду гародніны. Уводзіцца ў трэцяе па ліку кармленне (паміж 14 і 15 гадзінамі).

Трэці прыкорм — мяса. Уводзіцца праз 1,5-2 тыдні пасля пюрэ з гародніны, але не пазней за 7 месяцаў жыцця. Мяса дадаецца ў пюрэ з гародніны штодня. Спачатку мясное пюрэ, з 8-9 месяцаў — мясныя фрыкадэлькі, да 11-12 месяцаў паравыя катлеты. Варта аддаваць перавагу нятлустым гатункам мяса: цяляціне, мясу індычкі і інш.

З 8-9 месяцаў замест мяса адзін-два разы на тыдні ўключайце ў рацыён дзіцяці рыбу, за выключэннем далікатэсных — сёмгі, гарбушы, кеты, у якіх шмат солі і тлушчу.

Схема харчавання дзяцей ранняга ўзросту павінна быць гібкай. Так, пры лішняй масе цела рэкамендуецца пачынаць з пюрэ з гародніны, следам уводзіць мяса і толькі пасля кашу.

З 7-8 месяцаў можна дадаць жаўток зваранага ўкрутую курынага яйка. Жаўток з'яўляецца каштоўнай крыніцай вітамінаў А і Д. Плодагароднінныя сокі і фруктовыя пюрэ ўключаюцца ў рацыён пасля ўвядзення прыкормаў (каш, пюрэ з гародніны і мяса). З 7 месяцаў можна даваць дзіцячае пячэнне або сухарык з белага хлеба. З 8 месяцаў — кавалачак пшанічнага хлеба (з 5 да 10 г да года). Дзіцячы кефір і дзіцячы ёгурт — не больш як 200 мл у суткі — уводзіцца пасля 8 месяцаў. Цэльнае каровіна малако не рэкамендуецца для дзяцей першага года жыцця: яно з'яўляецца найбольш частым алергенам у гэтым узросце.

Асноўная прыкмета дастатковага харчавання дзіцяці — штомесячная прыбаўка масы цела. Гарманічнае развіццё прадугледжвае суадносіны масы да росту і ацэньваецца па спецыяльных табліцах.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА III КВАРТАЛ АБО 2-е ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ



ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	14 600 рублёў на месяц 87 600 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	13 400 рублёў на месяц 80 400 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	24 800 рублёў на месяц 148 800 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	22 200 рублёў на месяц 133 200 рублёў на паўгоддзе

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	13 250—13 350 рублёў на месяц 79 500—80 100 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	12 120—12 150 рублёў на месяц 72 720—72 900 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	19 591—22 511 рублёў на месяц 117 546—135 066 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	18 063—20 140 рублёў на месяц 108 378—120 840 рублёў на паўгоддзе

* Залежыць ад рэгіёна

Гарачы пясочак

Чачэрскія падлеткі адпачываюць на пляжы гарадскога возера.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пра дыеты і не толькі

ПАХУДЗЕЦЬ ЦАНОЙ ЖЫЦЦЯ

Дыягназ «нервовая анарэксія» ставіцца, калі вага цела зніжаецца на 15% ад ніжняй мяжы нормы. Пацыентаў з гэтым захворваннем некаторыя медыкі называюць ахвярамі прыгажосці. У пагоні за мадэльнымі стандартамі, якія так актыўна прапагандуюць глянцавыя часопісы і тэлебачанне, юныя дзяўчаты даводзяць сябе да поўнага фізічнага знясільвання.

Нервовая анарэксія сустракаецца галоўным чынам у дзяўчынак-падлеткаў. З кожных 18 хворых толькі адзін — мужчына. Да 1960-х гадоў гэта захворванне сустракалася рэдка, але затым яго частата пачала павялічвацца. Паводле сучасных звестак, ад нервовай анарэксіі пакутуе 1% дзяўчынак-падлеткаў.

Гэта адно з нешматлікіх смяротна небяспечных псіхічных парушэнняў. Чалавек у рэшце рэшт можа памерці ад знясільвання. Ключавая праблема захворвання ў тым, што самаацэнка такіх хворых напрамую залежыць ад формы і вагі цела. Яны адчуваюць сябе ўпэўненымі і канкурэнтаздольнымі, толькі з'яўляючыся прыгожымі, а гэта значыць — худымі. Лішняя вага, як ім здаецца, робіць іх няўдачнікамі і аб'ектамі ўсеагульных насмешак. Яны імкнуцца з усіх сіл прыблізіцца да ідэальных формаў. Прычым часта гэтая лішняя вага надуманая, многія хворыя з дыягназам «анарэксія» зусім не пакутавалі ад лішку вагі. Для хваробы характэрны празмерны, паталагічны страх атлусцення і імкненне пахудзець любой цаной — цаной здароўя і часам нават жыцця.

Вылучаюць два тыпы харчовых паводзін пры нервовай анарэксіі, і абодва яны могуць назірацца ў аднаго і таго ж чалавека ў розныя перыяды часу. Першы — абмежавальны — праяўляецца ў валявым захаванні строгай дыеты, пастоў, галадання. Другі тып — ачышчальны, калі такі звышкантроль парушаецца і рэгулярна здараюцца прыступы некантралюемага пераядання з далейшым ачышчэннем (выкліканне ванітаў, прыём слабіцельнага). Часта ў абодвух выпадках прысутнічаюць празмерныя, знясільваючыя фізічныя нагрузкі. Такім чынам, у барацьбе з лішнімі калорыямі для людзей, якія пакутуюць ад анарэксіі, усе сродкі добрыя: ад дыет і тайскіх таблетак — да клізмы, мачагонных прэпаратаў і штучнага выклікання ванітаў. І тут няма мяжы «дасканаласці»: хвораму, на колькі б ён ні схуднеў, усё мала. Ён гатовы катаваць сябе да крытычнага стану. У запушчаных выпадках толькі смерць спыняе яго ў гэтай гонцы за прыгажосцю.

Хвароба праходзіць на фоне дэпрэсій і агульнага эндакрыннага парушэння: у чалавека выпадаюць валасы, пагаршаецца стан скуры, ломяцца пазногці, знікае сэксуальнае жаданне, у жанчын спыняюцца месячныя.

Часам нервовая анарэксія ўскладняецца нервовай буліміяй і гіперфагічнай рэакцыяй на стрэс. Гэтыя захворванні таксама адносяцца да класа парушэнняў харчовых паводзін. Для ўсіх іх характэрная няздольнасць чалавека кантраляваць аб'ём, якасць ежы і рэжым яе прыёму.

Пры нервовай буліміі чалавека пастаянна пераследуюць прыступы пераядання — абжорства. За кароткі перыяд часу хворы можа з'есці велізарную колькасць ежы. Каб не паправіцца, ён выкарыстоўвае ўсё тыя ж сродкі пахудзення, што і чалавек, які пакутуе ад анарэксіі.

Гіперфагічная рэакцыя на стрэс, так званая «рэакцыя стрэс — халадзільнік», — парушэнне, пры якім чалавек у стрэсавай сітуацыі (напрыклад, калі ён усхваляваны, прыгнечаны або, наадварот, занадта радасны) звяртаецца да ежы як да сродку, які кантралюе настрой. Хтосьці здымае напружанне чаркай алкаголю, хтосьці «балуецца» наркотыкамі; людзі з гіперфагічнай рэакцыяй на стрэс у якасці лекаў аддаюць перавагу ежы ў вялікай колькасці. Гэта проста, даступна, танна і на першы погляд бяскрыўдна. Вынік — павелічэнне вагі і жаданне ад яе пазбавіцца.

Хвароба дзяўчынак-падлеткаў

Нервовая анарэксія — гэта хвароба дзяўчат-падлеткаў ва ўзросце ад 13 да 25 гадоў. У іх асаблівы склад характару — ярка выражаная эмацыйнасць, залежнасць ад высокіх планак і нарматываў, імкненне да дасканаласці. Гэта перфекцыяністкі, дзяўчынкі-выдатніцы і мадэлі. Вельмі важна не даць хваробе развіцца і своечасова звярнуцца да доктара. Самалячэнне тут немагчыма. Бо анарэксія — гэта псіхічнае захворванне. І чалавек не заўсёды разумее, што ён хворы. Бацькі заўважаюць, што дзіця есць вельмі мала, худнее не па днях, а па гадзінах. Яны прымушаюць дачку есці з-пад палкі, але дзяўчынка не бачыць у гэтым нічога добрага. Яна хоча пахудзець і працягвае выклікаць ваніты нават пасля таго, як яе прымусілі паесці мама з татам. Акрамя таго, арганізм, які прывык да харчавання анарэктыка, можа адчуць сябе вельмі дыскамфортна, і ваніты пачнуць адбывацца міжвольна, самі па сабе. Толькі доктар зможа правесці тэрапію, якая пераканае хворага, што ён хворы, і прызначыць лекі, у тым ліку спецыяльныя антыдэпрэсанты, якія дазволяць справіцца з дэпрэсіяй, навучаць кантраляваць самога сябе, пазбавяць ад страхаў.

Запушчаную анарэксію лячыць вельмі складана; калі ўпусціць момант, яна можа стаць вар'яцкай. У гэтым выпадку ў хворага цалкам скажаецца ўспрыманне ўласнага цела: дзяўчына ўжо не можа хадзіць ад знясільвання, але лічыць, што яна тоўстая, і працягвае худзець. Аднымі лекамі тут, на жаль, не абысціся. Такім людзям прамая дарога ў псіхіятрычную лякарню, дзе яны будуць знаходзіцца пад кругласутачным татальным назіраннем. Іх будуць сілком карміць і сачыць за тым, каб яны не пазбаўляліся ад з'едзенага.

Парады бацькам

Лічыцца, што калі своечасова пачаць лячэнне, хвароба можа прайсці бясследна. Але арганізм — вельмі складаная рэч, і мы не можам сцвярджаць, што ён не становіцца больш уразлівым для іншых хвароб і ў далейшым не павысіцца рызыка з'яўлення іншых псіхічных захворванняў. Таму лепш не лячыць, а папярэджваць захворванне. Проста будзьце больш уважлівымі да сваіх дзяцей.

Калі дзіця садзіцца на дыету — гэта трывожная прыкмета. Калі ў вашай дзяўчынкі насамрэч праблемы з вагой, то неабходна лячэнне. Але толькі ўрач зможа прызначыць правільную дыету, якая не толькі знізіць вагу, але і не нашкодзіць арганізму. Аднак часцей за ўсё дзіця хоча пахудзець зусім не таму, што пакутуе ад атлусцення. Проста яму не хапае бацькоўскай увагі і любові або яго крыўдзяць аднагодкі. У яго з'яўляецца лжывая ўпэўненасць, што навакольныя не любяць яго таму, што ён недастаткова прыгожы. У гэтым выпадку вельмі важна растлумачыць дзіцяці, што знешні выгляд — гэта не галоўнае. Што мама з татам ганарацца ім незалежна ад яго вагі і, каб заслужыць прызнанне навакольных, зусім неабавязкова выглядаць, як мадэль з вокладкі.

Дарэчы, асабліва ўважлівымі да дачок павінны быць таты. Часта дзяўчаткі даводзяць сябе да нервовай анарэксіі, спрабуючы адпавядаць свайму тату. Худзеюць, каб стаць «вартай» дачкой, часам нават пад уплывам бацькоўскай крытыкі.

Акрамя гэтага, бацькам трэба пазбавіцца ад уласнага перфекцыянізму. Ні ў якім разе нельга, калі самі не былі паспяховымі, спрабаваць рэалізавацца за кошт дзяцей. Залішняя крытыка, ціск, высмейванне памылак, завышаныя планкі — усё гэта фактары, якія могуць павысіць рызыку развіцця нервовай анарэксіі.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

СЕРАДА, 29 ЧЭРВЕНЯ

ПЕРШЫ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00 (з сурдаперакладам), **15.00, 19.00, 22.50** Навіны.
6.05, 7.10, 8.15 «Добрай раніцы, Беларусь!».
7.05, 8.05, 18.50, 1.45 Зона Х.
7.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.35 «Сфера інтарэсаў».
9.10, 19.55 Серыял «Маргоша».
10.05, 17.05 Серыял «Маршрут міласэрнасці».
10.50, 17.55 Серыял «Маруся. Вяртанне».
11.35 «Зямля беларуская». «Мядзельскія вытокі».
12.10, 21.45 Серыял «Сваты-3».
13.10 Дак. фільм «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан. XX стагоддзе пачынаецца». Невядомая версія».
14.00 «Праверка чутак».
14.30 «Час цяжкіх рашэнняў».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.35, 1.15 «Эпоха». Зоркі 64-га Канскага кінафестывалю.
16.05 Серыял «Апошняя рэпрадукцыя». Заключная серыя.
19.30 Зямельнае пытанне.
21.00 «Панарама».
23.00 Дэтэктыў «Чысцільшчык».
0.30 Серыял «Доктар Хаус-5».
1.50 Дзень спорту.

АНТ

6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00 (з субцітрамі), **18.00, 20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.20 «Смак».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева».
11.55 «Дэтэктывы».
12.30 «Жывая прырода: прамы рэпартаж».
13.10 «Кантрольная закупка».
13.45 «Модны прыгавор».
14.45 «Зразумець. Дараваць».
15.25 «Хачу ведаць».
16.15 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
17.05 Серыял «Зачараваны ўчастак».
18.20 Серыял «Шчаслівыя разам».
18.55 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Серафіма Цудоўная».
22.10 Серыял «Атлантыда».
23.05 Асяроддзе пражывання.
0.05 Серыял «Крэм».
0.55 Начныя навіны.

ЛАД

7.00 ЛАДная раніца.
8.00, 21.15 Тэлебарометр.
8.05, 17.55 Серыял «Ты маё жыццё».
9.00, 23.05 Серыял «Універ».
10.05 Альбарутэнія.
10.35 Жансавет.
11.05 Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
12.05 Маст. фільм «Бронзавая птушка».
13.25 «Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
14.05 Дак. фільм «Імя Багдановіча».
15.00 Гадзіна суда.
16.05 Урачэбныя тайны.
16.40 Урачэбныя тайны +.
16.55, 0.05 Бітва экстрасэнсаў.
19.00 «Партызаны». «Спецпадрыхтоўка», «Пракляты 41-ы».
20.00 Беларуская часінка.
21.00 Калыханка.
21.20 «Спортлато 5 з 36».
21.25 КЕНО.
21.30 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/4 фіналу.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.45, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Аўтапанарама».
8.50 «Далёкія сваякі».
9.00 Маст. фільм «Шчыт Айчыны».
10.40 Серыял «Нашы суседзі».
11.40, 17.30 «Званая вячэра».
12.35, 18.10 Серыял «Агонь кахання».
13.50 Серыял «Фірменная гісторыя».
14.40, 23.25 Серыял «Забойная сіла 2».
15.40 Серыял «Next 3».
16.50 «Новыя падарожжы дылетанта».
19.00 Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: «БАТЭ» (Барысаў) — «Шахцёр» (Салігорск).
20.50 Маст. фільм «Спакуса».
23.00 «Скардзіцца дазволена».
0.20 Серыял «Меч».

МІР

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
5.05, 9.35 «Кыргызстан у асобах».
5.20, 15.25 «Пра вайну як пра вайну».
6.05 «Цік-так».
6.20 «У гасцях у Вітамінкі».
7.05, 8.05 Маст. фільм «Старая крэпасць».
8.30 «Асцярожна, дзеці!».
9.05, 18.40, 2.00 «Сардэчна запрашаем».
10.05 Серыял «Анёл з Орлі».
11.05, 12.05, 23.05, 0.05 Маст. фільм «Начны матацыкліст».
13.05 М/с «Прыгоды ў краіне эльфаў».
13.30 Серыял «Старшакласнікі».
14.05, 4.00 Серыял «Дружная сямейка».
16.05, 17.05 Серыял «Агонь кахання».
18.25 «Акцэнты».
19.10, 2.30 Серыял «Прызванне».
20.00, 1.05 Ток-шоу «Слова за слова».
21.20, 3.30 «Сакрэтныя матэрыялы».
22.05 Дак. фільм «Жывая гісторыя».

8 КАНАЛ

7.00, 12.15, 14.10, 18.55, 21.00, 23.50 «Надвор'е».
7.05 Маст. фільм «Вастраў Нім».
8.40, 13.50, 15.40 «Кінаблакнот».
9.00 Серыял «Закаханы агент».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30, 18.45 Серыял «Дольмен».
12.20 Камедыя «Нас двое».
14.15 Серыял «Чорная лагуна».
16.00 Мультпарад.
16.40 «К-відэа для ўсёй сям'і».
16.45 «К-відэа» для дзяцей.
17.25 Дак. серыял «Атланты трымаюць неба».
18.00 Серыял «Менталіст».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Меладрама «Крамер супраць Крамера».
23.05 Серыял «Святы дазор».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00, 18.00, 23.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 20.00 Серыял «Варонiны».
10.00, 21.00 Серыял «Кадэцтва».
11.00, 22.00 Серыял «Каханне не тое, што здаецца».
12.00, 17.00 «Хачу верыць».
13.00 Серыял «Новая сямейка Адамс».
14.00 Серыял «Цуды. com».
15.00 Серыял «Ранеткі».
16.00, 0.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
19.00, 23.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
9.15 «Прамы эфір».
10.10 Дак. фільм «Сусветны патоп як прадчуванне».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 16.20 «Кулагін і партнёры».
12.00, 20.30 Серыял «Смерць Вазір-Мухтара».
13.50, 16.50, 19.50, 23.10 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае».
15.25 «З новым домам!».
17.45 Серыял «Пяць хвілін да метро».
22.15 Серыял «Выкраданне багіні».
23.20 «Вестки.ru».
23.40 Дак. фільм «Маланка-забойца. Пагоня за шаравой».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.05 «НТБ раніцай».
8.35 «Дачны адказ».
9.35, 15.40, 18.35 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.10 Сёння.
10.20 «Справа цёмная».
11.10 «Да суда».
12.00 «Суд прысяжных».
13.25 «Пракурорская праверка».
14.25 «Давайце мірыцца!».
15.15 «Справа густу».
16.25 Серыял «Вяртанне Мухтара».
18.10 «Чыстасардэчнае прызнанне».
19.35 Серыял «Ліцейны».
21.20 Серыял «Гадзіна Волкава».
23.35 «Вочная стаўка».
0.25 «Увага: вышук!».

ТНТ

5.00 «Невытлумачальна, але факт».
6.00, 11.30 «Нікеладэон на ТНТ».
7.30 М/с «Тасманскі д'ябал».
7.55 М/с «Бітлджус».
8.25 «Універ». Сітком.
9.30, 13.00, 18.00 Серыял «Шчаслівыя разам».
10.40 М/с «Губка Боб Квадратныя штаны».
13.30, 22.00, 3.55 «Дом-2».
15.00 «Бунтарка». Камедыя.
17.00, 19.00 «Інтэрны». Сітком.
17.30, 19.30 «Зайцаў + 1». Сітком.
20.00 Камедыя «Замерзлая з Маямі».
23.30 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
0.00 «Камедзі Клаб».
0.55 «Міленіум». Дак. серыял.
1.55 «Ратуючы Эмілі». Трылер.

ІНТЭР+

6.30, 7.10, 8.10 З новай раніцай.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00 Навіны.
9.15 Феерыя падарожжаў.
9.40, 14.10, 23.10 «Сталічныя тайны. Першая «Брыгада».
10.10, 1.55 Маст. фільм «У пошуках капітана Гранта». 1-я серыя.
11.15, 20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.15 Знак якасці.
12.45, 0.45 Школа доктара Камароўскага.
13.10, 23.45 Серыял «Абібокі».
13.55, 0.30 Купаж.
14.35, 1.10 Сямейны суд.
15.20 Канцэрт Міхаіла Паплаўскага «Я — украінец».
17.25 Маст. фільм «Дыпламаты паняволі».
18.30, 3.30 Серыял «Агонь кахання».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
21.15, 5.00 Маст. фільм «Гамбрынус».
22.40 Праўда жыцця.

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 14.50, 18.30, 22.30 Навіны культуры.
9.15, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
9.25 «Адміністрацыйная ўлада». Маст. фільм.
11.15 «Лясны дух». Дак. фільм.
11.25, 1.20 Вялікія раманы XX стагоддзя.
11.55, 22.00 «І іншыя...».
12.25 «Унутры планеты Зямля». Дак. фільм.
13.15 «Барыс Гадуноў». Тэлеспектакль.
15.00 «Прыгоды Нязнайкі і яго сяброў». М/с.
15.20 «Сто першы». Маст. фільм. 1-я серыя.
16.30, 0.55 «Вастраў арангутанаў». Дак. серыял.
16.50 Тыдзень народнага мастацтва.
17.40 «XIV Міжнародны конкурс імя П.І. Чайкоўскага».
18.00 «Тайны рускай зброі».
18.45 Галоўная роля.
19.00 «У свеце вобразаў».
19.45 «Тайны Сусвету — проста пра складанае». Дак. фільм.
20.35 «Марк Аўрэлій. Афінская школа».
21.05 «Вяртанне ў Крэнфард». Маст. фільм.
22.50 «Водпуск у верасні». Маст. фільм.
0.00 «З'явы і легенды культуры Амерыкі».
0.30 Іграе Англійскі камерны аркестр.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «...Да 16 і старэйшым». 1988 год.
5.55 «Перакрыжаванне». Дак. фільм. 1989 год.
6.25, 12.30 «Праз трыццаць гадоў». 1986 год.
7.25 «І ўсё-такі мора!..». Фільм-канцэрт. 1974 год.
8.00, 14.00, 20.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 21.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР».
10.05, 16.05 «Ала Пугачова сустракае сяброў». 1994 год.
11.00 «Яловая субмарына».
11.45 «Разрадка — сябры і ворагі». Дак. фільм. 1976 год.
13.35 «Усім пакаленням спяваць». 1983 год.
17.00 «У вячэрні час». Канцэрт.1977 год.
17.20 «Згубны курс маяістаў». Дак. фільм. 1969 год.
18.35 «Цімур і яго каманда». Маст. фільм. 1-я серыя.
22.00 Тэлемост «Масква — Капенгаген». 1989 год.
23.00 «Акулы пяра».
1.10 «КВЗ 87-88».
2.00 «Быў час».
3.00 «Тэатральныя сустрэчы». 1985 год.
4.10 «Гаспадары СССР або Малпіна рыла». Фільм-канцэрт.1994 год.

MTV

5.00, 2.00 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
8.10 Руская дзясятка.
9.00, 12.20 News блок Weekly.
9.30, 15.30, 17.00 Свабодны.
10.00, 13.00 Алена з поліпрапілену.
10.30, 19.10 Дрэнныя дзяўчынкі.
11.30, 21.00 «Пякельныя коткі». Серыял.
12.30 Хто круцейшы.
13.30 Бобыск і спатканне.
14.00, 0.00 Наступны.
14.20 Шалёныя продкі.
14.40 Спатканне з мамуляй.
16.00 Каханне з першага погляду.
17.30 Цяжкасці кахання.
18.20 Rehab: Тэрыторыя вечарынак.
20.10 «Сэкс» з Тэкілай.
21.50 «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.
22.40 News блок.
22.50 «Сябры». Серыял.
23.40 «Клініка». Серыял.
0.30 American Idol.
1.30 Ікона відэагульняў.

20.00 ФІЛЬМ ДНЯ

«ЗАМЕРЗЛАЯ З МАЯМІ»

(КАНАДА—ЗША, 2008 г.)

Сцярвозная і амбіцыйная Люсі адпраўляецца ў камандзіроўку з сонечнага Маямі ў маленькі і золкі Новы Ульм, каб мадэрнізаваць завод. Праўда, жыхарам гарадка гэта не вельмі падабаецца. І, да таго ж, у гэтым самым Ульме вельмі холадна.



Рэжысёр — Ёнас Элмер. **У ролях:** Рэне Зелвегер, Гары Конік-мал., Шаван Фэлон, Дж.К. Сіманс.

НАША КІНО

6.30, 12.30 Маст. фільм «Памылка рэзідэнта».
8.50, 14.50 Меладрама «З каханымі не расставайцеся».
10.30, 16.30 Меладрама «Вікторыя».
18.30, 0.30 Маст. фільм «Лёс рэзідэнта».
21.05, 3.05 Меладрама «Мама выйшла замуж».
22.30, 4.30 Маст. фільм «Злачынства і пакаранне».

ДОМ КІНО

3.00, 11.00, 19.00 Серыял «Самара-гарадок».
3.45 Камедыя «О, шчасліўчык!».
5.20 Меладрама «Ранішнія цягнікі».
6.45 Камедыя «Трыццаць тры».
8.00 Меладрама «Збег абставінаў».
9.30 Прыгодніцкі фільм «Балада пра доблеснага рыцара Айвенга».
11.45 Драма «Лялечка».
13.55 Музычная камедыя «Кароткія гісторыі».
16.00 Меладрама «Школьны вальс».
17.35 Меладрама «Прагулка па Парыжы».
19.45 Новы хіт. Меладрама «Зімовы раман».
21.10 Баявік «Зладзеі ў законе».
22.40 Камедыя «Мядовы месяц».
0.10 Псіхалагічная драма «Асабістая справа суддзі Івановай».
1.35 Камедыя «Маякоўскі смяецца».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Маст. фільм «Тайна жалезных дзвярэй».
6.10, 10.10, 14.10 М/с «Маўглі». Зборнік м/ф: «Выкрадзены месяц», «Зямля мая».
7.00, 11.00 М/ф «Гладыятары», «Тайна запечнага цвыркуна», «Проста так», «Хатні цырк».
8.00, 12.00 «Сусветная карцінная галерэя з цётачкай Савой». М/ф: «Леў і бык», «Вось дык тыгр!».
15.00 Фільм-казка «Казкі старога чараўніка». 1-я серыя.
16.10 М/с «Маўглі». М/ф «Першая скрыпка».
17.00 М/ф «Гладыятары», «Ваня Дацкі», «Пачатковец».
18.00 «Сусветная карцінная галерэя з цётачкай Савой». М/ф «Сумленнае кракадзілава».

ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Крот».
20.00, 2.00 Серыял «Павуцінне».
21.00, 3.00 Серыял «Тузін правасуддзя».
22.00 Серыял «Пяшчота да звера, які раве».

ТБ3

5.00 М/ф.
5.30 «Трэцяя планета ад сонца». Серыял.
6.00, 15.00 Як гэта зроблена.
6.30 Дак. фільм «Другое нараджэнне».
7.00, 14.00 «Згублены свет». Серыял.
8.00, 16.00 Дак. фільм «Эфект Настрадамуса».
9.00 Маст. фільм «Чалавек-матылёк».
11.00 «Косткі». Серыял.
12.00, 18.00 «Мужчына ўва мне». Серыял.
13.00 Дак. фільм «Асабліва небяспечна».
15.30 Дак. фільм «Прарочыя сны».
17.00 «Быць Эрыкай». Серыял.
19.00 Дак. фільм «Апакаліпсіс».
20.00, 3.45 «Мяжа». Серыял.
21.00 Маст. фільм «Аперацыя «Мёртвы снег».
22.45, 2.45 «Застацца ў жывых». Серыял.
23.45 «Андрамеда». Серыял.
1.45 Дак. фільм «Забытыя палонныя Кабула».
4.45 М/ф.

ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Серыял «Спецыяльнае падраздзяленне».
9.55, 17.55, 1.55 Драма «Аляксандр. Неўская бітва».
11.55, 19.55, 3.55 Баявік «Насірыя». 1-я серыя.
13.40, 21.40, 5.40 Камедыя «Шпіёнскія страсці».
15.20, 23.20, 7.20 Трылер «Траўма».

ТБ1000

3.00, 21.20 Драма «Сэкс, наркотыкі і рок-н-рол».
5.00 Трылер «Кампенсацыя ўрону».
7.00 Драма «Стары, які чытаў любоўныя раманы».
9.10 Камедыя «Без аглядкі».

EUROSPORT

9.30, 13.15, 21.15, 1.45 Футбол. Кубак свету. Жанчыны.
11.15 Футбол. Кубак свету. (U-17).
21.10, 1.10 Навіны.
21.30, 1.00 Выбранае па серадах.
21.35 Конны спорт. FEI Classics Series.
22.35 Навіны коннага спорту.
22.40 Гольф. Тур PGA.
23.40 Гольф. Еўратур.
0.20 Гольф клуб.
0.25 Парусны спорт. Extreme Sailing.
0.55 Яхт-клуб.
1.15 «Еўраспорт» за чыстую планету».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 17.00 Расследаванні авіякатастроф.
6.00 Акула па мянушцы Ніколь.
7.00, 12.00 Самы цяжкі ў свеце рамонт.
8.00, 13.00 Мегазаводы.
9.00 Шляхі акулы-молата.
10.00, 16.00 Ліхтугі за мяжой.
11.00, 19.00, 4.00 Секунды да катастрофы.
11.30, 19.30, 4.30 Зона будаўніцтва.
14.00 «Па слядах жывёл, якія знікаюць».
18.00 Супердзбудаванні.
20.00, 23.00, 2.00 Загадкі гісторыі.
21.00, 0.00, 3.00 Тайны вакол нас.

ЗДАРОЎЕ

5.00, 20.00 Сакрэты здароўя.
5.25, 20.25 Энцыклапедыя памылак.
5.50, 20.50 Я расту.
6.30, 18.50, 21.30 Шлях да здароўя.
6.55, 21.55 Памылкі здароўя.
7.35, 22.35 Дзіцячая медыцына.
8.00, 23.00 Генезіс здароўя.
8.50, 23.50 Пачуцці чалавека.
9.30, 0.30 Колькі вам гадоў?
10.10, 1.10 Дыялогі пра харчаванне.
11.00, 2.00 Практыка здароўя.
7.30, 16.00 Галівуд і вінаград.
8.00 Планета ежы.
9.00, 18.00, 23.00 Індыйскі час.
11.00, 15.00, 16.30 Пра галоўнае.
11.30 Рудзі Макса падарожнічае па свеце.
12.00 Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
13.00 Зямля качэўнікаў.
20.00, 1.00 Адысея Джуліяна і Камілы.
22.00, 3.00 Запіскі падарожніка.
0.00 Падарожжа ў «Трабанце».
0.30 Едзем на Кубу.

ANIMAL PLANET

7.00 Маёнтак сурыкатаў.
7.25 «Заатур Мікаэлы».
8.15 «Самае дзікае шоу».
8.40 Джэф Корвін на волі.
9.10 Паляўнічы на кракадзілаў.
10.05 Сабакі, коткі і іншыя ўлюбёнцы.
11.00, 20.10, 0.45 Уводзіны ў сабаказнаўства.
12.50 «Котак не любіць нельга».
13.45 Коткі-прызёры.
14.40 Незвычайныя жывёлы Ніка Бэйкера.
21.05, 2.35 Паветраныя сківіцы.
22.55, 4.25 «Я жывы».
23.50 «Сапраўдны згублены свет».
1.40 Дзікія і небяспечныя.
5.20 «Аддзел абароны жывёл — Паўднёвая Афрыка».
6.10 Каранаваныя гадаванцы.

ЗДАРОЎЕ

5.00, 20.00 Практыка здароўя.
5.40, 20.40 Гэта карысна ведаць!
6.50, 21.50 Не выходзячы з дома.
7.30, 22.30 Панацэя.
8.00, 23.00 Жаночы часопіс.
8.30, 23.30 Вялікая прабежка.
9.00, 0.00 Кабінет прыгажосці.
9.40, 0.40 Элемент здароўя.
10.10, 1.10 Цяга да жыцця.
11.00, 2.00 Дзіцячы ўрач.
11.40, 2.40 Будзем здаровыя.
12.20, 3.20 Увага, ежа!
12.45, 3.45 Азбука здароўя.
12.50, 3.50 Найноўшыя дасягненні.
13.30, 4.30 Нетрадыцыйная медыцына.
14.00 Гісторыя хвароб.
14.40 Курс лячэння.
15.20 Выкрыццё прадуктаў.
15.50 Школа розуму.
16.30 Пра дыеты і не толькі.
17.00 Генезіс здароўя.
17.50 Цела чалавека.
18.30 Колькі вам гадоў?
19.10 Дыялогі пра харчаванне.

ТДК

6.00, 7.50, 13.00, 16.55, 17.50, 18.50 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 15.00, 22.20 Усё лепшае для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00, 17.00, 23.45 Красуня.
11.00, 16.00, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
13.30, 2.00 Нашы дзеці.
14.30, 1.00 Твой дом.
19.00, 22.30, 4.00 Люстэрка жыцця.
21.00, 0.05 Сэксуальная рэвалюцыя.
3.00 Гісторыя поспеху.

НЯДЗЕЛЯ, 3 ЛІПЕНЯ

ПЕРШЫ

6.50, 23.50 «Беларусь адкрытая свету». Канцэрт.
8.40 Дак. фільм «Прарыў».
9.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.40 Маст. фільм «Дзяўчынка шукае бацьку».
11.25 «Зямля беларуская». «Адвечная песня».
11.55 Ваенны парад і спартыўна-моладзевае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі) з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі.
14.00 «Партызаны супраць Вермахта».
15.25 «Ведай нашых: гандбаліст Сяргей Рутэнка».
15.40 Маст. фільм «У жніўні 44-га...».
18.10 Суперлато.
19.25 Камедыя «Пацалунак скрозь сцяну».
21.00 У цэнтры ўвагі.
21.55 Камедыя «Каханне і галубы».

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі), **18.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 Камедыя «Трэмбіта».
10.55 Песні Перамогі.
11.55 Ваенны парад і спартыўна-моладзевае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі) з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі.
14.00, 16.10 Маст. фільм «На безыменнай вышыні».
18.15 Маст. фільм «Час збіраць камяні».
20.00 Контуры.
21.05 Гала-канцэрт «Свет віншуе Беларусь».

ЛАД

7.40 Гаспадар.
8.10 Дак. фільм «Застылая музыка Лангбарда».
8.50 «Правы чалавека».
9.05 Мір вашаму дому.
9.15 Дак. фільм «Успамінаючы Чарняхоўскага».
9.35 Дак. фільм «Парад Перамогі».
9.55 Маст. фільм «Беларускі вакзал».
11.55 Ваенны парад і спартыўна-моладзевае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі) з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі.
13.35 Канцэрт ансамбля «Песняры».
15.20 Дак. фільм «Формула пераможцы».
15.55 Маст. фільм «Пакуль мы жывыя...».
17.50 «Красуй, Беларусь!» Канцэрт.
18.50 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Матч за 3-е месца.
20.40 Дак. фільм «Парад Перамогі».
21.00 «Спортлато 5 з 36».
21.05 КЕНО.
21.20 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Фінал.
23.05 «Навіны надвор'я».
23.30 Камедыя «Кадрыля».
0.55 Культасвета.

СТБ

6.45 «Які паўстаў з попелу».
7.30, 10.30, 16.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.40 Маст. фільм «Вайна пад дахамі».
9.20 «Вайна. Вядомая і невядомая».
9.50 «Вялікае сняданне».
10.40 Маст. фільм «Прыдатны да нестраявой».
11.55 Ваенны парад і спартыўна-моладзевае шэсце, прысвечаныя Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі) з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі.
14.00 Маст. фільм «Гадзіннік спыніўся апоўначы».
15.40 Ток-шоу «Лёс».
16.50 Дак. фільм «Пяты фронт».
17.35 Маст. фільм «Чаклун і Румба».
19.00 «Аўтапанарама».
19.30 «Тыдзень».
20.55, 23.10 Эпапея «Дняпроўскі рубеж».
0.10 Маст. фільм «Сыны ідуць у бой».

МІР

5.00 Серыял «Камісар Мегрэ».
5.50 «Даведнік».
6.20, 23.30 Маст. фільм «Падкідыш».
7.30 М/с «Прыгоды Мумі Троля».
7.55 «Берыляка вучыцца чытаць».
8.20 «Давайце маляваць!».
8.40 «Спытай ва Усёведа».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «Ведаем рускую».
10.10 «Гісторыя з геаграфіяй».
10.40 Маст. фільм «Пасля кірмашу».
11.00 Трансляцыя.
14.00, 3.50 Дак. фільм «Белавежская пушча».
15.10 Дак. фільм «Соль маёй зямлі».
15.40 Маст. фільм «Зваротнай дарогі няма».
20.00 «Разам».
21.00 Канцэрт да Дня Незалежнасці Беларусі.
23.00 «Паўночнікі».
0.50 Серыял «Каханне і іншыя глупствы».

8 КАНАЛ

9.00, 13.55, 18.35, 21.00, 23.25 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
9.25 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
9.30 «Мой любімы гадаванец».
10.00, 12.40 «Кінаблакнот».
10.20 «Адшукваецца адпачынак».
11.00 Серыял «Дольмен».
13.00 Дак. серыял «Сакрэтны палігон».
14.00 Серыял «Каломба».
15.40 «К-відэа» для дзяцей.
16.00 Фільм для дзяцей.
17.15 «Бульбокс».
17.45 Серыял «Думаць як злачынец».
18.40 Драма «Тэкілавы світанак».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Трылер «Сетка».
23.20 «Інэт».

ВТБ

6.00, 0.30 «PLAY».
8.00 «Адны дома».
8.30 Серыял «Як сказаў Джым».
9.30 Тэлевіктарына «Гэта маё дзіця».
10.30 Шоу «Уральскія пельмені».
12.00, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
13.00 Серыял «Каханне не тое, што здаецца».
15.00, 23.00 «Гісторыя расійскага шоу-бізнэсу».
16.00 Шоу «Дзякуй Богу, ты прыйшоў!».
17.30 Серыял «Варонiны».
20.00 «Добрыя жарты».
22.00 Серыял «Галыгін. ru».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Уся Расія».
7.15 М/ф.
7.45 Маст. фільм «Дублёрка».
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 «З новым домам!».
12.35 Маст. фільм «Губернатаръ».
13.50, 16.50, 19.50, 22.00 Навіны Беларусь.
14.15 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
14.50 «Рамантыка рамансаў».
15.40 Дак. фільм «Вяртанне. Эдуард Хіль».
16.30 Маст. фільм «Ішоў чацвёрты год вайны...».
17.00 Маст. фільм «Ішоў чацвёрты год вайны...». Працяг.
18.15 «Смяяцца дазваляецца».
20.00 Весткі тыдня.
21.05 1/4 фіналу першай лігі «КВЗ».
23.00, 0.00 «Спецыяльны карэспандэнт».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.50 Маст. фільм «Іван».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Авіятары».
8.45 «Іх норавы».
9.25 «Асабліва небяспечны!».
10.20 «Жывуць жа людзі!».
10.55 «Баль на ўвесь свет».
11.55 «Дачны адказ».
13.20 «Справа цёмная».
14.15 Серыял «Знакі лёсу».
16.20 «Развод па-руску».
17.15 «І зноў прывітанне!».
18.15 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.00 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
20.30 «Цэнтральнае тэлебачанне».
21.40 Маст. фільм «Шхера 18».
23.20 «Гульня».
0.10 «Асабліва небяспечны!».

ТНТ

5.00 М/с «Мішн Хіл».
6.00 М/с «Гэй, Арнольд!».
7.25, 8.00 «Жаночая ліга».
7.55 «Лато Спорт Супер».
8.50 Латарэі: «Першая Нацыянальная» і «Фабрыка ўдачы».
9.00, 2.45 «Школа рамонту».
10.00 «СуперІнтуіцыя».
11.00 « У пагоні за славай». Дак. фільм.
12.00 «Універ». Сітком.
14.00 «Інтэрны». Сітком.
16.00 «Пароль «Рыбамеч». Баявік.
17.55, 21.00 «Камедзі Клаб».
18.30 Серыял «Шчаслівыя разам».
19.00 «Апошні бойскаўт». Баявік.
22.00, 1.45 «Дом-2».
23.30 «Каханне і іншыя катастрофы». Камедыя.
1.10 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
3.45 «Cosmopolitan». Відэаверсія».
4.45 «Камедыянты».

ІНТЭР+

6.30 Код доступу.
7.00 Маст. фільм «Кветкі для Вольгі».
8.25 Маст. фільм «Два дні цудаў».
9.30 Школа доктара Камароўскага.
10.00, 23.30 Жыць — гэта модна.
10.30 Купаж.
10.40 Маст. фільм «Хачу вашага мужа».
11.50 Маст. фільм «Жанчына для ўсіх».
13.10 Разбор палётаў.
14.00 Пазавочы. Канстанцін Меладзэ.
14.45 Творчы вечар Канстанціна Меладзэ.
17.15 Серыял «Юрыкі».
17.40 Вячэрні квартал. Спецвыпуск.
18.25, 1.25 Маст. фільм «Тарцюф».
20.00, 3.00 Падрабязнасці тыдня.
20.45, 5.20 Маст. фільм «Апошняя субота».
21.55, 3.45 Маст. фільм «Арланда».
0.00 Маст. фільм «Ксенія, каханая жонка Фёдара».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 0.50, 1.50 Праграма перадач.
9.10 «Звычайны канцэрт».
9.40 «У добры час». Маст. фільм.
11.15 «Легенды сусветнага кіно».
11.45 «Тайна трэцяй планеты», «Сцёпа-марак», «Крылаты, касматы ды маслены». М/ф.
13.05 «Прывід Еўропы». Дак. фільм.
13.35, 0.55 «Фарбы вады». Дак. серыял.
14.30 «Колер жыцця. Пачатак». Дак. фільм.
15.10 Опера «Вяселле Фігаро».
18.25 «Марлен Хуцыеў». Дак. фільм.
19.05 «Два Фёдары». Маст. фільм.
20.30 Вера Васільева. Творчы вечар у тэатры Сатыры.
22.00 «Нулявы кіламетр». Маст. фільм.
23.45 «Гарачы воск». Дак. фільм.
0.35 «Легенды перуанскіх індзейцаў». М/ф для дарослых.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Пад знакам задыяка. Рак». 1992 год.
6.30 «Следства вядуць знатакі». Тэлефільм. 1989 год.
7.15 «Родны голас». Фільм-канцэрт. 1972 год.
8.00, 14.00, 2.00 Мінулы час.
9.00 Канцэрт групы «Воскресенье».
10.35 Канцэрт Вялікага дзіцячага хору п/к В. Папова. 1986 год.
11.05 «Да і пасля...» Год 1957.
11.55 «Свята канікул». 1988 год.
13.30 «Аўтограф па суботах». 1992 год.
15.00 «Наша дача». Маст. фільм.
16.25 «Ранішняя пошта». 1985 год.
17.00 «Акулы пяра».
18.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
19.00 «КВЗ 87—88».
20.00 «Быў час».
21.00 «У крузе сяброў. Вас запрашае Эльдар Разанаў». 1986 год.
23.00 «Міжнародная панарама». 1978 год.
23.45 «Музыка і мода». Фільм-канцэрт. 1993 год.
0.35 «Цімур і яго каманда». Маст. фільм.
4.00 «Тэма». 1992 год.

MTV

5.00, 1.20 Music.
6.00 Стэрэа_раніца. The Best.
8.45 «Губка Боб». М/ф.
10.00 News блок Weekly.
10.30 Ікона відэагульняў.
11.00, 14.00, 15.30, 17.00, 19.00, 20.30 Зоркі на далоні.
11.30, 22.50 Трэндзі.
12.00 «13 кіналаж».
12.30, 15.00, 16.30, 18.30, 20.00, 21.30 Праверка чутак.
13.00 «Грыль чарт».
14.30, 16.00, 17.30, 19.30, 21.00 Хто круцейшы.
18.00 Гарачае кіно.
22.00 «20 самых гламурных парад».
23.20 Руская дзясятка.
0.20 World Stage.

КУПЛЮ МОТОБЛОК МТЗ. Т. 8 029 4000 852.

14.00 ФІЛЬМ ДНЯ

«НА БЕЗЫМЕННАЙ ВЫШЫНІ»

(РАСІЯ—БЕЛАРУСЬ, 2004 г.)

1944 год. Пераломны момант у вызваленні Савецкага Саюза ад фашыстаў. У полк прыбывае папаўненне: кадравы афіцэр і былы крымінальнік, чэмпіёнка па стральбе і ваенны перакладчык. Тут, у беларускіх лясах, адна пачне дуэль з нямецкім снайперам, другі павядзе на смерць роту разведчыкаў, але для многіх гэтыя горкія дні назаўжды застануцца самымі шчаслівымі ў жыцці.

Рэжысёр — Вячаслаў Нікіфараў. **У ролях:** Віктарыя Талстаганава, Аляксей Чадаў, Анатоль Кот, Аляксандр Пашуцін, Генадзь Гарбук.

У праграме магчымыя змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена!

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ 11

НАША КІНО

6.30, 12.30 Камедыя «Салдат Іван Броўкін».
8.30, 14.30 Мюзікл «Востраў загінулых караблёў».
10.45, 16.45 Меладрама «З тых часоў, як мы разам».
18.30, 0.30 Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».
20.30, 2.30 Трагікамедыя «Старэйшы сын».
22.45, 4.45 Меладрама «Даруй».

ДОМ КІНО

3.00 Камедыя «Жаніцьба».
4.35 Новы хіт. Драма «Айчым».
6.20 Прыгодніцкі фільм «Гардэмарыны, наперад!».
11.00 Экранізацыя школьнай праграмы. «Дваранскае гняздо».
12.45 Музычная камедыя «Светлая асоба».
14.05 Новы хіт. Меладрама «Гульня ў хованкі».
15.35 Фантастыка «Зорны інспектар».
16.55 Драма «Заўтра была вайна».
18.20 Новы хіт. Моладзевая камедыя «Гарачыня».
20.00 Новы хіт. Меладрама «Пазвані ў мае дзверы».
23.00 Камедыя «Бландзінка за вуглом».
0.25 Меладрама «Сярожа».
1.40 Дэтэктыў «Чалавек, які закрыў горад».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Камедыя «Вусаты нянь».
6.15, 10.15, 14.15 М/с «Брэменскія музыкі». М/ф «Мурзілка на спадарожніку».
7.00, 11.00 Фільм-казка «Варвара-краса, доўгая каса».
8.25, 12.25 Казкі рускіх пісьменнікаў. «Шэрая Шыйка». М/ф «Як ослік на сум захварэў».
15.00 Фільм-казка «Вучань лекара».
16.10 М/с «Па слядах брэменскіх музыкаў». Зборнік м/ф: «Чалавек будуе дом», «Кібітка на адным коле».
17.00 Казкі замежных пісьменнікаў. «Сіняя птушка».
17.50 Казкі рускіх пісьменнікаў. «Пунсовая кветка». М/ф «Пластылінавы вожык».

ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Крот-2».
20.00, 2.00 Серыял «Павуцінне».
21.00, 3.00 Серыял «Тузін правасуддзя».
22.00 Серыял «Народжаная рэвалюцыяй».

ТБ3

5.00 М/ф.
6.00 М/ф «Кураж».
6.30 М/ф «Ліга справядлівасці».
7.00 М/ф «Бакуган».
7.30 М/ф «Фостэр: дом для сяброў са свету фантазій».
8.00, 3.30 «Дзіўныя падарожжы Геракла». Серыял.
9.00 Маст. фільм «Пасажыр 57».
10.45 Здзіві мяне.
11.45 Дак. фільм «Архівы НЛА».
12.45 Маст. фільм «Працягласы пацалунак на ноч».
15.15 «Нікіта». Серыял.
17.00 Дак. фільм «Апакаліпсіс».
18.00 Маст. фільм «Дзень бацькі».
20.00 Маст. фільм «Прывіды Марса».
22.00 Дак. фільм «Жыццё пасля людзей».
23.00, 2.30 «Сапраўдная кроў». Серыял.
0.00 Маст. фільм «Не кажы ні слова».
4.30 М/ф.

ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Драма «Гоя» (6-я серыя).
10.05, 18.05, 2.05 Дэтэктыў «Забойства ў вышэйшым свеце» (4-я серыя).
11.40, 19.40, 3.40 Камедыя «Містэр Адзінота».
13.35, 21.35, 5.35 Драма «Жорсткасць».
15.15, 23.15, 7.15 Камедыя «Хлопец Ікс».

ТБ1000

3.00, 21.10 Трылер «Іспанскі вязень».
5.00 Меладрама «Блакітная хваля».
7.10 Драма «Спакойны бацька».
22.00, 1.00 З пункту гледжання навукі.

EUROSPORT

9.30, 11.00, 14.00, 18.30 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг».
10.00, 11.30, 19.30 Футбол. Кубак свету. Жанчыны.
12.45, 14.55 Веласпорт. «Le Tour de France».
22.30 Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно.
23.00 Футбол. Кубак свету.
1.00 Аўтаспорт. Міжнародны кубак Ле-Ман.
2.00 Мотаспартыўны часопіс.
2.15 Вось гэта дзіва!!!

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 12.00, 18.00, 4.00 Мегазаводы.
6.00 Галівудскі мядзведзь-забойца.
7.00 Паляванне на паляўнічага.
8.00 У пошуках акул.
9.00 На кручку.
10.00 Малпы ў горадзе!.
11.00 Самы цяжкі ў свеце рамонт.
13.00 Небяспечныя сустрэчы.
14.00 Вялікія міграцыі.
15.00 Адзін акіян.
20.00, 23.00, 2.00 Дзясятка лепшых фатаграфій Нэшнл Джыяграфік.
21.00, 0.00, 3.00 Самыя дзіўныя фатаграфіі «National Geographic».

ЗДАРОЎЕ

5.00, 20.00 Гісторыя хвароб.
5.40, 20.40 Курс лячэння.
6.20 Выкрыццё прадуктаў.
6.50, 21.50 Школа розуму.
7.30, 22.30 Пра дыеты і не толькі.
8.00, 23.00 Як не страціць здароўе.
8.40, 23.40 Клінічны гіпноз.
9.20, 18.50, 0.20 Найноўшыя дасягненні.
9.50, 12.30, 0.50, 3.30 Шлях да здароўя.
10.30, 1.30 Дзіця нарадзілася.
11.00, 2.00 Сакрэты здароўя.
11.25, 2.25 Энцыклапедыя памылак.
11.50, 2.50 Я расту.
12.55, 3.55 Памылкі здароўя.
13.35, 4.35 Дзіцячая медыцына.
14.00 Генезіс здароўя.
14.50 Пачуцці чалавека.
15.30 Колькі вам гадоў?
16.10 Дыялогі пра харчаванне.
17.00 Дзіцячы ўрач.
17.40 Будзем здаровыя.
18.20 Увага, ежа!
18.45 Азбука здароўя.
19.30 Нетрадыцыйная медыцына.
21.20 Зялёная аптэка.

DISCOVERY

7.00, 9.45, 4.45 Як гэта працуе?
7.25, 10.10 З чаго гэта зроблена?
7.55, 3.50 Вынайсці будучыню.
8.50, 13.25, 2.55 Разбуральнікі легенд.
10.40 Перш за ўсё — самалёты.
11.35 Палёты ўглыб Аляскі.
12.30 Выжыць любой цаной.
14.20, 22.00 Навуковая нефантастыка.
15.15, 2.00 Справа тэхнікі!
16.10 Атлас «Discovery».
18.00 «Top Gear».
21.00 Які будуецца па аўторках.
23.00 Горш быць не магло.
0.00 Выбрацца жывым.
1.00 Авіякатастрофы.
5.10 Гіганцкія караблі.
6.05 Грандыёзныя пераезды.

TRAVEL

5.00, 10.00, 14.00, 17.00, 21.00, 2.00, 4.00 Сусветны падарожнік.
6.00, 20.00, 1.00 Спорт на планеце.
7.00, 19.30, 22.30, 0.30, 3.30 Пакаранне для абжоры.
7.30, 22.00, 3.00 Раз'юшаная планета.
8.00 Зямля качэўнікаў.
9.00 Маляўнічыя чыгункі.
9.30, 11.00, 15.00 Пра галоўнае.
12.00 Індыйскі час.
13.00 Запіскі падарожніка.
15.30 Рудзі Макса падарожнічае па свеце.
16.00 Лепшыя ў свеце падарожжы на матацыкле.
18.00, 23.00 Планета ежы.
19.00, 0.00 Далёкія берагі.

ANIMAL PLANET

7.00 Маёнтак сурыкатаў.
7.25 «Заатур Мікаэлы».
8.15 «Самае дзікае шоу».
8.40 Джэф Корвін на волі.
9.10 Котак не любіць нельга.
10.05 Незвычайныя сабакі.
10.30 Праект «Шчанюкі».
11.00, 15.35, 20.10, 0.45 Уводзіны ў сабаказнаўства.
11.55 Сабакі, коткі і іншыя ўлюбёнцы.
12.50, 19.15 Якія ваююць са шкоднікамі.
14.40 Коткі-прызёры.
16.30 Заасад Крыса Хамфры.
17.25 Рай для шымпанзэ.
18.20 «Напад тыграў».
21.05, 2.35 Жыццё ў зграі.
22.55, 4.25 «Мяне ўкусілі».
23.50 Сапраўдныя згублены свет.
1.40 Дзікія і небяспечныя.
5.20 «Аддзел абароны жывёл — Паўднёвая Афрыка».
6.10 «Пякельная котка».

РАМАНТЫКА

7.00, 18.40, 21.30, 0.55 «Прапаўшыя без вестак».
7.55 «Тайна Лауры».
12.20, 17.50 «Смачнае захапленне+».
13.20 «Стол на траіх».
19.35, 1.50 «Спакуснік».
22.25 «Каханы па найме».
0.00 «Прысутнасць Аніты».
2.40 «Дваяжэнец».

AXN-SciFi

0.20, 5.00, 11.00, 23.40 Зоркі крэйсер Галактыка.
1.45, 16.50, 22.00 Фактар страху.
2.30, 7.10, 17.40 Чорная лагуна.
4.05, 8.40, 13.15 Паляўнічыя на прывідаў.
9.30, 15.15, 20.30 Кайл XY.
14.00 Страшна Цікава.
14.30, 19.00, 22.55 Жнец.
19.45 Стаўпы Зямлі.

ТДК

6.00, 7.50, 13.00, 16.55, 17.50, 18.50 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 14.30, 22.20 Усё лепшае для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 23.45, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00, 17.00 Красуня.
11.00, 16.00, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
13.30, 2.00 Нашы дзеці.
15.30 Латарэя «Бінга».
19.00, 22.30, 4.00 Люстэрка жыцця.
21.00, 0.05 Сэксуальная рэвалюцыя.
1.00 Твой дом.
3.00 Маст. фільм.

ПАДНАЧАЛЕНЫ ЗАБІЎ — НАЧАЛЬНІКА МОГУЦЬ І ЗВОЛЬНІЦЬ!

Або «двайны ўдар» пракуратуры

«Калі на нейкім прадпрыемстве працаваў чалавек, які ўчыніў забойства, можна ставіць пытанне нават пра звальненне кіраўніка, калі ідзе гаворка пра адсутнасць выхаваўчай работы. У абавязкі кіраўніка ўваходзяць і функцыі па арганізацыі выхаваўчай работы», — канстатаваў пракурор Віцебскай вобласці Генадзь Дыско, які расказаў пра «ноу-хау» пры расследаванні забойстваў.

У Прыдзвінскім краі назіраецца зніжэнне колькасці забойстваў. Калі летась за аналагічны перыяд на Віцебшчыне забілі 27 чалавек, то сёлета 19. У параўнанні з першымі пяццю месяцамі мінулага года колькасць забойстваў паменшылася на 22 працэнты.

На «пракурорскай мове» новы метад работы мае назву — прафілактыка цяжкіх злачынстваў супраць асобы. Як паведаміў «Звяздзе» пракурор Віцебскай вобласці Генадзь Дыско, упершыню ў рэспубліцы вядзецца не толькі карпатлівае расследаванне забойстваў, але і не менш глыбокае вывучэнне іх прычын і ўмоў. Бадай, упершыню пільна вывучаюць і асобу загінулага.

«Што ўяўляў сабой загінулы, як сябе паводзіў — і гэта ўсё вывучаецца. Як і тое, што ўяўляе з сябе падазроны ў забойстве», — расказвае пракурор вобласці. — Як правіла, класічны варыянт забойства: выпіваюць разам, адзін другога забівае. Але ж бывае рознае. Па майму загаду створаны дзве спецыяльныя групы. Абедзве ўзначальвае намеснік пракурора вобласці. Яны выязджаюць і пачынаюць разбірацца на месцы. Працуюць на працягу сутак. У сельскім Савеце працуюць тут жа з запрашэннем кіраўнікоў мясцовых органаў улады. Калі ў гарадах адбываюцца забойствы, даюць адпаведныя тлумачэнні старшыні, намеснікам выканаўчай улады. Разбіраюцца — ці ўсё зрабілі і ў пунктах грамадскага парадку, кіраўнікі прадпрыемстваў».

Як падкрэсліў пракурор, «ноу-хау» ніяк не ўплывае на тэрміны расследавання цяжкіх злачынстваў. У ліку іншага вывучаецца, як рэагавалі на «сігналы» аб праблемных паводзінах будучага забойцы і часта — ахвяры пракуроры ў раёнах. Ці валодалі сітуацыяй? Наколькі пастаўлена прафілактычная работа?

Аналагічныя «разборы» праводзяцца і па фактах цяжкіх цялесных пашкоджанняў, у выніку якіх наступіла смерць. Дарэчы, калі пяць гадоў таму на Віцебшчыне было зарэгістравана 186 забойстваў, то летась — 79.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

ООО «СИ-трейдинг» на строительство жилого дома № 6 (типовых потребительских качеств) по г/п в микрорайоне № 1 жилого района «Копище» в Минском районе

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг». Зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: 223053 Республика Беларусь, Минский район, район деревни Боровая 1, Главный корпус, каб. 439, телефон/факс 237 94 03.

Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 18.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00-14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Сведения о проектах строительства:

В течение предыдущих трех лет ООО «СИ-трейдинг» реализованы следующие проекты:

• 167-квартирный 23-этажный жилой дом по ул. Лопатина, 5 в д. Копище Минского района Минской области.

Информация о проекте строительства:

Цель строительства – исполнение инвестиционного проекта по договору о привлечении средств для финансирования жилищного строительства в границах: ул. Гинтовта г. Минска – восточная граница лесного массива, прилегающего к Минской кольцевой автомобильной дороге и автодороге «Минск-Витебск» – автодорога «Колодищи – Заславль» – западная граница лесного массива, прилегающего к автодороге «Колодищи – Заславль».

Реализация проекта осуществляется в соответствии с решением Минского районного исполнительного комитета от 21.01.2010 г. № 90 «О разрешении строительства ООО «СИ-трейдинг» объекта: «Жилые дома (типовых потребительских качеств) №№ 5, 6, 7 на территории микрорайона № 1 жилого района Копище с выделением пусковых комплексов № 1, № 2 и № 3. Жилой дом № 6. Пусковой комплекс № 2».

Начало строительства – 1 квартал 2011 года.

Проектная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу на основании полученных заключений в РУП «Госстройэкспертиза по Минской области» от 30.01.2009 г. № 3743-9/08, Минском областном комитете природных ресурсов и охраны окружающей среды от 30.09.2008 г. № 435.

Строящийся жилой дом расположен на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» Минского района, рядом с освоенными городскими территориями – районом многоквартирной жилой застройки «Уручье» с развитой городской инфраструктурой – с юга граница города Минска – ул. Гинтовта, с запада и севера – территория деревни Копище, с востока – лесной массив УП «Минское лесопарковое хозяйство».

Объект долевого строительства – многоквартирный 23-этажный, 160-квартирный жилой дом № 6 по генплану (типовых потребительских качеств), с подвалом, техподпольями и теплым чердаком, высота жилых этажей – 3,0 метра, потолка 2,78 м. Фундамент выполнен в виде монолитного каркаса с буронабивными сваями. Жилой дом оборудован лифтами с лифтовым мусоропроводом.

Наружная отделка – фасад оштукатуривается и окрашивается белым, серым и золотисто-охристым цветом. Все квартиры имеют летние помещения (лоджии).

Жилая часть общей площадью квартир 10681,27 м², всего квартир 160.

Согласно Указа Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 г. № 396 «О долевом строительстве многоквартирных жилых домов» для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагаются:

встроенные помещения административного и общественного назначения на первом этаже жилого дома общей площадью по проекту 36,16 м² – 42,14 м² стоимостью 9 000 000 (девять миллионов) белорусских рублей за 1 кв.м – 2 (два) нежилых помещений;

встроенные помещения административного и общественного назначения в подвальной части и на первом этаже жилого дома общей площадью по проекту 107,92 м² – 150,62 м² стоимостью 7 000 000 (семь миллионов) белорусских рублей за 1 кв.м – 5 (пять) нежилых помещений.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов проводилось всеми дольщиками.

Благоустройство включает озеленение территории, предусмотрено устройство тротуаров, дорожек, детской и хозяйственной площадок, автостоянки для временного хранения автомобилей.

Застройщиком получены:

- разрешение на строительство Минского районного исполнительного комитета от 21.01.2010 г. № 90;

- свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права постоянного пользования на него от 08.10.2009 г. № 600/192-6689;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «Госстройэкспертиза по Минской области» от 30.01.2009 г. № 3743-9/08;

- заключение государственной экологической экспертизы Минского областного комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды от 30.09.2008 г. № 435;

- договор строительного подряда с ОАО «Строительный трест № 4» № 55/26-2010 от 19.07.2010 г.;

- выданное Инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по Минской области разрешение на производство строительно-монтажных работ от 15.03.2011 г. № 1-111Ж-140/11.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию жилого дома – 3 квартал 2012 года.

С планировкой квартир можно ознакомиться по адресу: Минский район, р-н д. Боровая 1, Главный корпус, каб. 439 (Бизнес центр «Аквабел». Дополнительную информацию можно получить по телефонам: 237 94 03, 8(029) 606 29 96.

УНП 690237128.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, И НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Аукцион состоится 28 июля 2011 г. в 11.10 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222)229022, 311185, 223375.

Продавец недвижимого имущества: по лоту № 1 – Министерство промышленности Республики Беларусь, тел. 8(0225)474708.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 в фонде «Могилевоблимущество» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **26 июля 2011 г.** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00. Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **28 июля 2011 г. с 10.00 до 10.50.**

№ лота	Сведения о предметах аукциона							Сумма задатка, тыс. руб.
	Информация о недвижимом имуществе			Информация о земельных участках			Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб.	
	Наименование и краткая характеристика	Место нахождения	Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб.	Площадь, га	Срок аренды, лет	Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб.		
1	Находящиеся по договору безвозмездного пользования у ОАО «Бобруйский машиностроительный завод» здание бывшего детского сада/яслей № 35 одноэтажное, кирпичное, 357,0 кв.м с дорожками и ограждениями, канализационная и водопроводная сети	Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Карла Маркса, д. 234б	78 376,761	0,1930	15	53 053,380	131 430,141	13 000,0

Начальная цена недвижимого имущества, входящего в состав лота № 1, понижена на 20 процентов.

Победителю аукциона в отношении земельного участка, право заключения договора аренды которого входит в состав лота № 1, предоставляется возможность рассрочки платежа по внесению платы за право заключения договора аренды земельного участка на срок, не превышающий 2 лет со дня принятия Бобруйским горисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

Условие для победителя аукциона (в случае изменения целевого назначения недвижимого имущества) в отношении земельного участка, право заключения договора аренды которого входит в состав лота № 1, – получить в установленном порядке разрешение Бобруйского горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий два года.

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, и копии учредительных документов юридического лица без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Допускается участие в аукционе на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более субъектов малого предпринимательства – индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций (далее – консолидированные участники).

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе;

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов от консолидированных участников уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат.

Оплата за недвижимое имущество осуществляется денежными средствами в белорусских рублях по безналичному расчету без предоставления рассрочки. Оплата за объекты недвижимости производится в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

Нядзеля, 26 чэрвеня

Дзень спрыяльны для падвядзення вынікаў і завяршэння старых спраў, пераасэнсавання мінулага вопыту, навядзення парадку ў старых справах, вяртання да іх.

Панядзелак, 27 чэрвеня

Для якіх-небудзь важных асабістых і камерцыйных дзеянняў дзень неспрыяльны. Не рэкамендуецца таксама заводзіць новыя знаёмствы, пачынаць важныя справы.

Аўторак, 28 чэрвеня

Сёння добра ачышчацца, пазбаўляцца ад усяго непатрэбнага, таго, што аджыло, лішняга, шкоднага, што цягне назад. Дзень падыходзіць для пераходу на дыету. У адносінах — для завяршэння старых сувязяў, якія ўжо ў мінулым і гнятуць, пазбаўлення ад цяжару крыўдаў.

Серада, 29 чэрвеня

Гэта дзень, калі дасягае піка ваша фізічная энергія. У такі дзень добра займацца справамі, якія патрабуюць канцэнтрацыі і намаганняў.

Чацвер, 30 чэрвеня

Дзень спрыяльны для пачатку новай справы, працягу бізнэсу пасля доўгага перапынку, падпісання дамоў, уступлення ў новую пасаду, для творчасці, пачатку навучання.

Пятніца, 1 ліпеня

Спрыяльны для зараджэння кахання, аднаўлення адносін, прымірэння, для шлюбу, прыёму гасцей, уваходзін, святаў і забаў.

Субота, 2 ліпеня

Неспрыяльны для закладкі падмурка, будаўніцтва. Спрыяльны для прыборкі і дзейнасці, звязанай з фэн-шуй.

Міхаіл ДЗЯЛЯГІН:

«ДА НОВАГА ГОДА ЎСЁ СТАБІЛІЗУЕЦЦА КАНЧАТКОВА»

СВАІМ бачаннем прычын эканамічнага крызісу, а таксама магчымымі шляхамі выхаду з яго падчас прэс-лекцыі ў рамках Летняй школы журналістыкі на VI Беларускім медыяфоруме падзяліўся расійскі эксперт, доктар эканамічных навук, дырэктар Інстытута праблем глабалізацыі Міхаіл ДЗЯЛЯГІН:

— Праблема вашай дзяржавы ў залішняй сацыяльнай добрасумленнасці. У 2008 годзе скалыхнула ўвесь свет: у Казахстане, Расіі, нават Нарвегіі (я ўжо не кажу пра Польшчу) — дэвальвацыя. Проста для таго, каб падагнаць эканоміку. У зоне еўра, паколькі дэвальвацыю зрабіць нельга, усе ляглі і пачалі здыхаць. І калі краіны, якія экспартуюць сыравіну (і за кошт гэтага хутка аднавіліся), зрабілі дэвальвацыю, каб падагнаць эканоміку, то Беларусь, якая сыравіну спажывае, якая не мае донара ў выглядзе Еўрасаюза, якая займаецца машынабудаваннем і хіміяй (па якіх крызіс ударыў даволі добра), натуральна, таксама была асуджана на дэвальвацыю. Але паколькі ёсць сацыяльныя гарантыі, якія дзяржава крануць баіцца, гэта было дацягнута да апошняй хвіліны, калі рэальна скончыліся грошы. Гэта было, па-першае, ад залішняй добрасумленнасці, а па-другое, ад таго, што сістэма кіравання вельмі моцна змянілася з 1994 года. Тады краіну выцягвалі з ліберальнай катастрофы людзі вельмі ініцыятыўныя. За час адносна спакойнага, хоць і цяжкага, жыцця яны проста з-за ўзросту і стомленасці з дзяржкіравання выйшлі. На змену ім прыйшлі выканаўцы, якія працуюць проста як перадатачны механізм. А ва ўмовах крызісу патрэбны людзі ініцыятыўныя.

Валюта ў абменніках з'явіцца пасля Новага года?

Расійскі эксперт перакананы, што зараз эканамічная сітуацыя ў Беларусі паціху выпраўляецца, бо праведзеная дэвальвацыя падагнала эканоміку:

— Шматлікасць курсаў — гэта вар'яцтва з серыі канца 80-х гадоў, так нельга. Дапусціць яе — гэта значыць проста развіваць ценевы сектар, развіваць сабе палітычнага ворага ў выглядзе гэтага ценевага сектара. Эканамічны спекулянт адразу пачынае фінансаваць у палітычнага ворага, мы гэта бачылі на постсавецкай прасторы, мы гэта бачылі ва Усходняй Еўропе і гэтак далей. Зараз робяцца стабілізацыйныя меры — усё нармальна, усё добра. У вас ёсць касавы разрыў, эканоміка выпраўляецца, бо дэвальвацыя вельмі добра падагнала эканоміку, хай выбачаць мяне сацыяльна не абароненыя за такія словы. У вас, па вялікім рахунку, зараз няправільна робяцца дзве рэчы: па-першае, з вельмі вялікім спазненнем сказалі, што меры па абмежаванні вывазу тавараў і бензіну будуць часовымі, і па-другое, у вас дазволена абмежаванае абарачэнне валюты — на бензазапраўках, у гатэлях і недзе яшчэ. У сітуацыі, калі не хапае валюты для рэзерваў, гэта вялікая памылка, бо магчымасць заплаціць долар проста павышае попыт на валюту з боку прыватнага сектара. Больш за тое, калі я заплачу на запраўцы валютай, то натуральна, што гэтая валюта ў дзяржаўную і банкаўскую сістэму не прыйдзе ніколі. Бо гаспадар запраўкі ва ўмовах дэфіцыту валюты сам у сябе яе купіць, і далей гэтыя грошы пойдуць налева. Гэта памылка, якую праходзілі ўсе. Вядома, гэта можна зрабіць ва ўмовах панікі на тыдзень-два, пакуль спажывецкая паніка не схлынула. А потым, каля яна скончылася, у краіне павінна быць адна валюта.

Масавае набыццё насельніцтвам імпартных аўтамабіляў, на думку Міхаіла Дзялягіна, сыграла сваю ролю, але насельніцтва ў гэтым вінаваціць нельга:

— Адна з прычын валютнага правалу ў вас — гэта 1 ліпеня, бо натуральна, што ўсе пастараліся закупіцца імпартам як мага болей (у тым ліку і аўтамабілямі) перад гэтай запаветнай датай. У вас перад выбарамі ў эканоміку былі ўлітыя вялізныя грошы. Гэта нармальна, амерыканцы таксама ўліваюць грошы ў эканоміку напярэдадні выбараў — не вельмі добрая палітычная тэхналогія, але нармальная, усе яе прымяняюць. Улілі, выдатна. Але ж гэта грошы, на якія людзі нешта будуць купляць. Пра гэта не падумалі. І людзі, натуральна, пачалі купляць імпарт, бо ў імпарту і якасць вышэй, і этыкетка больш глянцавая... А якраз з 1 ліпеня ўвоз аўтамабіляў фактычна закрываецца (бо становіцца нявыгадным). Адпаведна, усе кінуліся скупляць аўтамабілі. Гэта можна было пралічыць загадзя? Можна. Як гэта можна было купіраваць — я не ведаю, на гэта трэба было рэагаваць спецыяльна. А ўсе былі занятыя вырашэннем іншых праблем. Ну і атрымалі тое, што атрымалі. Такія памылкі бываюць, проста трэба атрымліваць з іх урокі.

Міхаіл Дзялягін таксама лічыць, што пры асаблівым жаданні можна і вярнуць давер насельніцтва да банкаўскай сістэмы, істотна падарваны пасля чарговай страты грошай падчас дэвальвацыі:

— Што тычыцца банкаў: у вас ёсць сістэма гарантавання укладаў? 100% гарантуецца? — спытаў Міхаіл Генадзевіч і здзівіўся, калі пачуў пра поўныя гарантыі. — Гэта вельмі нерацыянальна, гэта сацыялізм, ад якога трэба пазбаўляцца. Але, калі ласка, простая рэч, як забяспечыць давер да банкаўскай сістэмы. Бярэцца малы кволы банк, паказальна ліквідуецца, а потым на працягу тыдня ўсе ўкладчыкі атрымліваюць усе грошы да капейкі. І па тэлевізары паказваюць абураную бабулю, якая кажа, што яна ажно цэлых дзве гадзіны стаяла ў чарзе па свае грошы... Усё, пасля гэтага любоў да банкаўскай сістэмы забяспечана. Гэта пытанні піяру і пытанні тэхналогій, калі банкаўская сістэма надзейная. Калі ж яна не надзейная, то вы спачатку саніруйце, а потым ужо забяспечвайце давер.

Разам з тым Міхаіл Генадзевіч перакананы, што валюта ў абменніках можа з'явіцца толькі ў пачатку 2012 года:

— Я мяркую, што да Новага года ўсё стабілізуецца канчаткова. Розніца паміж легальным курсам 5200 і чорным курсам, калі я не памыляюся, у 6 тысяч — гэта не крытычная розніца, не катастрафічная. Яна паказвае, што сітуацыя ў прынцыпе пад кантролем, проста з легальнага абарачэння выпала занадта шмат долараў. Я думаю, што гэта не страшна. Вам сёлета, як я разумею, трэба выплаціць 6 мільярдаў, і вось як толькі ваш цудоўны ўрад скажа, што «людцы, у нас у засеках Радзімы ляжыць не 3-4 мільярды, а 8, з якіх мы шэсць спакойна аддаём і застаецца яшчэ дастаткова», то на гэтым чорны рынак спыняе сваю працу. Але для гэтага патрэбны нейкі час. Я думаю, што да канца года зробяць, — перакананы Міхаіл Дзялягін. — Такім чынам з валютным рынкам будзе ўсё ў парадку, калі можна будзе прыйсці ў абменнік і спакойна купіць валюту. Мяркую, што да Новага года гэтага не будзе. А пасля Новага года гэта можна зрабіць. Бо, па-першае, трэба даць грошы найбольш пацярпелым у парадку сацыяльнай абароны, па-другое, трэба выплаціць бягучыя плацяжы або іх рэструктураваць і, па-трэцяе, трэба перажыць бум, звязаны з падарункамі — пад Новы год усе дораць падарункі, гэта хваля попыту, а потым усё можна нармалізоўваць. Я мяркую, што так.

Прадаць не «Беларускалій», а яго прадукцыю на 5 гадоў наперад?

Расійскі госць выказаў думку, што не трэба спяшацца з прыватызацыяй дзяржаўнай маёмасці — трэба спачатку паспрабаваць прадаць яе прадукцыю:

— У вас ёсць праблема касавага разрыву, якая вырашаецца пры наяўнасці ініцыятывы нават без прыватызацыі. Просты прыклад: Аргенціна, не маючы праблем, але проста баючыся няпэўнасці, закантрактавала амаль увесь экспарт свайго мяса ў Кітай — карацей, яны прадалі ўсё сваё мяса, якое яны экспартуюць, кітайцам на пяць гадоў наперад. У вас ёсць «Беларускалій». Цана на яго прадукцыю дастаткова ўстойліва павышаецца. Вы можаце замест таго, каб бегаць з працягнутай рукой і шукаць гаспадара, проста прадаць наперад яго прадукцыю. Скажам, 70% прадукцыі на 5 гадоў наперад. І не важна каму, хоць спекулянтам, бо гарачых грошай на рынку шмат. З улікам росту цэн гэта будзе для іх шалёна выгадная здзелка, а Беларусь атрымае неабходныя грошы для затыкання касавых разрываў.

Міхаіл Генадзевіч пацвердзіў, што расійскі бізнэс з задавальненнем скупіць беларускія прадпрыемствы, але ці будзе ад такога продажу толькі дзеля грошай карысць для Беларусі?

— Вядома, я бачу, што ў вас ёсць добрая маёмасць, зразумела, як нармальны бізнэсмен, я хачу набыць яе як мага танней, карыстаючыся вашым дрэнным становішчам. Больш за тое, калі я з'яўляюся патрыётам расійскага бізнэсу, то я кажу, што Беларусь павінна прадаць усё і прадаць пажадана нам, бо мы — браты. Але, па-першае, калі вы прадаяце маёмасць дзеля грошай, то вы заўсёды прадаяце яе танна. Усе разумеюць, што ў вас няма сродкаў і вы нікуды не падзенецеся. Гэта ўсе праходзілі, уключаючы Вялікабрытанію. Па-другое, калі гэтая маёмасць ваша, яна працуе на вас. Так, прыбытак ад яе можа выкарыстоўвацца дрэнна, вы можаце быць незадаволены гэтым. Але гэта вашы праблемы, вы іх унутры сябе будзеце або не будзеце вырашаць. А вось калі ваш завод належыць дзядзьку Васю, то прыбытак таксама належыць дзядзю Васю — вы тут ні пры чым. Вы атрымліваеце свае падаткі, свае працоўныя месцы, сваю зарплату і моліцеся, каб вас не скарацілі. Бо, па-трэцяе, замежны інвестар прымае рашэнне наконт сваёй маёмасці ў вашай краіне, зыходзячы з меркаванняў, якія не маюць адносін да вашай краіны.

Пры гэтым Міхаіл Дзялягін лічыць, што калі ўжо прадаваць прадпрыемствы, то хаця б беларускім бізнэсменам:

— З пункту гледжання эфектыўнасці гаспадаркі не трэба аддаваць чужому. Можна аддаваць свайму бізнэсу, можна пускаць чужых да кантрольнага пакета. Хаця ўжо блакуючы пакет можа прывесці да разбурэння вытворчасці. Купіць там «Беларускалій» які-небудзь яго стратэгічны канкурэнт з Захаду, і будзе ў савеце дырэктароў блакаваць усе рашэнні, звязаныя з экспартам прадукцыі. І «Беларускалій» спыніць экспарт прадукцыі і сканае. У Расіі былі падобныя прыклады, і ва Усходняй Еўропе былі. Ад іх трэба страхавацца: 25% мінус адна акцыя можна прадаць каму заўгодна, бо гэта павысіць эфектыўнасць бізнэсу — замежнік будзе лезці ва ўсе дзіркі і змагацца з безгаспадарнасцю і гэтак далей. Праўда, за гэтае змаганне з безгаспадарнасцю вы павінны аддаць чвэрць прыбытку, тут нічога не зробіш.

Як вырашыць стратэгічныя праблемы Беларусі?

Міхаіл Дзялягін перакананы, што свае бягучыя праблемы Беларусь выправіць, але пры гэтым ён бачыць, што кіраўніцтву нашай краіны трэба задумацца і аб праблемах стратэгічнага характару:

— Ваша праблема стратэгічная, бо глабальны крызіс — гэта надоўга. Першае, па чым б'е глабальны крызіс, — гэта машынабудаванне. Ну, скажам, Расія сваю сельскую гаспадарку не падыме, таму рынак вам гарантаваны надоўга ў частцы аграпрамысловага комплексу. Але па машынабудаванні ў вас правал. Нямецкі МАН загружаны на 50%, і немцы вымушаны распальваць істэрыку вакол Грэцыі, проста каб зрабіць еўра больш танным і каб машынабудаванне Германіі пачало дыхаць. Натуральна, беларускае машынабудаванне таксама ў цяжкім становішчы. З сённяшняй ямы вы вылезеце, нічога страшнага, бывае. А вось у стратэгічнай перспектыве ўзнікае пытанне: дзе рынкі, на якія вы будзеце працаваць? Гэта пытанне пакуль не мае адказу.

Праўда, тут жа расійскі эксперт прапанаваў свой адказ:

— Тэарэтычна адказ у наступным: на постсавецкай прасторы з часоў савецкага аграпрамысловага комплексу засталася велізарная колькасць кінутых тэхналогій, якія звышпрадукцыйныя і высокаэфектыўныя. Яны не патрэбны ў краінах, дзе сур'ёзны манапалізм, скажам, у Расіі яны не рэалізуюцца. Беларусь можа гэтыя тэхналогіі збіраць, правяраць (ці не прапануюць іх махляры), і адабраную нармальную частку вы можаце рэалізоўваць. За кошт гэтага, па-першае, вы рэзка будзеце зніжаць выдаткі і дыхаць за кошт гэтага, а па-другое, вы зможаце прадаваць новыя тэхналогіі, а гэта вялізныя грошы. Праблема заключаецца ў тым, што Беларусі такі шлях прапануецца з 2005 года, а можа і раней. Ваша сістэма кіравання, заснаваная на выканаўцах, неэфектыўная — ва ўмовах крызісу яна працуе дрэнна. Ці зможа беларуская сістэма кіравання вярнуць тых, можа, празмерна эмацыйных людзей, адначасова схільных да праяўлення ініцыятывы, якія былі ў 1994 годзе (або іх зменшчыкаў)? — вось гэта пытанне стратэгічнага выжывання Беларусі. А сённяшні касавы разрыў — гэта рэч не страшная. Перахапіць да «палучкі» — так гэта называецца на бытавой мове. І вы будзе «палучка»: вы можаце атрымаць гэтыя грошы за кошт продажу ўперад будучай вытворчасці таго ж «Беларускалія», можа быць яшчэ нейкіх іншых прадпрыемстваў. Вы можаце гэта зрабіць, але для гэтага трэба, каб вашы знешнеэканамічныя і знешнепалітычныя ведамствы круціліся, як вавёркі ў коле, каб яны былі не выканаўцамі, а людзьмі дастаткова ініцыятыўнымі. Атрымаецца ці не атрымаецца — паглядзім.

Адыходзіць ад сацыяльнай накіраванасці нельга?

— Сацыяльная накіраванасць — гэта катэгарычная неабходнасць, — перакананы Міхаіл Дзялягін. — Усе гэтыя размовы пра чалавечы капітал, пра тое, што людзі — гэта галоўнае багацце, як я разумею, яны вам надакучылі гэтак сама, як у познім Савецкім Саюзе. Але гэта праўда. Калі вы крочыце па вуліцы і бачыце твары, ад якіх вам хочацца схавацца, то эканамічная актыўнасць падае. І спрыяльныя ўмовы, створаныя для бізнэсу, нікому не дапамагаюць. А вось сацыяльная падтрымка дазваляе людзям нармальна жыць, нармальна лячыцца, нармальна вучыцца, захоўвае працаздольнасць, захоўвае агульны пазітыўны настрой. Гэта вельмі важны фактар эканамічнай канкурэнтаздольнасці. Сацыяльную падтрымку можна скарачаць, не трэба рабіць сабес, як у Савецкім Саюзе. Яе можна скарачаць, але яе нельга ліквідаваць, нельга адмаўляцца ад сацыяльнай па духу дзяржавы.

Напрыканцы Міхаіл Дзялягін выказаўся наконт таго, ці можа быць сам народ вінаваты ў эканамічным крызісе:

— Калі народ сам сябе лічыць вінаватым, то гэта праяўленне высокай адказнасці беларускага народа па прынцыпе «я ў адказе за ўсё». Насамрэч народ сам вінаваты быць не можа. Чалавек можа адчуваць сябе вінаватым: «вось я ўдзельнічаў у паніцы, я расказаў суседцы, што хутка солі не будзе, мыла не будзе, запалак не будзе, і яна купіла 2 лішніх кілаграмы цукру і г.д.». Вось гэта пачуццё віны. Але, па вялікім рахунку, за ўсё адказная кіруючая сістэма. Вядома, улічваючы мае гутаркі з беларусамі, можна дапусціць, што людзі насамрэч могуць сябе вінаваціць. Калі гэта праўда, то гэта добры і пазітыўны сігнал, гэта ўнутраная згуртаванасць беларускага грамадства. Калі людзі лічаць сябе адказнымі за тое, што з імі адбываецца, гэта вялізны рэсурс канкурэнтаздольнасці. Іншая справа, што гэта азначае, што яны выбачаюць свайму ўраду болей памылак, чым тыя, што загадзя лічаць, што імі кіруюць дрэнныя людзі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
1. Капитальное строение с инвентарным номером 430/С-32178. Местонахождение объекта – Гродненская область, Новогрудский район, Валевский с/с, д. Валевка, ул. Новогрудская, д. 34	Здание магазина 1980 г.п. Общая площадь 240,6 м.кв, площадь застройки 333 м.кв., объем 1431 м.куб. Фундамент бутовый ленточный, стены, перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша совмещенная, полы – ДСП, плитка, электроснабжение – открытая проводка. Здание сарая 1980 г.п. Общая площадь 254,5 м.кв, площадь застройки 303 м.кв., объем 792 м.куб. Фундамент бутовый ленточный, стены, перегородки кирпичные, крыша – шифер, полы бетонные
2. Капитальное строение с инвентарным номером 430/С-32180. Местонахождение объекта – Гродненская область, Новогрудский район, Валевский с/с, д. Валевка, ул. Новогрудская, д. 34/1	Здание автозаправочной станции Литер А1/к 1990 г.п. Общая площадь 15,8 м.кв, площадь застройки 24 м.кв., объем 66 м.куб., фундамент бутовый ленточный, стены, перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша – шифер, полы дощатые, бетонные, электроснабжение – открытая проводка. Емкости (литер 2а) 3 шт. металлические, объем 10 м.куб.,1990 г.п. Забор (литер 4в) металлический на металлических столбах, длина 28 м,1990 г.п. Покрытие (литер 3б) асфальтобетонное, площадь 207 м.кв., 1990 г.п. Приемное устройство (литер 5г) чугунный трубопровод, Д-30 см, длина 60 м, 2004 г.п. Ж/б отстойник (литер 6д) Д-700 мм, глубина 2,5 м, 1998 г.п.
Начальная цена продажи	131 260 800 белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	6 563 040 белорусских рублей
Земельный участок	Площадь – 0,3262 га, назначение – для строительства и обслуживания зданий и сооружений автозаправочной станции в д. Валевка Новогрудского р-на
Продавец	ОАО «Новоельнянский межрайагроснаб» Гродненская обл., г.п. Новоельня, ул. Чапаева, 21
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41 98 32, 41 98 34
Условия аукциона	Аукцион без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012286350011 отделение № 201 г. Гродно ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 152101705, УНП 500833225

Аукцион состоится 07 июля 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30.
Последний день приема заявлений – 06 июля 2011 г. до 15.00.

Информация о первом аукционе была опубликована в газете «Звязда» от 05.04.2011 г. № 62
Телефон для справок: 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
Подробная информация: www.ino.by

ДА 2015 ГОДА Ў МАЛЫМ І СЯРЭДНІМ БІЗНЭСЕ БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ НЕ МЕНШ ЗА 1,8 МІЛЬЁНА ЧАЛАВЕК

ПРАЕКТ Канцэпцыі дзяржаўнай падтрымкі малога і сярэдняга бізнэсу распрацаваны зараз Міністэрствам эканомікі і абмяркоўваецца з іншымі дзяржаўнымі органамі і прадпрымальніцкімі саюзамі. Пра тое, на што накіраваны гэты дакумент, журналістам расказаў Аляксандр ГРУЗДОЎ, дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі:

— Мы падрыхтавалі праект Канцэпцыі дзяржаўнай падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь на 2011—2015 гады і на перыяд да 2020 года. Гэтым дакументам вызначаны мэты, прынцыпы, задачы і прыярытэты дзяржаўнай палітыкі ў галіне малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Канцэпцыя прызвана звязаць эфектыўнае развіццё прадпрымальніцкага сектара з патрэбамі нацыянальнай эканомікі і асноўнымі прыярытэтамі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Пры гэтым асноўныя меры сканцэнтраваны на ўпарадкаванні пачатку і станаўленні бізнэсу, фарміраванні рацыянальнай галіновай структуры прадпрымальніцкай дзейнасці (з перавагай суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў вытворчай сферы), збалансаванасці тэрытарыяльнага размяшчэння малых і сярэдніх арганізацый, павышэнні канкурэнтаздольнасці прадпрымальніцкага сектара.

Зараз, як лічыць Аляксандр Груздоў, беларускі малы і сярэдні бізнэс пакуль развіты недастаткова:

— Той узровень развіцця малога прадпрымальніцтва, які дасягнуты ў нашай краіне, яшчэ істотна адстае ад узроўню некаторых нашых суседзяў па СНД і Еўрапейскім саюзе. Па-ранейшаму большасць малых арганізацый ажыццяўляе дзейнасць у галіне гандлю і грамадскага харчавання — больш за 40%. Пераважная колькасць суб'ектаў малога прадпрымальніцтва сканцэнтравана ў буйных гарадах. Разам з тым, прыярытэтныя напрамкі развіцця нашай дзяржавы прадугледжваюць інавацыйнае развіццё прадпрымальніцтва, актывізацыю вытворчасці экспартнай прадукцыі і выкананне праграмы імпартазамяшчэння. Для гэтага неабходна распрацоўка сістэмных мер па стымуляванні і ўсебаковай падтрымцы прадпрымальніцкай ініцыятывы, якія павінны істотна павысіць уклад прадпрымальніцкага сектара ў фарміраванне тэмпаў эканамічнага росту, забеспячэнне высокай эфектыўнасці функцыянавання беларускай эканомікі, сказаў Аляксандр Сямёнавіч і дадаў, што асноўнымі інструментамі канцэпцыі з'яўляюцца фарміраванне інфраструктуры падтрымкі, развіццё дзяржаўна-прыватнага партнёрства і далейшае ўдасканаленне фінансавай падтрымкі суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

— На першы погляд, прапануемая канцэпцыя і інструменты ўжо выкарыстоўваюцца ў нашай краіне. Разам з тым, канцэпцыя прадугледжвае іх новае прачытанне: так, праектам плануецца павышэнне эфектыўнасці функцыянавання дзейнай інфраструктуры падтрымкі прадпрымальніцтва — як за кошт павелічэння колькасці яе суб'ектаў, так і за кошт пашырэння паслуг, якія яна прадстаўляюць.

Ён таксама адзначыў, што зараз у рэспубліцы дзейнічаюць два віды падтрымкі прадпрымальніцтва — агульная і інавацыйная. Агульная інфраструктура ўключае ў сябе 56 цэнтраў падтрымкі прадпрымальніцтва і 12 інкубатараў малога бізнэсу, а інавацыйная — 11 навукова-тэхнічных паркаў, 35 цэнтраў трансферу тэхналогій і 1 венчурную арганізацыю. Пры гэтым у асноўным суб'екты інфраструктуры размяшчаюцца ў буйных гарадах і фактычна аказваюць нязначны ўплыў на развіццё прадпрымальніцтва ў малых і сярэдніх гарадах і асабліва сельскіх паселішчах, адзначыў Аляксандр Груздоў.

— Праектам канцэпцыі прадугледжана стварэнне прынцыпова новай для нашай краіны арганізацыі інфраструктуры, якая атрымала шырокае распаўсюджванне ў іншых краінах. Гэта агенцтвы падтрымкі і развіцця, індустрыяльныя зоны, студэнцкія бізнэс-інкубатары. Акрамя таго, прапануецца значна пашырыць колькасць суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры за кошт стварэння цэнтраў трансферу і камерцыялізацыі тэхналогій, нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці і іншых патэнтных арганізацый, нацыянальнага агенцтва камерцыялізацыі інтэлектуальнай уласнасці, — сказаў Аляксандр Груздоў і дадаў наконт рэгіянальнай сеткі бізнэс-інкубатараў і цэнтраў падтрымкі: — Напэўна, у ідэале было б добра стварыць у кожнай вёсцы па бізнэс-інкубатары ці цэнтры. Але ці будзе гэтая паслуга запатрабавана? Трэба выходзіць з рэалій жыцця, нашага становішча, менталітэту насельніцтва ў адносінах да прадпрымальніцтва і ўсяго астатняга. Такім чынам, крокі павінны быць разумныя.

Як адзначыў Аляксандр Груздоў, зараз праект канцэпцыі вынесены на абмеркаванне органаў дзяржкіравання і прадпрымальніцкіх структур. Паля дапрацоўкі ён будзе ўнесены ў Саўмін, а потым — зацверджаны ўказам Прэзідэнта. У развіццё канцэпцыі таксама плануецца прыняць і нацыянальную праграму развіцця прадпрымальніцтва.

— Плануецца, што да канца 2015 года ў краіне будзе сфарміравана разгалінаваная сетка арганізацый, якія аказваюць падтрымку суб'ектам малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, у тым ліку і фінансавую. Будзе створаны канкурэнтаздольны (з перспектывай устойлівага развіцця) сектар малога і сярэдняга бізнэсу, у якім пераважная колькасць арганізацый будзе ажыццяўляць дзейнасць у рэальным сектары эканомікі. Пры гэтым павінна быць зроблена стаўка на стварэнне суб'ектаў бізнэсу і новых працоўных месцаў перш за ўсё ў інавацыйнай сферы. Прагназуецца павелічэнне долі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў ВУП з 18% па выніках 2010 года да 30% да канца 2015 года. Колькасць занятых у гэтым сектары эканомікі павінна дасягнуць не менш за 1,8 млн чалавек, што складзе каля 38% ад усяго працаздольнага насельніцтва краіны. Такім чынам плануецца забяспечыць эфектыўнасць дзеяння малога і сярэдняга прадпрымальніцтва не толькі за кошт колькаснага росту суб'ектаў, а пераважна за кошт стварэння тавараў, прац, паслуг, якія маюць большы дадатковы кошт, — адзначыў ён.

Напрыканцы Аляксандр Груздоў таксама падзяліўся планамі наконт скарачэння адміністрацыйных працэдур у нашай краіне:

— Адміністрацыйныя працэдуры — гэта вялікая праблема для нашай краіны ў цэлым. Я хачу сказаць, што супрацоўнікамі Дэпартамента па прадпрымальніцтве былі абагульнены ўсе адміністрацыйныя працэдуры, якія ёсць у нас у кожнага органа дзяржкіравання. На 1 мая ў краіне дзейных адміністрацыйных працэдур каля 650. Мы іх сабралі ў адзіны пералік, правялі аналіз і, скажам так, вылучылі 80 працэдур з гэтага спісу, якія рэальна можна прыбраць абсалютна без нейкіх наступстваў для эканомікі краіны. Гэтыя 80 працэдур прайшлі ўзгадненне з органамі, якія іх ажыццяўляюць, атрымана адабрэнне. І ўжо вось гэты праект адзінага пераліку адміністрацыйных працэдур ва ўрэзаным выглядзе (іх застанецца каля 575) унесены ва ўрад і павінны быць у бліжэйшы час прыняты. Але ўсё роўна, нават тое, што там застанецца, — шмат для нашай краіны. І Дэпартамент па прадпрымальніцтве, пераадольваючы супрацьдзеянне з боку іншых органаў дзяржкіравання, якія здзяйсняюць гэтыя адміністрацыйныя працэдуры, змагаецца за тое, каб гэты спіс кардынальна паменшыць і ўрэзаць. Пазіцыя наша такая — у гэтым пераліку павінны заставацца толькі тыя адміністрацыйныя працэдуры, якія нясуць пэўную нагрузку з пункту гледжання забеспячэння бяспекі дзяржавы і здароўя грамадзян. Усё астатняе неабходна прыбіраць, каб больш свабодна развівалася як малое прадпрымальніцтва, так і ў цэлым краіна.

Таксама Аляксандр Груздоў паведаміў, што зараз супрацоўнікамі Дэпартамента падрыхтаваны праект указа Прэзідэнта, дзе прадугледжана прадастаўленне права карыстацца спрошчанай працэдурай падаткаабкладання тым суб'ектам, у якіх аб'ём рэалізацыі будзе складаць да 12 мільярдаў за год. Гэты праект указа зараз унесены ў Савет Міністраў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Аляксандр ГОРВАЛЬ:

«УЗРОВЕНЬ ЦЭН Ў ЖЫЛЛЁВЫМ БУДАЎНІЦТВЕ ПАВІННЫ КАНТРАЛЯВАЦЬ МЯСЦОВЫЯ ЎЛАДЫ»

АПОШНІМ часам частка жыхароў Беларусі, што спрабуе пабудаваць сабе жыллё па сістэме долевага будаўніцтва, трапіла ў не зусім зразумелую сітуацыю, калі арганізацыі забудоўшчыкаў спрабуюць перагледзець дагаворныя ўмовы паміж бакамі на сваю карысць.

Паводле інфармацыі **намесніка гендырэктара цэнтра гандлю нерухомасці «ПАКОДАН» Паўла АСТАПЕНІ**, сёння асобным дольнікам прапануюць заключаць дадатковыя пагадненні да дзейных дагавораў. У адваротным выпадку кампаніі пагражаюць пазбавіць дольнікаў магчымасці атрымаць дакументы, неабходныя для рэгістрацыі кватэры, або ўвогуле скасаваць дагаворы долевага будаўніцтва. Спецыяліст адзначае, што такія факты адбываюцца на фоне істотнага зніжэння актыўнасці на першасным жыллёвым рынку камерцыйнага жылля. Пэўная доля будтрэстаў увогуле спыніла дзейнасць па прыцягванні новых дольнікаў, бо асцерагаецца «прагарэць» з сабекоштам будаўніцтва. Кампаніі, якім тэрмінова патрэбны сродкі для працягвання будаўніцтва, прапануюць кліентам дагаворы долевага будаўніцтва ўжо па новых цэнах у беларускіх рублях у адпаведнасці з міфічна вялікім курсам. Калі яшчэ ў маі жыллёвы квадрат па далёўцы каштаваў да 4,2 млн рублёў, то сёння асобныя забудоўшчыкі стварылі цэннік да 10—12 млн рублёў. Зразумела, што па такім кошце новых кліентаў камерцыйным арганізацыям адшукаць будзе цяжка. Патэнцыяльны спажывец будзе самастойна вырашаць, будаваць яму жыллё па такім кошце або не.

Другая справа, калі ўжо «дзейнага» дольніка прымушаюць заключаць дадатковыя пагадненні, дзе кошт будаўніцтва квадратнага метра жылля можа павялічыцца нават у два разы.

Начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ, да якога рэдакцыя звярнулася па каментарый, пацвердзіў, што такія сітуацыі ў сістэме долевага будаўніцтва сустракаюцца. У гэтай сувязі Аляксандр Вітальевіч нагадаў аб даручэнні Мінбудархітэктуры ў адносінах да ЖБК і дамоў дольнікаў, дзе прапісваецца алгарытм цэнаўтварэння будаўніцтва квадратнага метра жылля. Што тычыцца дамоў, што будуюцца з дзяржаўнай падтрымкай і будуць уведзены ў эксплуатацыю ў гэтым годзе, то кошт квадратнага метра па такім жыллі павінен захавацца на ўзроўні майскіх цэн у будаўніцтве. У сістэме долевага будаўніцтва вырашана выключыць унясенне змяненняў у дагаворы долевага будаўніцтва ў частцы сабекошту квадратнага метра жылля без папярэдняга зацвярджэння новых цэн аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам і ўзгадненняў Мінбудархітэктуры. Спецыялісты міністэрства ўпэўнены, што падаражанне замежнай валюты не павінна моцна паўплываць на змяненне цэн у будаўніцтве жылля. Практычна ўсе будматэрыялы набываюцца будтрэстамі ў айчыннай валюце. Імпартны складальнік будматэрыялаў нават па дарагіх дамах не перавышае 10—12 працэнтаў. Таму вельмі моцна будаўніцтва жылля сёлета падаражэць не павінна нават у камерцыйным сектары, дзе былі ўжо складзены дагаворы. Калі дольнік не згодны з новымі цэнамі, то трэба звяртацца ў выканкамы па месцы рэгістрацыі будаўніцтва, рэкамендуе Аляксандр Горваль. Там вам павінны дапамагчы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сяргей КУРКАЧ.

Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы

БЕЛАРУСКІЯ БАСКЕТБАЛІСТКІ НЕ ДАЗВОЛІЛІ РАСІЯНКАМ УЗЯЦЬ РЭВАНШ

ПЕРАМОГУ нашых баскетбалістак над зборнай Расіі зараз і адносіць да разраду сенсацый неяк няёмка: на сёлетнім чэмпіянаце Еўропы яна другая пасля мінулагодняга чэмпіянату свету, дзе расіянак мы выбілі з чвэрцьфіналу (70:53). Але і ў тое, што гэта стане заканамернасцю, перад матчам не надта верылася. Не забыты яшчэ вопыт Чэхіі, якая не дала нам узяць рэванш, і на сустрэчу з беларускамі настроілася так, як, напэўна, не настройвалася больш ні на аднаго суперніка. Думалася, што і расіянкі мабілізуюцца, як абяцаў іх трэнер Барыс Сакалоўскі, і будуць «помсціць» нам увесь матч.

Аднак ніякімі такімі жудаснымі рэчамі не пахла нават у першай чвэрці, якую беларускі па традыцыі саступалі — 10:14. У другой палове падапечныя Анатоля Буяльскага гульню выраўнялі, і стала зразумела, што не такія яны і страшныя, гэтыя расіянкі. Страты, мучэнні ў атацы, нерэалізацыя штрафных — такую каманду Расіі можна і трэба было перамагаць. На вялікі перапынак пасля дзвюх чвэрцяў каманды пайшлі з лікам 25:24 на карысць расіянак. А ў трэцяй чвэрці беларускі выйшлі з ценю: у другой палове гульні наша каманда пачала рэалізоўваць трохачковыя. Гэта ўдалося Юліі Дурэйцы, у якой не ладзілася гульня ў папярэдніх матчах, Кацярыне Сныцінай, якая некалькі разоў брала ініцыятыву на сябе, і Наталлі Марчанцы, якая стабільна паспяхова праводзіць усе матчы. «Ведаеце, што вы робіце? Вы зараз здасце гульню!» — імкнуўся дастукацца да сваіх падапечных Барыс Сакалоўскі, які тайм-аўтамі стараўся збіць фарт і прэсінг беларускай зборнай. У апошняй дзесяціхвілінцы расіянкі пачалі адыгрываць двухзначны адрыў беларусак, і нашы дзяўчаты пачалі нервавацца: «Гуляем спакойна, мы ўсё-такі выйграем пакуль», — заклікала Алена Леўчанка. 62:51 — такі канчатковы вынік, і наша каманда займае пакуль трэцяе месца ў сектэце.

Анатоль Буяльскі ўпэўнены, што дзяўчаты ўзялі перамогу, дзякуючы дысцыпліне:

— Мы згулялі дысцыплінавана. Я настройваў каманду: калі мы пачнём гуляць з расіянкамі сам-насам, калі браць па асобах, нам будзе вельмі складана. Гэта тычыцца і роставых паказчыкаў. Хацелася давесці гульню да роўнай канцоўкі, а там ужо ўсё вырашыць, але атрымалася крышачку прасцей. Яшчэ на ўстаноўцы перад гульнёй дамаўляліся, што будзем шмат гуляць прэсінгам. Адзінае, што трэба было ўгадаць той момант, калі яго трэба было ўключыць па поўнай праграме. Калі адчувалася нейкая слабінка, прэсінг станавіўся больш актыўным.

Лепшым снайперам нашай каманды ў матчы стала Наталля Марчанка — на яе рахунку 11 ачкоў. Акрамя таго, ачкі набіралі: Леўчанка: 10, Трафімава — 9, Дурэйка, Сныціна — 7, Троіна, Ануфрыенка — па 6, Верамеенка, Ліхтаровіч, Крэс — па 2.

Табліца групы F: Літва — 6 ачкоў, Чэхія — 6, Беларусь — 5, Расія — 4, Вялікабрытанія — 3, Турцыя — 3. У другім раўндзе нам трэба правесці яшчэ два матчы: 25 чэрвеня — з Літвой, 27 чэрвеня — з Турцыяй.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Запрашальнік

КУПАЛЛЕ Ў НАТУРЫ

Дух народнага свята ў Мінску можна адчуць у музеі пад адкрытым небам

25 чэрвеня Беларускі дзяржаўны музей архітэктуры і побыту чакае з 17 да 21-й гадзіны ўсіх, хто верыць у шчасце на Купалле. Шукаць яго можна ў атмасферы, якая найбольш набліжана да натуральнай. Музей прапануе адзначыць свята, як гэта рабілі на беларускім Падняпроўі і Палессі.

Сёлета ўпершыню музей ладзіць Купалле разам са студэнтамі кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Але ж запрошаны і фальклорныя калектывы: «Вяснянка», «Этнасуполка», «Верас», «Ветах», «Сунічка». Гэта значыць, песні будуць гучаць у аўтэнтычнай манеры — так, як калісьці спявалі на вёсцы. І музыка будзе гучаць традыцыйная — і выключна ў жывым выкананні! А пад такую музыку і беларускія танцы можна зладзіць. Гульні ўзгадаць, якімі бавіліся на Купалле нашы продкі. І паглядзець на вогнішча, іскрынкі якога запаляць у вачах агеньчыкі надзеі на тое, што энергія прыроды перадаецца чалавеку і потым сагравае яго полымем уласнай душы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»

доводит до сведения граждан о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве нежилых помещений объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 38 по генплану» в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 16 сентября 2009 года:

Окончание строительства – июль 2011 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 12.01.2009 № 79-5/09 с учетом дополнения № 1 от 17.05.2011 № 371-15/11.

Стоимость строительства 1 м² продовольственного магазина общей площадью по результатам обмера РУП «Минское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 843,9 м² в текущих ценах составляет – 3 978 280 рублей.

Генеральный директор *Е.И.Вовна*

ПАСТКА ДЛЯ ПАКУПНІКОЎ

Многім з нас добра знаёмая сітуацыя: зазірнулі ў краму на хвілінку купіць мінералку і гаспадарчае мыла, а выйшлі праз паўтары гадзіны з не вельмі патрэбным, але вельмі прыгожым наборам шампуняў-геляў для душу, забаўным кубкам, пакетам апетытнага печыва і экзатычным каньяком. Пры тым, што адметна, без мыла і мінералкі...

Некантралюемыя «шоп-туры» хоць аднойчы здараюцца ва ўсіх, незалежна ад полу і ўзросту — тым больш што адмыслоўцы продажу і маркетынгу робяць мноства хітрых захадаў, каб спажыўцы пакідалі ў краме значна большыя сумы, чым было запланавана. Напрыклад, вось дзясятак самых распаўсюджаных і амаль што безадмоўных спосабаў палегчыць ваш кашалёк:

— Вялікі вазок — вялікія выдаткі. Пустая прастора каляскі выклікае ўнутраны дыскамфорт і цалкам вытлумачальнае жаданне хутчэй гэтую прастору запоўніць.

— Велізарныя люстэркі ў крамах адзення і вопратні — тонкі разлік: праходзячы міма люстэркаў, ніхто не можа ўтрымацца перад спакусай кінуць погляд на ўласнае адлюстраванне. Няма такога чалавека, які на 100% быў бы задаволены сваім знешнім выглядам. Рашэнне прыходзіць імгненна — трэба тэрмінова нешта купіць.

— Па дарозе да касы пакупнікоў падсцерагаюць розныя перашкоды — у літаральным сэнсе слова. То тут, то там наведнікі крамы натыкаюцца на вялікія скрынкі з хадавым таварам. Прадаўцы ведаюць, што пакупнік больш схільны рабіць імпульсіўныя пакупкі, калі тавар выстаўлены наўпрост на дарозе.

— Найбольш запатрабаваныя прадукты — малако, хлеб, сыр — крамы часта размяшчаюць у самым далёкім куце памяшкання. Гэтыя тавары патрэбныя практычна ўсім, але пакуль вы да іх дабярэцеся, вы напэўна ўбачыце шмат чаго яшчэ.

— Прыйшоўшы ў краму адзення і акінуўшы позіркам паліцы, мы падсвядома накіроўваемся не да акуратных стосаў світараў, а да вешалак, якія выглядаюць трохі бязладна. Наша падсвядомасць кажа нам, што менавіта там знаходзіцца ўсё самае цікавае і папулярнае. Між тым, беспарадак на вешалках рэгулярна наводзяць самі прадаўцы.

— Славутыя «фінальныя распродажы», «поўныя ліквідацыі» і «зніжкі ў сувязі з адкрыццём крамы» — гэта не больш чым спробы крамаў пазбавіцца ад ляжалага тавару (і, трэба сказаць, яны заўсёды прыносяць вынік).

— Крамы і рэстараны часта ўзбуджаюць апетыт кліентаў смачнымі пахамі. Асабліва абуджаюць пакупніцкую актыўнасць пахі свежай выпечкі і кавы.

— Тавары для дзяцей заўсёды ляжаць нізка. Калі не хочаце істэрык з-за чарговага «Кіндар-сюрпрыза», саджайце дзяцей на каляскі.

— Шчаслівa пазбегнуўшы ўсіх спакус і стоячы каля касы, не спяшайцеся расслабляцца! Бо ў вас перад вачамі жуйкі, шакалад, арэшкі, спецыі і батарэйкі. Калі ўгледзецца ўважліва, высветліцца, што кошт тавару на касе крышку адрозніваецца ад кошту тавару ў зале. На карысць крамы, вядома.

Прыемных вам — а галоўнае, своечасовых і патрэбных вам, а не прадаўцу — пакупак!

ПРАФЕСІЙНЫЯ ПРЫМЕТЫ

«Ёсць прымета, што нельга галіцца перад адказным матчам», — распавядае з тэлеэкрана знакаміты расійскі хакеіст. Хоць гэта і рэкламны ролік, але сапраўды, прымета такая існуе. Увогуле, ці не ў кожнай прафесіі ёсць свае адметныя прымхі і забабоны. Вось толькі некаторыя з іх:

Урачы стараюцца ніколі не мяняцца дзяжурствамі. Яны кажуць, што калі пачнеш мітусіцца і дамаўляцца з калегамі, дык абавязкова дастанецца табе такая ночка, што вачэй прыплюшчыць не будзе калі.

Лётчыкі ніколі не фатаграфуюцца перад палётам.

Музыкантам у дзень канцэрта трэба абавязкова ўстаць з правай нагі. Таксама лічыцца, што перад канцэртам нельга засцілаць ложак. Гэта адна з самых распаўсюджаных прымет сярод дырыжораў і оперных спевакоў.

У тэатры, калі тэкст п'есы (або ролі) падае на падлогу, акцёр павінен абавязкова на яго сесці і з ім падняцца. Калі гэтага не зрабіць, то не атрымаецца сыграць.

Агульнавядома: паказваць пальцам на штосьці — дрэнны тон. Маракі скажуць вам, што асабліва кепская прымета — гэта паказваць пальцам на неба. Гэта можа ўгнявіць багоў і прынесці шторм або штыль. У кожным порце ўсе ведаюць, што паказваць пальцам на судна, якое адплывае, — значыць выракчы яго на згубу.

Сапёры-піратэхнікі ніколі не развітваюцца, калі з'язджаюць на выклік, і ніколі не прамаўляюць слова «апошні», у якім бы то ні было кантэксце.

Пажарныя кажуць, што калі падчас дзяжурства па-чысціць боты, абавязкова паступіць выклік на пажар. Тое ж самае адбываецца, калі ў разліку з'яўляецца новенькі. А калі пажарны разлік вяртаецца з адпачынку, іх паліваюць вадой. Інакш і ім, і іх таварышам у гэты ж дзень давядзецца выязджаць на пажар.

Маладыя ўрачы імкнуцца не займацца сэксам у ноч перад дзяжурствам. Таму што інакш наступнае дзяжурства будзе вельмі цяжкім, абавязкова што-небудзь здарыцца.

Пэўна, самыя прымхлівыя людзі на свеце — гэта касманаўты. Дакладна вядома, што Сяргей Каралёў не любіў старты па панядзелках і заўсёды пераносіў дату, калі яна выпадала на панядзелак. Чаму — так і засталося вялікай загадкай. Тым не менш у савецкай, а цяпер у расійскай касманаўтыцы панядзелак стаў ледзьве не афіцыйным «нестартавым» днём. А вось самы забаўны забабон касманаўтаў: на касмадроме ў Плясецку перад запускам ракеты-носьбіта на ёй абавязкова пішуць «Таня». Кажуць, гэтае імя вывеў на першай ракеце закаханы ў нейкую Таню афіцэр. Кажуць нават, што аднойчы, калі забыліся вывесці на корпусе шчаслівае імя, ракета перад стартам падарвалася.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Шалям добра было б пабыць у адзіноце, а Скарпіёнаў чакаюць творчыя дасягненні

ВАЕН. Можа з'явіцца магчымасць заняцца новым відам дзейнасці. Неабходна рэалістычна паглядзець на некаторыя рэчы і, магчыма, прыняць часам нават не зусім прыемныя для вас рашэнні. Паспрабуйце не ствараць сабе праблем, лічачы любую не вартую ўвагі дробязь непераадольнай перашкодай. Вам трэба засяродзіцца на тым, што датычыцца вашых інтарэсаў, і адсунуць далей ад сябе назойлівыя думкі. Добры тыдзень для прасоўвання па службовай лесвіцы. У суботу праявіце ініцыятыву і прадпрымальнасць у чымсьці новым — і ў вас усё атрымаецца.

ЦЯЛЕЦ. Тыдзень будзе насычаны падзеямі, а вынікі яго будуць залежаць ад вашай разважнасці і ўмення імгненна рэагаваць на раптоўныя змены. Непажаданая паспешнасць у рашэннях, галоўнымі якасцямі павінны быць акуратнасць і разумнасць падыходу. Пажадана праводзіць вольны час з карысцю для дома або для здароўя.

БЛІЗНЯТЫ. Можаце акунуцца ў вір разнастайных дзелавых і асабістых праблем. Неабходна пераадолець сумневы і няўпэўненасць ва ўласных сілах. Паспрабуйце праявіць практычнасць у справах і ўнесці размернасць у жыццё — гэта прынясе поспех у найбліжэйшай будучыні. Цікавае знаёмства можа спрыяць прафесійнаму поспеху.

РАК. Не мае сэнсу супрацьпаставацца акалічнасцям і спрабаваць штосьці змяніць. Надышоў момант, калі лепш плыць па цячэнні, — так вы зэканоміце сілы і час. Давайце больш увагі блізкім людзям — ім проста неабходныя вашы падтрымка і дапамога. Толькі не дазваляйце ім згружаць усе свае праблемы на вас.

ЛЕЎ. Залішняя даверлівасць і недарэчная сентыментальнасць могуць стаць прычынай істотных пралікаў. Блізкія людзі будуць схільныя дапамагчы і падтрымаць усе вашы распачынанні. Серада і нядзеля — найбольш спрыяльныя дні для таго, каб актыўна ўвасабляць у жыццё вызначанае. З'явіцца магчымасць паказаць свае таленты і атрымаць пахвалу начальства. Выхадныя правядзіце так, як вам таго хочацца, не аглядаючыся на сваякоў і знаёмых.

ДЗЕВА. На працы і ў дачыненні да дзелавых партнёраў паспрабуйце паводзіць сябе больш стрымана, адкіньце эмоцыі, якія вам замінаюць, гаварыце спакойна і па сутнасці, нават калі нечыя карыслівыя інтарэсы кідаюцца ў вочы. Лепш накіруйце сілы і энергію на наладжванне дзелавых сувязяў. Начальства адзначыць вашу мэтанакіраванасць і дзелавую хватку і, верагодна, задумаецца аб заахвочванні. Найбольш спрыяльным днём будзе нядзеля.

ШАЛІ. Можа быць, варта пабыць нейкі час у адзіноце, каб спакойна абдумаць становішча, у якім вы апынуліся, і знайсці правільнае рашэнне. Добра было б, калі ёсць магчымасць, з'ехаць на тыдзень за горад. У канцы тыдня давядзецца ўсё ж трохі паварушыцца, інакш можаце прапусціць усё на свеце. Але нават калі вы нешта і не заўважыце — гэта не адаб'ецца сур'ёзна на вашых планах.

СКАРПІЁН. Выдатны тыдзень для смелых і энергічных дзеянняў — ён абяцае спрыяльнае становішча для творчых дасягненняў у прафесійнай сферы. Вам не давядзецца асабліва задумвацца над тым, што рабіць і як сябе паводзіць, — веды вашы ясныя і сумневы не патурбуюць. З'явіцца шанц прадэманстраваць навакольным некаторыя свае лепшыя якасці. У выхадныя верагодныя цікавыя знаёмствы, так што не варта праводзіць гэты час пад замком.

СТРАЛЕЦ. Верагодныя пэўныя рознагалоссі з партнёрамі: пераадолеўшы іх, вы можаце атрымаць цікавыя прапановы. Некаторыя праблемы напэўна запатрабуюць неадкладнага вырашэння, і гэта прымусіць задумацца над сітуацыяй, якая склалася. Калі партнёры робяць крокі насустрач, гэта яшчэ не значыць, што вы тая самая гара, да якой ахвотна прыйдзе Магамет. Не ўбачыўшы ў вас зваротнага жадання кампрамісу, яны могуць і назад адыграць. Калі людзі робяць нешта для вас, клапоцяцца — цешцеся і прымайце гэта з падзякай, а не як належнае. Калі раптам вы задумалі змяніць месца жыхарства, паспрабуйце не спяшацца з рэалізацыяй гэтай думкі, прынамсі, да наступнага тыдня.

КАЗЯРОГ. Гэты тыдзень абяцае больш добрага, чым дрэннага, аднак дабро трэба ўмець заўважыць. Праяўляйце ініцыятыву ў прафесійных справах, не чакайце, пакуль усё лепшае дастанецца іншым. У чацвер рэкамендуецца быць напагатове. Магчыма, вам прапануюць новую працу — гэта вельмі прывабна, але хто ведае, як павернецца жыццё потым? Зоркі прапануюць падумаць да наступнага тыдня. Пэўныя цяжкасці будуць падпільноўваць вас у хатніх справах і ў зносінах з дзецьмі.

ВАДАЛЕЙ. Неабходна звярнуць на працу пільную ўвагу — пажадана заняцца разграбаннем назапашаных спраў. Шмат часу давядзецца прысвяціць рашэнню бягучых праблем, звязаных з фінансавай сферай дзейнасці. Калі ў вас не хопіць цярпення і мудрасці, давядзецца высвятляць адносіны з калегамі або сваякамі, а гэта можа выклікаць малапрыемныя адчуванні. Пятніца і выхадныя — дні, калі магчымыя сустрэчы з прыемнымі людзьмі, забавы і паходы ў госці. У суботу могуць адбыцца значныя падзеі ў вашым жыцці.

РЫБЫ. Высокая працаздольнасць, добрае самаадчуванне і настрой стане гарантыяй паспяховасці ў шматлікіх сферах дзейнасці. Паспрабуйце не аддаляцца ад калег, бо ў гэтай сітуацыі найлепшым рашэннем напэўна апынецца калектыўнае. У новых справах з партнёрамі па бізнэсе ўсе ўмовы абгаворыце загадзя цвёрда і максімальна выразна.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РАІМ ПРЫГАТАВАЦЬ

«Букет чайных ружаў»

Спатрэбіцца: *адна ўпакоўка слоенага бездражджавога цеста (прыблізна 500 г), палова курынай грудкі, адна сырая морква, палова галоўкі рэпчатай цыбулі, спецыі для курыцы, чырвоная папрыка, соль.*

Зрабіце фарш з курынай грудкі, морквы і цыбулі. Дадайце спецыі і добра перамяшайце.

Скачайце з фаршу шарыкі памерам з грэцкі арэх. Цеста раскачайце танчэй трохі, выражце круг.

Зрабіце 3 надрэзы, не даходзячы да сярэдзіны круга. Павінна атрымацца 3 розныя па памеры сегменты. Кладзём у сярэдзіну круга шарык. Замацоўваем вакол яго самы меншы сегмент з цеста. Далей — другі па велічыні, злучаючы сегменты паміж сабой. Заканчваем трэцім — самым вялікім. Такім чынам атрымліваем форму ружы. Выкладаем «кветкі» ў форму, засланую паперай для выпечкі.

Ставім запякаць у папярэдне разагрэтую духоўку пры 180 °С на 30—40 хвілін.

Начынка можа быць любой, галоўная ўмова — не вадкая.

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

Кававая гушча ў гаспадарцы спатрэбіцца

Кава валодае выдатнай уласцівасцю выдаляць непрыемныя пахі, пры гэтым не надаючы рэчам паху кавы. Прасушыце кававую гушчу і завяжыце ў некалькі столак марлі або ў старую панчоху. Пакладзіце мяшочак у шафу, гардэроб, каморку, карацей, у любое месца, дзе маюць тэндэнцыю назапашвацца непрыемныя пахі. Цяпер на месяц пра іх можна забыцца. Той жа метад выдатна дзейнічае, калі трэба пазбавіцца ад непрыемнага паху ў халадзільніку! Ад «водару» старога абутку таксама можна пазбавіцца з дапамогай кававай гушчы. Спачатку яе трэба прасушыць, а затым пакласці ў мяшочак або проста засыпаць у абутак і пакінуць на некалькі дзён. Пасля чаго гушчу з абутку вытрасаюць.

-2762-

САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ

Валасы патрабуюць догляду



Усе жанчыны хочуць мець прыгожую прычоску, але, на жаль, не заўсёды гэта атрымліваецца. Часам валасам патрэбна дапамога. Можна карыстацца касметычнымі сродкамі, набытымі ў краме, а можна зрабіць іх самім з таго, што ёсць у доме. Гэтыя сродкі могуць быць нават больш эфектыўнымі і карыснымі.

ЯЕЧНА-САЛЯВАЯ МАСКА ДЛЯ РОСТУ ВАЛАСОЎ

Змяшаць 5 чайных (з невялікай горкай) лыжак солі, можна выкарыстаць звычайную кухонную, а можна марскую, тады вынік будзе яшчэ лепшы, 2 яечныя жаўткі, 3 кроплі аліўкавага або лапуховага алею.

Атрымаецца сумесь, якая нагадвае гліну. На нямытыя валасы раўнамерна размеркаваць маску, уціраючы яе масіруючымі рухамі. Галоўнае — рабіць гэта не моцна, інакш можна соллю падрапаць скуру галавы.

Пасля гэтага абгарнуць валасы фольгай або пакетам і пачакаць 10 хвілін. Затым проста змыць і вымыць валасы з шампунем. Маска ўмацоўвае валасы і робіць іх паслухмянымі.

МАСКА ДЛЯ СЛАБЫХ ТОНКІХ ВАЛАСОЎ

Змяшаць 2 яечныя жаўткі, мякаць 1 лісточка алоэ (можна дробна нарэзаць, пасля паціскаць лыжкай), 2 кроплі вітаміну А (прадаецца ў аптэках) і размеркаваць маску па ўсёй даўжыні валасоў, не ўціраючы ў карані перад мыццём галавы. Пакінуць на 15 хвілін, пасля чаго галаву вымыць з шампунем.

Валасы становяцца больш моцнымі і бліскучымі.

КЕФІРНАЯ МАСКА ДЛЯ ЎСІХ ТЫПАЎ ВАЛАСОЎ

У паўкубка свежага цёплага кефіру дадаць 1 яечны жаўток і нанесці сумесь на валасы перад мыццём на 10 хвілін, а пасля добра змыць з шампунем.

Маска дапамагае надаць валасам дадатковы аб'ём і свежы выгляд. Яе можна рабіць не часцей, чым раз у 2 дні.

МАСКА ДЛЯ ТЛУСТЫХ ВАЛАСОЎ

100—200 г чорнага хлеба, скарыначак або сухароў з чорнага хлеба заліць паловай шклянкі кіпеню і даць настаяцца 1 гадзіну. Пасля разатрыце хлебную кашку.

Уватрыце кашку з хлеба ў валасы і скуру галавы. Завяжыце галаву поліэтыленавай плёнкай і пакіньце прыкладна на 30 хвілін. Затым вымыйце галаву цёплай вадой без ужывання шампуня.

Можна выкарыстоўць штодня як дадатковы догляд.

Гэтая маска вельмі дабратворна ўплывае як на рост валасоў, так і на іх стан.

МЯДОВА-ЖАЎТКОВАЯ МАСКА

Змяшайце 2 чайныя лыжкі мёду, 2 жаўткі, 2 чайныя лыжкі лапуховага алею. Атрыманую сумесь уватрыце ў скуру галавы, а праз 40 хвілін змыйце з шампунем.

Такая маска эфектыўная пры выпадзенні валасоў і супраць перхаці. Рабіце яе раз на тыдзень на працягу 2-3 месяцаў.

МАЛЕНЬКІЯ ХІТРАСЦІ

❒ Без праблем выцягнуць драўляны абломак з лапаты, якая зламалася, можна, укруціўшы доўгую шрубу ў дзеравяку. Зацісніце шрубу ў цісках і некалькі разоў злёгку стукніце малатком па лапаце.

❒ Каб на бетонных слупах для плота, пры іх адліве ў драўляных апалубках, не было шурпатасцяў, выкладзіце форму поліэтыленавай плёнкай. Слупы атрымаюцца гладкімі, і вам будзе прасцей аддзяліць іх ад апалубкі.

❒ Змешваць цэментны раствор пры падрыхтоўцы зручней за ўсё звычайнымі садовымі віламі. У гэтым выпадку маса атрымліваецца аднастайнай.

-2763-

У НОЧ КУПАЛЬСКУЮ

КРЫЖАВАНКА

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5. Здольнасць гаварыць: дар, які, паводле павер'яў, атрымлівалі на Купалле дрэвы. **6.** Без прыкмет не будзе хлеба на... (прык.). **7.** Тое, што, паводле павер'яў, імкнуцца адабраць на Купалле ад кароў ведзьмы. **8.** «То Іван ...\\Кліча цябе з дому». З верша Ал. Ржэўскай «Купалле». **11.** З Пятрова дня — чырвонае лета, зялёны... (прык.). **12.** «А ў даліне ў цішы\\... — кветкі цвілі». З верша Паўлюка Труса «У Купальскую ноч». **13.** Пачынай касіць не з Пятра, а калі вырасце... (прык.). **16.** Каса любіць ..., а калі хлеб ды ваду — ляжы каса ў халаду (прык.). **17.** ...пякучы, але даручы (прык.). **18.** Адна са страў Купальскай абрадавай вячэры. **20.** «Эх, скошан луг, — і зніклі...». З паэмы Якуба Коласа «Новая зямля». **22.** «Ды на Купалу на Яна\\Іграе..., іграе». З беларускай народнай песні «Ды на Купалу на Яна». **23.** Міфічны гаспадар вадаёмаў: лічылася, што на Купалле ён імяніннік, і цярпець не можа, калі ў яго царства лезуць людзі. **26.** « А ў цёмным лесе... гарыць, каля... Купалка сядзіць». З купальскай песні. **29.** « Як узыйдуць з зелля кветкі, -\\Будуць ... меці дзеткі». З верша Янкі Купалы «На Купалле». **30.** Беларусы лічылі: «Калі рой выйдзе перад Янам, будзе... панам» (прык.). **31.** «І скажа Купала, дзе шчасце маё,\\Няўмольная... са мной засумуе». З верша Ніны Аксёнчык «Купала». **32.** Спех — людзям... (прык.).

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Недаспелы... не жнуць (прык.). **2.** Праезд у плоце: на... дзеля абароны ад чараўніцы некалі на Піншчыне вешалі вянок. **3.** Купальская зёлка (рус. «донник»): пасвячоны... вешалі ў адрынах. **4.** Ластаногая млекакормячая жывёліна. **9.** Бабіна... Узгоркі рытуальнага характару, якіх з такой назвай шмат на Беларусі: на іх часта запальвалі агні на Купалле. **10.** «Хадзіў... па вуліцы, маніў дзевак на Купалле». З купальскай песні, якой запрашалі на свята. **14.** «Ляці, ляці, ..., лаві, лаві, дружочак». Словы, з якімі дзяўчаты кідалі на Купалле вянкі ў ваду. **15.** «Белы...- лябёдкі\\ Хай цалуюць папароткі». З паэмы «Ярыла» (раздзел «Купалле») Змітрака Бядулі. **19.** Чубатая птушка, якая, паводле беларускага міфа, была некалі царом птушак. **21.** Свойская жывёліна, якая некалі была на Беларусі сімвалам Бога Ярылы. **24.** Лубяны абадок у сіце, рэшаце. **25.** Частка адзення, якая свабодна звісае. **27.** Буйны почырк старажытных рукапісаў. **28.** ...-трава. Міфічная цудадзейная зёлка, якая расце на дне глыбокага возера і свеціцца бы ясная зорка.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ:
Па гарызанталі: 5. Моўа. 6. Ядзе. 7. Маўжо. 8. Куліна. 11. Пакос. 12. Чырвяк. 13. Траве. 16. Пярэсь. 17. Лінець. 18. Куліна. 20. Крэсіс. 22. Сонца. 23. Вадзяны. 26. Агонь. 29. Шчасце. 30. Панядзе. 31. Лядзя. 32. Смех. **Па вертыкалі:** 1. Хопас. 2. Вароты. 3. Бярэчуй. 4. Нерпа. 9. Гара. 10. Іван. 14. Вянкоча. 15. Лінейкі. 19. Удод. 21. Конь. 24. Абечак. 25. Нанук. 27. Устэў. 28. Жабер.

Чырвоны пояс...

З усіх дэталяў вясельнага ўбору жаніха і нявесты неабходна вылучыць ролю і прызначэнне пояса.

● Выйсці на вуліцу без пояса — усё роўна як зайсці ў царкву без крыжа — і першае, і другое лічылася вялікім грахом. Падпярэзваць трэба было сподняе, хатняе адзенне і абавязкова вопратку як мужчынам, так і жанчынам. Лічылася, што пояс будзе суправаджаць чалавека ад яго нараджэння да смерці.

● Калі з кашулі можна вырасці, то пояс, які давалі дзіцяці адразу пасля нараджэння (яго спавівалі і перавязвалі поясам), служыў яму значна даўжэй. Як правіла, першы раз хлопчык надзяваў порткі ў сем гадоў, а без пояса, якім ён падвязваў доўгую кашулю, выйсці за вароты было недапушчальна (казалі, што дзяцей без пояса пацягне кікімара ці якая іншая пошасць). Паўсюдна пояс выкарыстоўвалі як вельмі моцны абярэг ад сурокаў.

● Расперазанне чалавека прыраўнівалася да вялікай страты, гэта ўсё адно, што зганьбіць яго. І сёння пра зласлівага, нястрыманага чалавека, які спрабуе даказаць сваю праўду кулакамі, гавораць « расперазаўся», г. зн. страціў сорам і прыстойнасць.

● У той жа час узнікала пэўная абрадавая ці пазаабрадавая неабходнасць «расперазаць» чалавека, якая тлумачылася толькі адным — неабходным кантактам з тагасветнай сілай ці светам продкаў. Так, мужчыны здымалі з сябе пояс пры пошуку скарбаў, папараць-кветкі ў Купальскую ноч, а таксама калі выконвалі рытуал «абворвання» вёскі падчас эпідэміі. Таксама здымалі пояс, развязвалі ўсе вузлы на адзенні парадзіхі і ўсіх, хто быў у гэтую хвіліну побач: «Нават самы малым дзецям, што ляжаць у калысцы, расшпільваюць каўняры і развязваюць паясы».

● У той жа час падчас цяжкіх родаў парадзіху апярэзвалі «святарскім поясам» (ці клалі яго пад галаву) — якім ксёндз ці поп падпярэзваюцца на службе.

● Хлопцу, які хацеў мець у жонках прыгожую дзяўчыну, раілі тры велікодныя дні падпярэзвацца двума паясамі.

● Таксама адмысловай сілай надзялялі чырвоны пояс і пояс, на якім былі вытканы або вышыты словы малітвы ці словы-абярэгі.

● На Палессі чырвоны пояс слалі пад ногі карове і коням падчас першага выгану жывёлы ў поле.

● Пояс — адзін з галоўных атрыбутаў на вяселлі. У Навагрудскім і Ваўкавыскім раёнах Гродзенскай вобласці нявеста павінна была пасля сватаўства ручніком «аперазаць» бутэльку, у якую маці насыпала трохі збожжа, на «запоінах» — аперазаць жаніха, на «другіх запоінах» — свата.

● У іншых раёнах Беларусі фіксуецца звычай пасля вяселля адорваць паясамі тых, хто дапамагаў яго ладзіць: «хто наліваў ваду ў рукамыйнік, хто запальваў лучыну, прыносіў яечню, рыхтаваў пасцель і г. д.».

● Нявеста праз пояс, які яна завязвала на сабе, магла «запраграмаваць» будучыя роды. Для гэтага перад ад'ездам у храм яна сыпала сабе за пазуху дробку льнянога насення, а калі стаяла перад алтаром, імкнулася неўпрыкмет аслабіць «паяснiцу», каб насенне пасыпалася на дол». З гэтай жа мэтай рабілі і так: маладая, едучы да шлюбу, адпускае тасёмкі ад хвартушка і спадніц, каб былі лёгкія роды».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.38	21.46	17.08
Віцебск —	4.19	21.44	17.25
Магілёў —	4.28	21.36	17.08
Гомель —	4.34	21.23	16.49
Гродна —	4.55	21.59	17.04
Брэст —	5.05	21.50	16.45

Месяц

Апошняя квадра 23 чэрвеня. Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Ганны, Аўксенція, Андрэя, Ануфрыя, Арсенія, Івана, Іоны, Пятра, Сцяпана, Феафіла.*

К. *Дароты, Люцыі, Элеаноры, Вільгельма, Вітольда, Максіма.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

25 чэрвеня

1905 год — у вёсцы Пуцілкавічы на Ушаччыне ў беднай сялянскай сям'і (9 дзяцей, 2,5 дзесяціны зямлі) нарадзіўся Пятрусь Броўка, народны паэт Беларусі (1962), акадэмік НАН Беларусі (1966), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1975), грамадскі дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы (1972). У 1918-28 гадах быў на савецкай і партыйнай рабоце; адказны сакратар газеты «Чырвоная Полаччына». Пісаў у барысаўскую павятовую газету «Бядняк», у газеты «Беларуская вёска», «Савецкая Беларусь», «Звязда». Ахвотна ўдзельнічаў у мастацкай самадзейнасці вясковай моладзі, стаў селькарам. У 1941-42 гадах працаваў у франтавой газеце «За Савецкую Беларусь», супрацоўнічаў у партызанскай прэсе. Пасля вайны рэдагаваў часопіс «Полымя», быў старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, галоўным рэдактарам «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». Аўтар кніг паэзіі «Пахне чабор», «А дні ідуць», «І днём і ўначы...» і інш. Аўтар лібрэта опер «Міхась Падгорны» і «Алеся». Лаўрэат Ленінскай прэміі (1962), Дзяржаўнай прэміі СССР (1947, 1951), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974, 1976). Памёр у 1980 годзе.



1840 год — расійскі цар Мікалай I выдаў указ аб увядзенні ў Беларусі рускага заканадаўства. Было спынена дзеянне асноўнага заканадаўчага кодэкса — Трэцяга Статута ВКЛ, якім гарадскія ўлады і жыхары беларускіх гарадоў кіраваліся яшчэ з 1588 года.

Цытата дня:

«Ключом для ўсялякай навукі з'яўляецца пытальнік».

Анарэ дэ Бальзак (1799—1850), французскі пісьменнік.

Усміхнемся!

Дзве сяброўкі.

— Твой муж бегае за кожнай спадніцай, а цябе чамусьці гэта не хвалюе!

— Ну і што? Мой сабака таксама бегае за кожнай машынай, але гэта не значыць, што ён сядзе ў яе і паедзе за рулём.

☺

Мужчыны, памятайце! Калі вы вінаваціце жанчыну ў тым, што яна не рабіла, вы падаяце ёй грандыёзную ідэю!

☺

Дзве сяброўкі.

— Што здарылася?

— Ён сышоў, падарыўшы ружу, і сказаў, што вернецца, калі яна звяне.

— Як рамантычна...

— Так... Але ж ружа пластмасавая...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3018.
Нумар падпісаны ў 19.30 24 чэрвеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.